

ПАЛІКЛІНІКІ ВА ЎМОВАХ COVID–19

5

ВЕЛАСПОРТ – ЖОРСТКІ І БЕСКАМПРАМІСНЫ

13




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

19 СНЕЖНЯ 2020 г. СУБОТА № 248 (29362)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Міхаіл ЖЫГАЛА, начальнік упраўлення арганізацыі гандлю і грамадскага харчавання Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю:**

*«У абласцях і сталіцы для забеспячэння гандлёвых аб'ектаў у перыяд павышанага пакупніцкага попыту правялі работу з вытворцамі па стварэнні запасаў кандытарскіх вырабаў, шампанскага і пеністых він, забяспечана пастаянная наяўнасць у гандлёвых аб'ектах свежых агародніны і садавіны, ікры, рыбы, іншых морапрадуктаў, кансерваванага зялёнага гарошку, каўбас і вяндліны. Акрамя таго, прыняты меры для недапушчэння неабгрунтаванага росту цэн на тавары. Будуць праводзіцца маніторынгі, кантрольна-аналітычныя мерапрыемствы. Міністэрства ў перадсвяточныя дні ўзмацніла кантроль за гандлёвымі аб'ектамі ў галіне забеспячэння асартыменту і выканання заканадаўства аб цэнах і цэнаўтварэнні».*

З першых вуснаў

## «Умацаванне інтэграцыйных механізмаў на постсавецкай прасторы — не пытанне выбару, а непазбежная неабходнасць»

### Прэзідэнт Беларусі расказаў аб прыярытэтах старшынства Беларусі ў СНД у 2021 годзе

**Асноўныя яго кірункі Аляксандр Лукашэнка акрэсліў учора ў сваім выступленні на Савеце кіраўнікоў краін Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Як і многія міжнародныя мерапрыемствы ў гэтым годзе, пасяджэнне праходзіла ў фармаце відэаканферэнцыі.**

**Удзельнікі сустрэчы абмеркавалі пытанні інтэграцыйнага ўзаемадзеяння з акцэнтам на пераадоленне наступстваў каранавіруснай інфекцыі. Разгледзелі лідары краін праект абноўленай Канцэпцыі далейшага развіцця СНД на сярэднетэрміновую перспектыву і прынялі план па яе рэалізацыі.**

СТАР. 2



Фота БелТА.



## Слодыч дзікага мёду

Прыемная навіна прыйшла са штаб-кватэры ЮНЕСКА ў Парыжы — культура бортніцтва Беларусі і Польшчы ўнесена ў Рэпрэзентатыўны спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва.

У Беларусі майстэрства здабычы ляснога мёду ад дзікіх пчол у натуральных умовах дагэтуль жывое на Гомельшчыне. Рыгор ЛІСІЦКІ, жыхар вёскі Мілашавічы Лельчыцкага раёна — прадаўжальнік традыцыйнага бортніцтва Убарцкага Палесся, адзін з кагорты вясковых пчаляроў-бортнікаў. З маладых гадоў Рыгор Нікіфаравіч ведае справу — як здабываць мёд ад лясных пчол. Свае борці-дуплянкі Рыгор Нікіфаравіч вывешвае ў лесе на старых дрэвах, пераважна на дубах, і падымаецца да іх на адмысловых вяроўках. Вольнага часу ў пенсіянера хапае, і яго бортнік ахвяруе свайму любімаму рамяству.

**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

## Эфектыўная заканадаўчая база — аснова паспяховага развіцця краіны

*Выступленне Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Н. І. Качанавай на закрыцці чацвёртай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання*



Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Паважаныя запрошаныя!

Сёння завяршае сваю работу чацвёртая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання.

2020 год быў адным з самых складаных і напружаных.

Пандэмія каранавіруснай інфекцыі паставіла ўсіх перад новым выклікам.

Мы сталі жыць і працаваць у новай рэальнасці, але не дапусцілі спынення эканомікі, працягнулі развіваць сацыяльную сферу, усе сілы кінулі на падтрымку аховы здароўя. І час пацвердзіў нашу праўду.

На фоне гэтай няпростай сітуацыі прайшла выбарчая кампанія. Яна выклікала павышаную цікавасць і ў нашай краіне, і за мяжой.

Беларускі народ чарговы раз зрабіў свой выбар. Аднак замест павагі да гэтай пазіцыі мы зведалі беспрэцэдэнтны знешні ціск, падверглiся спробам унесці раскол у грамадства, змяніць вектар развіцця Беларусі.

Нам прыйшлося мабілізаваць усе сілы для супрацьстаяння праваканцыям і інфармацыйным атакам.

Большасць беларусаў, сапраўдных патрыётаў сваёй Радзімы, з'ядналася перад знешнімі і ўнутранымі пагрозамі.

СТАР. 2

## Актуальныя задачы Парламента напярэдадні агульнанацыянальнага форуму

*Выступленне Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь У. П. Андрэйчанкі на закрыцці чацвёртай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання*



Паважаныя дэпутаты і запрошаныя!

Чацвёртая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання завяршае сваю работу.

Яна праходзіла ў няпростых умовах.

Не спыняліся спробы дэстабілізацыі сацыяльна-палітычнай сітуацыі і беспрэцэдэнтны знешні ціск, які мяжуе з прамым умяшаннем ва ўнутраныя справы Беларусі.

Гэта запатрабавала дакладных і зладжаных дзеянняў усіх органаў улады па абароне суверэнітэту і незалежнасці краіны, падтрыманні грамадскага парадку і забеспячэнні бяспекі нашых грамадзян.

Сёння можна з упэўненасцю сказаць, што абраная дзяржавай стратэгія паказала сваю эфектыўнасць.

Чарговы раз беларускі народ праявіў мудрасць і талерантнасць, пацвердзіў сваю прыхільнасць такім асноўным каштоўнасцям, як мір і бяспека.

Дыялог і эвалюцыйны шлях развіцця — гэта тыя прынцыпы, на якіх грунтуецца беларуская мадэль сацыяльна арыентаванай дзяржавы.

СТАР. 3

## КОРАТКА

- **У Беларусі з новага года змяняюцца форма і парадак выдачы пасведчання шматдзетнай сям'і.**
- Дапамогі на дзяцей у 2021 годзе плануецца ўзняць больш чым на 8 %.



- **Беларусы з 16 студзеня 2021 года могуць без віз наведваць ААЭ.**

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Ідзе падпіска на «Звязду» на І квартал або І паўгоддзе 2021 года

НАЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

# «...не пытанне выбару, а непазбежная неабходнасць»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка адзначыў: праблемы, з якімі сутыкнуліся сёння краіны СНД, сведчаць, «што ўмацаванне інтэграцыйных механізмаў на постсавецкай прасторы не пытанне выбару, а непазбежная неабходнасць».

«Лічу, што пра выгады можна будзе казаць толькі тады, калі мы цалкам раскрыем патэнцыял нашай Садружнасці. Гэта стане адным з галоўных прыярытэтаў беларускага старшынства ў Садружнасці ў наступным годзе, калі мы прымем тут адпаведнае рашэнне», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт абазначыў асноўныя контуры канцэпцыі старшынства, якую апублікуюць традыцыйна пазней. Увагу засяродзяць на ўмацаванні ролі Садружнасці для паляпшэння ўзроўню жыцця насельніцтва, на вырашэнні праблем, звязаных з глабалізацыяй і новымі выклікамі сучаснасці. Асноўны акцэнт, як дадаў Аляксандр Лукашэнка, зробяць на развіцці агульнай эканамічнай прасторы, лібералізацыі гандлю, скарачэнні да мінімуму абмежаванняў і выключэнняў, ліквідацыі тэхнічных бар'ераў, уніфікацыі правілаў і працэдур дзяржзакупак, фарміраванні агульных рынкаў тавараў і паслуг.

Асаблівае значэнне надае Беларусь спалучэнню шматузроўневых інтэграцыйных працэсаў у Садружнасці і Еўразійскім эканамічным саюзе.

«Упэўнены, што пры больш цесным супрацоўніцтве выканаўчых органаў гэтых двух найважнейшых аб'яднанняў мы зможам значна ўмацаваць нашы сувязі. Як мінімум мы не павінны дапусціць сітуацыі, калі больш глыбокая інтэграцыя ў Еўразійскім эканамічным саюзе абернецца нейкай падзяляльнай лініяй у гандлёва-эканамічных адносінах «пяцёркі» і іншых краін Садружнасці», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Ён дадаў, што калісьці на постсавецкай прасторы стварылі шмат інтэграцыйных структур. Былі прапановы некаторыя з іх аб'яднаць ці скараціць.

«На гэта не пайшлі і ахарактарызавалі інтэграцыйнае будаўніцтва як рознаўзроўневую інтэграцыю. Самы высокі ўзровень, безумоўна, — у Саюзнай дзяржаве Беларусі і Расіі, Еўразійскім эканамічным саюзе і СНД. Тады мы дамовіліся, што будзем зверху ўніз падцягваць узровень супрацоўніцтва. У дадзеным выпадку размова ідзе пра СНД і Еўразійскі эканамічны саюз, каб у рамках СНД ствараць такі ж узровень супрацоўніцтва, хаця б як у ЕАЭС», — сказаў кіраўнік краіны.

Паводле яго слоў, варта працягнуць сістэмнае і паслядоўнае ўдасканаленне скаардынаванай транспартнай палітыкі, пошук канкрэтных рашэнняў па пастаўках энергарэсурсаў. Бачыць кіраўнік краіны неабходнасць пашыраць вытворчую кааперацыю, шукаць агульныя кропкі эканамічнага росту, павышаць эфектыўнасць міжгаліновых органаў СНД, накіраваць іх на актывізацыю інвестыцыйнай дзейнасці.

Аляксандр Лукашэнка звярнуўся да папярэдняга выступоўцы, Прэзідэнта Азербайджана Ільхама Аліева, які запрасіў беларускія кампаніі аднаўляць раёны, якія пацярпелі ад канфлікту ў Нагорным Карабаху.

«Мы на пасяджэнні ЕАЭС абмяркоўвалі таксама пытанні кааперацыі. І Уладзімір Пуцін прапанаваў супрацоўніцтва ў больш высокай ступені — тэхналагічных галінах, напрыклад, авіябудаўніцтва. Ён прапанаваў некаторыя вузлы і агрэгаты сярэднемагістральнага самалёта ствараць у іншых краінах. А таксама падкрэсліў, што вельмі важным з'яўляецца кірунак супрацоўніцтва ў гэтай сферы з Узбекістанам. Вось гэта тое, што нам неабходна, чаго не хапае і ЕАЭС, і СНД — каб быў інтарэс і мы прывязваліся адзін да аднаго, тады будзе складана адарваць адну дзяржаву ад другой», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

«Традыцыйна мы будзем удзяляць вялікую ўвагу ўмацаванню гуманітарных сувязяў, пашырэнню кантактаў у навуковых галінах, а таксама ў сферах адукацыі, аховы здароўя, інфармацыі, культуры, спорту і турызму, працы з моладдзю, павышэнню іміджу Садружнасці на міжнароднай арэне, акцэнтаваў Аляксандр Лукашэнка. — Наша стратэгічная мэта — стварэнне шырокай еўразійскай зоны супрацоўніцтва, а таксама ўмацаванне міру, дружбы, добрасуседства і ўзаемавыгаднага адносін у рэгіёне».

Садружнасць Незалежных Дзяржаў адбылася і стала адным з эфектыўных інструментаў забеспячэння рэгіянальнай стабільнасці — выказаў упэўненасць Прэзідэнт Беларусі, але саюзу неабходна працягваць умацоўваць сваю ролю ў вырашэнні новых і застарэлых праблем.

«Што б ні казалі скептыкі, але Садружнасць Незалежных Дзяржаў адбылася і стала адным з эфектыўных інструментаў забеспячэння рэгіянальнай стабільнасці. Але гэты інструмент мае патрэбу ва ўдасканаленні. Пастаянна з'яўляюцца новыя выклікі», — канстатаваў кіраўнік краіны.

Нагляднага прыклад гэтага, паводле яго выказвання, — аднаўленне ўзброенага супрацьстаяння паміж Арменіяй і Азербайджанам.

«Упэўнены, што ў сённяшніх няпростых умовах асаблівую важнасць набывае няўхільнае выкананне ўзятых на сябе абавязкаў. Не будзем выконваць тое, аб чым мы дамовіліся, — ніякіх у нас не будзе ні саюзаў, ні дамоўленасцей у будучыні. Рэалізацыя гэтых дамоўленасцей не павінна быць справай густу ці асабістых пераваг. За намі мільёны людзей», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён адзначыў: Беларусь заўсёды рухалася згодна з такімі прынцыпамі. Прэзідэнт выказаў упэўненасць, што, старшынствуючы ў СНД, пры падтрымцы іншых краін саюза мы зможам рэалізаваць намечаныя планы, прыкмета прасунуцца ва ўсебаковым умацаванні дзяржаў — удзельніц СНД. «Мы можам стаць мацнейшымі толькі дзякуючы салідарнай адказнасці і згуртаванасці», — рэзюмаваў Прэзідэнт Беларусі.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# Эфектыўная заканадаўчая база — аснова паспяховага развіцця краіны

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар).*

Мы будзем і надалей адстойваць мір, парадак і стабільнасць. Без гэтага немагчымыя далейшы прагрэс, стварэнне камфортных умоў для жыцця людзей, упэўненасць у заўтрашнім дні.

Так, сёння неабходны дыялог. Але дыялог канструктыўны, накіраваны як на вырашэнне наяўных праблем, так і на вызначэнне шляхоў далейшага развіцця краіны.

Для гэтага ёсць нямала механізмаў: асабістыя прыёмы грамадзян, прамыя тэлефонныя лініі, дыялогавыя пляцоўкі, грамадскія прыёмныя, сустрэчы з працоўнымі калектывамі і моладдзю.

Дзякуючы такім формам работы ў Савет Рэспублікі паступае вялізная колькасць прапаноў па ўдасканаленні заканадаўства, дзяржаўнага будаўніцтва, узмацненні ролі мясцовага кіравання і самакіравання, рэалізацыі маладзёжнай палітыкі і шэрага іншых пытанняў. Усе яны старанна прапрацоўваюцца, аналізуюцца і, безумоўна, будуць улічвацца пры падрыхтоўцы шостага Усебеларускага народнага сходу.

Менавіта на пляцоўцы гэтага ўсенароднага форуму нам трэба будзе абмеркаваць актуальныя сацыяльна-эканамічныя і грамадска-палітычныя пытанні.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка адзначыў: «Гэта павінен быць рэальны дыялог па выпрацоўцы стратэгіі развіцця краіны. Няхай людзі адкрыта гавораць, абмяркоўваюць — прымем рашэнні і будзем па іх жыць».

Нам, членам Савета Рэспублікі, варта больш актыўна ўключыцца ў падрыхтоўку будучага мерапрыемства, абагульняць прапановы з месцаў, сустракацца з людзьмі, выходзіць на адкрыты і гранічна сумленны дыялог.

Неабходныя вопыт, веды і навыкі ў нас ёсць.

Паважаныя калегі!

Хачу падвесці некаторыя вынікі нашай дзейнасці і абазначыць задачы на перспектыву.

У рамках работы па ўдасканаленні заканадаўства разгледжаны 41 законапраект, у тым ліку 10 — аб ратыфікацыі міжнародных дагавораў. Прынята да ведама два дэкрэты Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, вырашаны кадравыя пытанні.

Ухвалены найважнейшы эканамічны дакумент — рэспубліканскі бюджэт на 2021 год. Ён пераканаўча сведчыць аб захаванні фінансавых прыярытэтаў. Толькі ўдумайцеся: 45 працэнтаў кансалідаванага бюджэту — гэта сацыяльныя выдаткі. Дзяржавай будуць прыняты ўсе меры па выкананні бюджэтных абавязацельстваў у галіне сацыяльнай палітыкі.

Праведзена маштабная работа па канцэптуальным пераглядзе заканадаўства аб адміністрацыйнай адказнасці. З улікам мэтавых установак кіраўніка дзяржавы праекты адпаведных кодэксаў арыентаваны на ўзмацненне прафілактычных мер уздзеяння і гуманізацыю адміністрацыйнага працэсу.

Змяненні ў сферы крымінальнай адказнасці забяспечаць яе комплексную лібералізацыю, суразмернасць мер крымінальна-прававога ўздзеяння ўчыненаму.

Карэкціроўка Закона «Аб дзяржаўных сімвалах Рэспублікі Беларусь» пашырае выпадкі выкарыстання Дзяржаўнага флага Рэспублікі Беларусь.

На павышэнне міграцыйнай прывабнасці, абарону канстытуцыйнага ладу і дзяржаўнага суверэнітэту накіраваны папраўкі ў Закон «Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь».

Дадатковую абарону атрымалі найбольш уразлівыя катэгорыі грамадзян: шматдзетныя сем'і, грамадзяне з інваліднасцю, а таксама сем'і, якія выхоўваюць дзяцей з інваліднасцю.

Павышэнню якасці і даступнасці медыцынскай дапамогі, узроўню аховы здароўя насельніцтва спрыяюць папраўкі ў законы «Аб ахове здароўя» і «Аб аказанні псіхалагічнай дапамогі».

Змены закранулі прадпрымальніцкую і гаспадарчую дзейнасці.

Комплекс навацый, унесеных у Закон «Аб гаспадарчых таварыствах», дазволіць палепшыць умовы работы такіх прадпрыемстваў і павысіць яе якасць.

Спрошчаны патрабаванні да вядзення бізнесу ў сферах гандлю і грамадскага харчавання, а таксама да ўмоў ажыццяўлення рэкламнай дзейнасці.

Значна абноўлена дагаворна-прававая база міжнароднага супрацоўніцтва.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Прыярытэтным кірункам нашай дзейнасці з'яўляецца работа са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб.

Сёння асабліва важна ўмацаванне зваротнай сувязі з людзьмі, аказанне ўсебаковай дапамогі ў вырашэнні іх надзённых праблем. Для гэтага ў нас паўнамоцтваў дастаткова.

У сесійны перыяд членамі Савета Рэспублікі праведзена больш за 140 асабістых прыёмаў, у тым ліку звыш 50 выязных, разгледжана каля 1000 зваротаў.

Грамадзяне звяртаюцца да нас не толькі з праблемамі асабістага характару. Часта ўзнімаюцца пытанні, якія закранаюць розныя аспекты жыццядзейнасці дзяржавы і грамадства.

Пры садзейнічанні членаў Савета Рэспублікі многае вырашаецца станоўча. Людзі ўдзячныя за ўважлівыя, адказныя і неабыякавыя адносіны да іх. Словы падзякі паступілі ў адрас Сяргея Міхайлавіча Сіўца, Тацццяны Аркадзеўны Рунец, Сяргея Анатолевіча Анюхоўскага, Валерыя Уладзіміравіча Гайдукевіча, Юрыя Іосіфавіча Наркевіча, Наталлі Віктараўны Якубіцкай.

Кожны чалавек павінен быць пачуты. Кожны з нас павінен дайсці да сутнасці праблемы, прадметна разабрацца і дапамагчы.

Па-ранейшаму мы атрымліваем шмат пісьмаў у падтрымку дзяржаўнай палітыкі, якая праводзіцца. Паступаюць і пісьмы з іншым пунктам гледжання.

За перыяд з верасня да снежня членамі Савета Рэспублікі праведзена больш за 500 сустрэч з працоўнымі калектывамі і насельніцтвам. Хачу адзначыць актыўную дзейнасць Алены Алегаўны Зяблікавай і Рыгора Васілевіча Пратасавіцкага.

Калегі, звяртаю вашу ўвагу на неабходнасць актывізацыі работы і ў сродках масавай інфармацыі.

Як справядліва адзначыў наш Прэзідэнт, «інфармацыйная медыяпрастора ператвараецца ў поле бою геапалітычных інтарэсаў».

Мы павінны аператыўна і адэкватна адказваць на выклікі, прадстаўляць аб'ектыўную інфармацыю аб тым, што адбываецца ў Беларусі і на яе знешнім контуры.

Ад нашай грамадзянскай пазіцыі, умення даносіць свой пункт гледжання па грамадска значных пытаннях наўпрост залежаць імідж улады і давер да яе, суверэнітэт і незалежнасць нашай краіны.

У гэтай рабоце трэба максімальна задзейнічаць патэнцыял памочнікаў членаў Савета Рэспублікі. Яны павінны актывізаваць сваю дзейнасць, працаваць ініцыятыўна, з поўнай аддачай.

За выніковасць іх работы вы адказваеце персанальна.

Паважаныя таварышы!

У сесійны перыяд праведзены шэраг важных мерапрыемстваў.

На базе прадпрыемства «Нафтан» і Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта адбылося пасяджэнне навукова-кансультатыўнага савета пры Прэзідыуме Савета Рэспублікі. Мы разгледзелі комплекс пытанняў, звязаных з развіццём інавацыйна-прамысловых кластараў.

Чаму была выбрана гэта тэма? Кластарны падыход станоўча зарэкамендаваў сябе ў сусветнай практыцы. Стварэнне кластараў — адзін з галоўных фактараў павышэння канкурэнтаздольнасці рэгіёнаў і нацыянальных эканомік.

На выязным пасяджэнні Прэзідыума Савета Рэспублікі ў Беларусбанку былі разгледжаны пытанні збалансаванасці бюджэтнай сістэмы ў 2021 годзе, уключаючы кірункі фінансавання сацыяльнай сферы і жыллёва-камунальнай гаспадаркі, а таксама рэзервы для росту бюджэтных даходаў у рэгіёнах.

Я хачу падзякаваць нашым членам Савета Рэспублікі — Дзямідаву Дзмітрыю Уладзіміравічу і Ананічу Віктару Міхайлавічу — за дапамогу ў арганізацыі гэтых мерапрыемстваў.

Набірае абароты дзейнасць Маладзёжнага парламента пры Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь.

Пад яго патранатам ва ўсіх рэгіёнах праведзены маладзёжныя форумы «Беларусь — гэта мы». Цяпер ідзе падрыхтоўка выніковага рэспубліканскага форуму.

Менавіта па прапанове Маладзёжнага парламента ва ўсіх абласцях пачалі функцыянаваць грамадскія прыёмныя, якія зарэкамендавалі сябе як актуальная і запатрабаваная форма работы з насельніцтвам.

Нам неабходна максімальна задзейнічаць магчымасці маладзёжнага парламентарызму. Гэты рэсурс можа стаць сур'ёзным інструментам узаемадзеяння паміж органамі ўлады і моладдзю.

Прашу вас актыўна ўключыцца ў работу з членамі Маладзёжнага парламента, аказваць дапамогу ў рэалізацыі іх ініцыятыў. Мы павінны пастаянна сустракацца з нашымі маладымі калегамі. Адным словам, працаваць сумесна.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

У сучасных умовах асаблівае значэнне набывае міжнародная парламенцкая дзейнасць.

Сёння парламенты і еўрапейскія структуры прымаюць тэндэнцыйныя рэзалюцыі, заснаваныя на скажэнні і палітызаванай трактоўцы падзей у нашай краіне.

Нацыянальным сходам Рэспублікі Беларусь у афіцыйных заявах дадзена жорсткая ацэнка падобным дакументам як адкрытаму ўмяшанню ва ўнутраныя справы Беларусі.

Старшыням парламентаў дзяржаў — членаў Еўрапейскага саюза, кіраўнікам замежных міжпарламенцкіх камісій і рабочых груп накіраваны адпаведныя звароты. Аднак еўрапейскія «настаўнікі дэмакратыі» высакамерна не чуюць беларускіх парламентарыяў. Больш за тое, дэпутаты Еўрапарламента адкрыта дэзінфармуюць еўрапейскую грамадскасць аб сітуацыі ў Беларусі і дапускаюць грубыя абразы.

Таму нам трэба выкарыстоўваць усе свае міжнародныя кантакты і каналы камунікацый у мэтах аб'ектыўнага інфармавання аб становішчы спраў у краіне.

Важным прыярытэтам у міжнародным парадку застаецца ўзаемадзеянне на пляцоўках Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, Парламенцкай Асамблеі Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы, Міжпарламенцкай Асамблеі СНД, Міжпарламенцкага саюза.

У ходзе лістападаўскіх мерапрыемстваў МПА СНД Сяргей Міхайлавіч Сівец і Тацццяна Аркадзеўна Рунец выбраны намеснікамі старшыняў профільных пастаянных камісій. Прыміце нашы віншаванні і пажаданні поспехаў у адказнай дзейнасці.

Паважаныя калегі!

Цяпер, як ніколі, важная кансалідацыя грамадства ў вырашэнні палітычных і сацыяльных пытанняў. Будучыня залежыць толькі ад нас. Дзейнічаючы больш настойліва і энергічна, разам працуючы на карысць нашай Радзімы, мы вытрымаем выпрабаванні часу.

Менавіта справы, як слушна адзначыў Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, — гэта сапраўдны патрыятызм, справы, якія павышаюць якасць жыцця беларусаў і ўмацоўваюць нашу дзяржаву.

У адыходзячым годзе нам трэба зрабіць яшчэ адну добрую справу — прыняць удзел у штогадовай рэспубліканскай акцыі «Нашы дзеці».

Упэўнена, мы зможам падарыць свята кожнаму дзіцяці.

У заключэнне дазвольце падзякаваць вам за работу і павіншаваць з надыходзячымі Раством і Новым годам. Здароўя, шчасця, дабрабыту вам і вашым блізкім, поспехаў і выканання жаданняў. Нашай роднай краіне — стабільнасці і росквіту.

# Актуальныя задачы Парламента напярэдадні агульнанацыянальнага форуму

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар).*

Упэўнены, што маючы адбыцца Усебеларускі народны сход дазволіць без якога-небудзь умяшання і пасрэдніцтва звонку вызначыць лёс краіны, самастойна вырашыць найважнейшыя пытанні яе грамадска-палітычнага ладу.

У сваю чаргу, дэпутацкі корпус павінен адыграць самую актыўную ролю ў падрыхтоўцы ключавых дакументаў, якія будуць вынесены на разгляд гэтага агульнанацыянальнага форуму.

У ходзе сесіі намі ўжо прыняты шэраг важных рашэнняў, накіраваных на ўмацаванне грамадзянскага міру і стабільнасці, забеспячэнне ўстойлівага развіцця дзяржавы.

Так, Палатай прадстаўнікоў дадзена згода Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь на прызначэнне Прэм'ер-міністра, заслухана і адобрана Праграма дзейнасці ўрада да 2025 года.

Становучая дынаміка развіцця краіны наўпрост залежыць ад мер, якія прымаюцца па павышэнні эфектыўнасці нацыянальнай эканомікі, яе здольнасці хутка рэагаваць на змяненне знешніх умоў гаспадарання, па асваенні новых ніш і рынкаў збыту айчыннай прадукцыі.

Галоўная задача дэпутацкага корпуса пры вырашэнні заканадаўчых пытанняў эканамічнага блока — стварыць умовы для стабілізацыі сацыяльна-эканамічнай сітуацыі і стымуляваць рост дзелавой актыўнасці.

Менавіта ў рамках такога падыходу ішла работа па падрыхтоўцы праекта Закона аб рэспубліканскім бюджэце і паправаk у Падатковы кодэкс.

Прынцыпова важна, што, нягледзячы на ўсе складанасці, выкліканыя пандэміяй, у бюджэце закладзены механізмы дзяржаўнай падтрымкі беларускага вытворцы, а таксама захоўваецца яго сацыяльная накіраванасць. Ахова здароўя, адукацыя, сацыяльнае забеспячэнне, паступальны рост зарплаты ў бюджэтнай сферы па-ранейшаму застаюцца ў цэнтры ўвагі дзяржавы.

Пазітыўным вынікам сесіі для грамадзян з'яўляецца таксама тое, што пры карэкціроўцы Падатковага кодэкса ўрэгулявана і тэма так званага дарожнага збору, якая шырока абмяркоўвалася.

Наша задача — уважліва адсочваць, як гэта норма будзе выконвацца, каб, калі спатрэбіцца, вызначыць шляхі ўдасканалення выпрацаванага сумесна з урадам механізму.

У ходзе сесіі прыняты значныя для бізнес-супольнасці праекты законаў па пытаннях дзейнасці гаспадарчых таварыстваў, гандлю і грамадскага харчавання, выканаўчай вытворчасці, аграпрамысловага комплексу.

Яшчэ па цэлым шэрагу законапраектаў, разгледжаных намі ў першым чытанні, варта працягнуць цеснае ўзаемадзеянне з урадам. Асаблівую ўвагу пры гэтым дэпутатам трэба звярнуць на дапрацоўку законапраекта аб самарэгулюемых арганізацыях, удасканаленне заканадаўства па развіцці банкаўскай сферы і рынку каштоўных папер.

Неабходнасць надзейнага забеспячэння дзяржаўнага суверэнітэту запатрабавала прыняцця рашэнняў у сферах нацыянальнай бяспекі, законнасці і правапарадку. У гэтым плане своечасова выканана яшчэ адна важная задача, пастаўленая кіраўніком дзяржавы, — прынятыя новыя рэдакцыі Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчага кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях.

Варта адзначыць, што дэпутацкі корпус правёў вялікую работу пры падрыхтоўцы гэтых дакументаў з улікам прапаноў, якія паступілі ад грамадзян і зацікаўленых арганізацый.

Вынікам гэтай работы сталі нарматыўныя прававыя акты, якія ўлічваюць сучасны ўзровень развіцця грамадскіх адносін. Іх галоўнай асаблівасцю з'яўляецца прафілактычны і папераджальны характар. Разам з тым нароўні з гуманізацыяй заканадаўства дзяржава пакідае за сабой права прымяняць жорсткія меры рэагавання за грубыя і сістэматычныя правапарушэнні.

Згодна з такім падыходам, была праведзена работа па комплекснай карэкціроўцы крымінальнага заканадаўства, якая прадугледжвае ў тым ліку дэкрыміналізацыю шэрагу складаў злачынстваў, удасканаленне інстытута вызвалення ад крымінальнай адказнасці і прымяненне інстытута паручыцельства пры памілаванні асуджаных.

Неабходна прадоўжыць сістэмную работу па далейшай лібералізацыі крымінальнай адказнасці і ўжо на вясенняй сесіі Палаты прадстаўнікоў пачаць разгляд праектаў новых Крымінальнага, Крымінальна-працэсуальнага і Крымінальна-выканаўчага кодэксаў.

Шырокі рэзананс у грамадстве выклікалі прынятыя змены ў заканадаўства аб грамадзянстве.

Гэтыя карэкціроўкі дазволяць найбольш поўна рэалізоўваць права на набыццё грамадзянства Рэспублікі Беларусь, у тым ліку непаўналетнімі дзецьмі, будуць спрыяць павышэнню міграцыйнай прывабнасці, паляпшэнню дэмаграфічнага і эканамічнага патэнцыялу нашай краіны.

Развіццё прававых асноў сацыяльнай сферы нязменна з'яўляецца адным з прыярытэтаў у заканадаўчым парадку дня дэпутацкага корпуса. Разгледжаны дакументы, якія датычацца пытанняў пенсійнага забеспячэння за работу ў асаблівых умовах працы, а таксама сацыяльнай падтрымкі асобных катэгорый грамадзян.

У найбліжэйшы час мы чакаем унясенне новай рэдакцыі Кодэкса аб адукацыі.

Дэпутацкаму корпусу трэба аператыўна ўключыцца ў работу над гэтым важным дакументам, а пры неабходнасці — правесці парламенцкія слуханні з прыцягненнем самага шырокага кола зацікаўленых.

Нягледзячы на ўсе складанасці, звязаныя з пандэміяй і пераводам большасці мерапрыемстваў у анлайн-рэжым, не зніжалася інтэнсіўнасць і нашай міжпарламенцкай дзейнасці.

Мы актыўна задзейнічалі магчымасці міжпарламенцкага супрацоўніцтва для давядзення да парламентаў замежных краін, міжнароднай грамадскасці аб'ектыўнай інфармацыі аб сітуацыі ў краіне.

Адпаведныя сумесныя звароты спікераў палат Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь былі накіраваныя ў адрас кіраўніцтва парламентаў 27 краін — членаў Еўрапейскага саюза.

Ад імя кіраўнікоў рабочых груп Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з парламентамі замежных дзяржаў накіраваны пасланні ў адрас замежных калег-парламентарыяў з 44 краін.

Акрамя таго, намі зроблены шэраг афіцыйных заяў аб недапушчальнасці ўмяшання ва ўнутраныя справы ў сувязі з рэзалюцыямі, прынятымі ў дачыненні да Беларусі. Любыя спробы знешняга ціску на Рэспубліку Беларусь, дэстабілізацыі грамадска-палітычнай сітуацыі, дыктату і санкцый абсалютна недапушчальныя.

Пры гэтым мы па-ранейшаму застаёмся прыхільнікамі шматвектарнага знешнепалітычнага курсу, у аснове якога ляжаць прынцыпы добрасуседства, павагі, узаемавыгаднага эканамічнага супрацоўніцтва і забеспячэння рэгіянальнай бяспекі.

Наша пазіцыя нязменная — адкрыты, канструктыўны, раўнапраўны і сумленны дыялог, прасоўванне аб'яднаўчага парадку дня, садзейнічанне гандлёва-эканамічным і гуманітарным сувязям, умацаванне даверу паміж народамі.

Менавіта ў такім духу ўзаемадзеяння з міжнароднай супольнасцю, у ходзе паслядоўнай і прадказальнай знешняй палітыкі вялася работа беларускіх парламентарыяў у Міжпарламенцкім саюзе, на мерапрыемствах Парламенцкай асамблеі АБСЕ.

Дадатковы імпульс атрымала наша дзейнасць у рамках інтэграцыйных утварэнняў, удзельніцай якіх з'яўляецца Рэспубліка Беларусь.

У фармаце відэаканферэнцыі прайшлі пасяджэнні камісій Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі, дзе абмяркоўваліся пытанні бюджэту і фінансаў, эканамічнай, сацыяльнай і маладзёжнай палітыкі, навукі, культуры, экалогіі і прыродакарыстання.

Днямі адбудзецца чарговая сесія Парламенцкага сходу, і вельмі важна максімальна выкарыстаць магчымасці гэтага форуму для ўмацавання стратэгічнага партнёрства і Саюзнай дзяржавы.

Узаемадзеянне на пляцоўках Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД служыла абмену вопытам па важных бягучых палітычных і прававых пытаннях.

Удзел парламентарыяў у рабоце ПА АДКБ спрыяў умацаванню салідарнасці краін-удзельніц перад тварам нарастальных знешніх пагроз.

Яшчэ адным кірункам работы з'яўлялася назіранне за выбарамі ў складзе місій назіральнікаў ад Садружнасці Незалежных Дзяржаў, а таксама па лініі Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі.

Прадстаўнікі дэпутацкага корпуса прынялі ўдзел у назіранні за прэзідэнцкімі выбарамі ў Таджыкістане і Малдове.

У студзені 2021 года плануецца ўдзел беларускіх парламентарыяў у міжнародным назіранні за датэрміновымі выбарамі Прэзідэнта ў Кыргызстане і парламенцкімі выбарамі ў Казахстане.

Мы павінны максімальна задзейнічаць патэнцыял міжнародных пляцовак і розных формаў камунікацыі з замежнымі калегамі для адстойвання нацыянальных інтарэсаў.

Самую сур'ёзную ўвагу ў ходзе сесіі дэпутацкі корпус аддаў рабоце ў выбарчых акругах. Акрамя традыцыйных сустрэч з выбаршчыкамі, дэпутаты сталі актыўнымі ўдзельнікамі рэгіянальных дыялогавых пляцовак па абмеркаванні перспектыў сацыяльна-эканамічнага і грамадска-палітычнага развіцця краіны.

Трэба і далей, асабліва напярэдадні Усебеларускага народнага сходу, выкарыстоўваць гэты фармат работы як канал зваротнай сувязі з насельніцтвам, што дазваляе не толькі выяўляць, але і максімальна поўна рэагаваць на праблемы, якія адбываюцца ў грамадстве, а дзесьці іх і фарміраваць.

Ва ўмовах бесперапыннага масіраванага дэструктыўнага інфармацыйнага ўздзеяння асаблівую значнасць набывае наша задача па захаванні грамадскага міру і згоды.

Неабходна даносіць да людзей аб'ектыўную інфармацыю аб мерах, якія прымаюцца дзяржавай у гэты няпросты перыяд, аказваць максімальнае садзейнічанне мясцовым органам улады ў падтрыманні рытмічнай работы прадпрыемстваў і працоўнай дысцыпліны.

Безумоўна, нельга пакідаць без увагі і вырашэння праблемных пытанняў выбаршчыкаў.

Важна сістэмна аналізаваць сітуацыю і на выхадзе мець прапрацаваныя канкрэтныя прапановы ўраду, губернатарам, падказваць, дзе ёсць рэзервы.

Традыцыйна дэпутаты прымаюць самы актыўны ўдзел у навагодняй дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці».

Зразумела, цяперашняя эпідэмічная сітуацыя накладвае некаторыя абмежаванні на фармат правядзення мерапрыемстваў, але нам неабходна зрабіць усё магчымае, каб дзеці, асабліва тыя, якія апынуліся ў няпростай жыццёвай сітуацыі, адчулі нашы ўвагу і клопат.

На заканчэнне, паважаныя калегі, дазвольце падзякаваць вам за плённую работу і павіншаваць з надыходзячымі калляднымі святамі і Новым годам.

Жадаю вам моцнага здароўя, шчасця і поспехаў у працы на карысць роднай Беларусі.

Парламенцкі дзённік

# Абноўленыя кодэксы і бюджэт з дэфіцытам

**Дэпутаты на двух пасяджэннях чацвёртай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу сёмага склікання ўчора прынялі шэраг важных законапраектаў, у тым ліку і бюджэт краіны на 2021 год.**

Палата прадстаўнікоў прыняла праект закона «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2021 год» у двух чытаннях. Як паведаміў **міністр фінансаў Юрый СЕЛІВЁРСТАЎ,** даходы плануюцца на ўзроўні Br23,3 млрд. Расходы разлічаны на ўзроўні Br27,3 млрд. Дэфіцыт рэспубліканскага бюджэту прадугледжваецца на ўзроўні Br4 млрд.

«У ліку прыярытэтных напрамкаў расходаў бюджэту — своечасовае выкананне даўгавых абавязацельстваў, працяг працы па павышэнні аплаты працы ў бюджэтнай сферы і яе збліжэнне з заробкам у рэальным сектары, апераджальны рост заробкаў нізкааплатных катэгорый грамадзян», — перадае словы Юрыя Селівёрстава БелТА. Мяркуецца, што заробкі бюджэтнікаў будуць павышацца ў два этапы з ростам базавай стаўкі.

Як паведамлялася, у даходах найбольшую долю павінны скласці падатковыя даходы — амаль Br19,56 млрд. Яшчэ Br2,37 млрд — непадатковыя даходы, Br1,36 млрд — безвыплатныя паступленні.

Парламентарыі прынялі ў двух чытаннях і праект закона «Аб бюджэце дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва на 2021 год», «Аб змяненні Падатковага кодэкса».

«У 2021 годзе для выплаты дзяржаўных дапамог сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, асобных відаў пенсій у бюджэт фонду сацыяльнай абароны насельніцтва перадаюцца субвенцыі ў Br1,63 млрд. З гэтага года ўстаноўлена выплата абавязковых страхавых узносаў за ваеннаслужачых, якія праходзяць тэрміновую ваенную службу. Такіх паступленняў на 2021 год прадугледжана ў суме Br1,3 млн (менш за 0,01 %)», — паведаміла **Юлія МУРЫНА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па бюджэце і фінансах.** У цэлым, як падкрэсліла дэпутат, бюджэт фонду на 2021 год сфарміраваны з перавышэннем даходаў над расходамі ў суме Br332,8 млн.

Як паведаміў міністр фінансаў, стаўкі падаткаў у 2021 годзе будуць праіндэксаваны на 5,5 %. На 7,4 % прадугледжваецца індэксацыя гранічных памераў падатковых ільгот і вылікаў па падаходным падатку з фізічных асоб.

У другім чытанні зацверджаны новыя праекты Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях і Працэсуальна-выканаўчага кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях.

Паводле слоў **старшыні Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў Святланы ЛЮБЕЦКАЙ,** у праектах кодэксаў значная колькасць складаў адміністрацыйных правапарушэнняў карэкціравалася, палова з іх загучала па-новаму. «Гэта сведчыць аб тым, што былі асучаснены асобныя падыходы, гэта значыць, выключаны былі неактуальныя склады адміністрацыйных правапарушэнняў, зменены падыходы да сістэмы пакаранняў, наогул, катэгарызацыя правапарушэнняў праведзена па-новаму», — расказала БелТА дэпутат.

Святлана Любецкая адзначыла асаблівы падыход да адказнасці непаўналетніх у аднаўлёных кодэксах, уключэнне такога інстытута адказнасці, як грамадскія работы. Змяніўся падыход да пераліку органаў, якія ўпаўнаважаны весці адміністрацыйны працэс, лібералізаваны агульныя падыходы да назначэння пакарання ў адносінах да фізічных і юрыдычных асоб, індывідуальных прадпрымальнікаў.

Таксама ў другім чытанні прыняты законапраект «Аб змяненні кодэксаў па пытаннях крымінальнай адказнасці».

* * *

Учора названыя законапраекты былі разгледжаны і ўхвалены на пасяджэнні чацвёртай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу сёмага склікання.

«Бюджэт дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва на 2021 год сфарміраваны з прафіцытам у памеры Br333 млн па прафесійным пенсійным страхаванні. Што такое прафесійнае пенсійнае страхаванне? Гэта падсістэма пенсійнай сістэмы, якая прадугледжвае выхад на датэрміновую пенсію асобных катэгорый грамадзян, якія працуюць у асаблівых умовах працы», — расказала **міністр працы і сацыяльнай абароны Ірына КАСЦЕВІЧ,** каментуючы законапраект «Аб бюджэце дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва на 2021 год».

Сенатары ўхвалілі і праект закона «Аб рэспубліканскім бюджэце на 2021 год».

«Усе сацыяльныя абавязацельствы мы захоўваем. Мала таго, мы яшчэ і прыраслі. Парадку Br1,5 млрд дадаткова будзе прадугледжана толькі на аплату працы бюджэтнікаў, малазабяспечаных катэгорый грамадзян. Ведаеце, што павышаная базавая велічыня з 1 студзеня ўжо зацверджана. Для малазабяспечаных катэгорый яшчэ дадатковы будзе прырост каля 8-9 %, і ў выдатках бюджэту гэта ўсё ўжо прадугледжана», — расказаў міністр фінансаў, прадстаўляючы законапраект.

Разам

# ВЕДАЦЬ ПРА ІНКЛЮЗІЮ СА ШКОЛЬНАЙ ЛАЎКІ

**На працягу снежня ў беларускіх школах праводзяцца інфармацыйныя гадзіны пра інклюзію. Яны прымеркаваны да Міжнароднага дня людзей з інваліднасцю. На гэтых уроках вучні 5-7 класаў знаёмяцца з паняццем «інваліднасць», даведваюцца аб прынцыпах інклюзіўнага асяроддзя, спосабах яго стварэння ў сценах школы. Інфармацыйныя гадзіны на тэму інклюзіі ініцыяваны ЮНІСЕФ у Беларусі ў рамках кампаній «Проста дзеці» і «Проста дзеці ў школе», што рэалізоўваюцца сумесна з міністэрствамі адукацыі і аховы здароўя пры фінансавай падтрымцы ўрада Расійскай Федэрацыі.**

Згодна з Канвенцыяй аб правах дзіцяці, усе дзеці маюць права на адукацыю, скіраваную на развіццё асобы, талентаў, разумовых і фізічных здольнасцяў дзіцяці ў поўным аб'ёме.

Адзін з такіх урокаў, прысвечаных тэме інклюзіі, прайшоў 17 снежня ў 5 «А» класе сярэдняй школы № 111 Мінска. На інфармацыйнай гадзіне навучэнцы пазнаёміліся з сацыяльнай канцэпцыяй інваліднасці, этыкай стасункаў з дзецьмі з інваліднасцю, пагаварылі аб праблемах, з якімі могуць сутыкацца такія дзеці ў працэсе навучання, даведаліся пра вядомых людзей з інваліднасцю, якія, нягледзячы на цяжкасці, дамагліся поспеху.

Дзеці з інваліднасцю пераадольваюць шматлікія перашкоды на шляху інтэграцыі ў грамадства. Перашкодай для іх становіцца не толькі адсутнасць элементаў безбар'ернага асяроддзя (пад'ёмнікаў у школе, пандусаў, узмацняльнікаў гуку і інш.) і неабходных спецыяльных інструментаў для навучання, але і негатыўнае ўспрыманне інваліднасці з боку аднагодкаў і дарослых.

У ходзе інфармацыйнай гадзіны навучэнцы даведаліся, як можа быць уладкаваны горад, зручны для ўсіх, і атрымалі хатняе заданне: распавесці знаёмым пра тое, што дзеці з інваліднасцю такія ж, як і ўсе, падзяліцца думкамі аб інклюзіі ў сваіх сацыяльных сетках, зняць відэа аб тым, як пераўтварыць школу або клас для дзяцей з рознымі патрэбамі, напісаць артыкул па тэматыцы ўрока ў школьную або гарадскую газету.

Распрацаваныя метадычныя матэрыялы скіраваны на пераадоленне стыгмы ў адносінах да дзяцей з інваліднасцю, павышэнне дасведчанасці вучняў і работнікаў устаноў адукацыі аб праве кожнага дзіцяці на якасную адукацыю.

Матэрыялы для правядзення інфармацыйнай гадзіны на тэму інклюзіі размешчаны ў адкрытым доступе на сайце Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) у Рэспубліцы Беларусь (прэзентацыя, напамін, дадатковыя матэрыялы, план урока). Матэрыялы рэкамендаваны для выкарыстання Нацыянальным інстытутам адукацыі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

У ліку найлепшых

# УЧОРА ЎРУЧАЛІ «ЗАЛАТУЮ ЛІТАРУ»

## І «звяздоўцы» там былі

**У Мінску ўзнагародзілі пераможцаў і лаўрэатаў XVI Нацыянальнага конкурсу «Залатая Літара». Урачыстая цырымонія і ўручэнне дыпломаў, а таксама памятных знакаў-сімвалаў прайшла ў Доме прэсы.**

**Першы намеснік міністра інфармацыі Павел ЛЁГКІ** на сустрэчы нагадаў, што першапачаткова мерапрыемства павінна было прайсці падчас Міжнароднай спецыялізаванай выстаўкі «СМІ ў Беларусі», аднак пандэмія ўнесла пэўныя карэктывы. «Тым не менш вырашылі цалкам не адмаўляцца ад правядзення такой грандыёзнай падзеі, ад магчымасці прафесійным журналістам сабрацца разам і атрымаць заслужаныя ўзнагароды», — сказаў ён.

У пераможцах і лаўрэатах сярод рэспубліканскіх друкаваных СМІ, інфармацыйных агенцтваў, сеткавых выданняў — супрацоўнікі і творчыя праекты



**«Залатую літару» атрымлівае Валянціна ЖДАНОВІЧ.**

Выдавецкага дома «Звязда». У персанальнай намінацыі «Найлепшы мастацка-публіцыстычны матэрыял (нарыс, эсэ, фельетон) рэспубліканскіх, абласных, раённых, гарадскіх, карпаратыўных друкаваных СМІ, інфармацыйных агенцтваў, сеткавых выданняў» атрымала перамогу Валянціна Ждановіч, адказны сакратар часопіса «Belarus» Выдавецкага дома «Звязда» з цыклам эсэ і нарысаў.

У намінацыі «Найлепшыя матэрыялы грамадска-палітычнай тэматыкі» лаўрэатам стала рэдакцыя газеты «Звязда» за праект «Чвэрць стагоддзя».

У намінацыі «Найлепшыя матэрыялы сацыяльна-эканамічнай тэматыкі» лаўрэатам стала Алена Брава, рэдактар рэдакцыі часопіса «Алеся» Выдавецкага дома «Звязда» з праектам «Знайдзіся, дзіця!»

У намінацыі «Найлепшыя матэрыялы гісторыка-краязнаўчай тэматыкі» як лаўрэаты адзначылася рэдакцыя газеты «Літаратура і мастацтва» Выдавецкага дома «Звязда».

У намінацыі «Найлепшыя матэрыялы маладзёжнай, дзіцяча-юнацкай тэматыкі» сярод лаўрэатаў — маладзёжны дадатак «Чырвонка. Чырвоная змена» рэдакцыі газеты «Звязда».

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

Добрая навіна

# У МІНСКУ АДКРЫЎСЯ «РАЗУМНЫ» ПАВІЛЬЁН

**Чарговы новы аб'ект з'явіўся на сталічным праспекце Пушкіна. Калі ў пачатку тыдня пасля капітальнага рамонту была ўрачыста адкрыта паліклініка № 20, то сёння — павільён новага пакалення РУП «Белсаюздрук». Калісьці на яго месцы стаяў кіёск, дзе таксама можна было набыць свежую прэсу ці сёе-тое з канцылярскіх тавараў. Зараз жа і функцыянал, і асартымент гандлёвага пункта значна пашырыўся.**

Як расказаў **начальнік упраўлення гандлю і маркетынгу РУП «Белсаюздрук» Аляксандр ДЗМІТРЫЕНКА,** новы павільён можна назваць «разумным»:

— Тут ёсць бясплатны Wi-Fi, таксама ёсць магчымасць падзарадзіць мабільны тэлефон. А яшчэ — ацаніць якасць абслугоўвання, паставіўшы адзнаку прадаўцу.

Гэта ўжо не першы такі павільён у горадзе. Сёлета ён стаў ужо сямнаццатым па ліку. Ды і не толькі ў Мінску павільёны змяняюць кіёскі. Шапікі з лагатыпам «Белдрук» з'яўляюцца ў Віцебску, Брэсце, Гродне, Гомелі... Мяркуецца, што да 2025-га дзверы адчыняць да трох соцень новых павільёнаў.

— Як правіла, яны адкрываюцца каля сацыяльных аб'ектаў — дзіцячых садкоў, школ, паліклінік і на прыпынках грамадскага транспарту, — працягвае Аляксандр Дзмітрыенка. — У такім выпадку шматразова павялічваюцца продажы кніг, газет, часопісаў, канцылярскіх прадукцыі і нават спадарожных тавараў накшталт ежы. Кіёск, напрыклад, не можа пахваліцца спецыяльнай кавазонай або халадзільным абсталяваннем, дзе захоўваецца марожанае. А тут набыць пачастунак — ніякіх праблем. Да таго ж у халоднае надвор'е ў павільён можна зайсці пагрэцца, а ўлетку — схавацца ад спякоты ў памяшканні, дзе працуе кандыцыянер. Ды і гандаль праз павільён лепшы, чым праз кіёск. Людзі ж хочуць падысці і патрымаць будучую пакупку ў руках...

Адной з першых пакупніц стала Ларыса Васілеўна. Жанчына набыла некалькі газет і зборнікаў красвордаў. Яна вельмі ўзрадавана новаму павільёну.

— Справа ў тым, што ў кіёску часта немагчыма выбраць тавар. Як быццам «падпіраеш» ззаду натоўп людзей, якім трэба купіць талончык на праезд. У выніку пачынаеш мітусіцца і не заўжды купляеш тое, што сапраўды хочацца. У павільёне ж адначасова некалькі пакупнікоў могуць выбраць усё, што падабаецца. А яшчэ павільён лепшы для людзей, у якіх не вельмі добры зрок. Можна спакойна дацягнуцца да часопіса, паглядзець вокладку.

За першыя паўгадзіны працы павільён наведалі пятнаццаць чалавек. Што ж, цяпер адной сучаснай крамай у горадзе стала больш.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

**Калектыў Выдавецкага дома «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні рэдактару аддзела «Звязды» Вользе Мядзведзевай з прычыны напаткаўшага яе вялікага гора — заўчаснай смерці СЫНА МІКІТЫ.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю дэпутата Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь трынаццатага склікання, дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь першага і другога скліканняў БІКІНІНА Барыса Сцяпанавіча і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

**Калектыў Выдавецкага дома «Звязда» выказвае шчырыя спачуванні супрацоўніку інтэрнэт-рэдакцыі Дзмітрыю Суганяеву з прычыны напаткаўшага яго вялікага гора — смерці МАЦІ.**

**Калектыў Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь смуткуе ў сувязі са смерцю КРЫВЕНІ Тадэвуша Канстанцінавіча.**

**Тадэвуш Канстанцінавіч зрабіў неацэнны ўклад у развіццё сфер гандлю і грамадскага харчавання на пасадзе першага намесніка міністра гандлю БССР, Рэспублікі Беларусь, а таксама ўзначальваючы пасля Беларускую асацыяцыю кулінараў. Ён быў дастойным прыкладам мудрасці і працавітасці для маладога пакалення.**

**Выказваем спачуванні родным і блізкім Т. К. Крывені ў сувязі з горам, якое напаткала іх, і падзяляем іх смутак.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## СААЗ рэкамендавала еўрапейцам заставацца дома на Каляды



Жыхарам Еўропы ў сувязі з сітуацыяй з COVID-19 варта пазбягаць неабавязковых паездак у сезон калядных свят, заявіў кіраўнік еўрапейскага падраздзялення Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (СААЗ) Ханс Клюге. «Тут ёсць розніца паміж тым, што вам дазваляюць рабіць улады, і тым, што вам варта было б рабіць», — згадала выданне The Guardian вытрымку з заявы Клюге. Паводле яго слоў, падарожжа на Каляды «не вартае рызыкі» з-за небяспекі заразіцца COVID-19. Пры гэтым Клюге прызнаў, што пандэмія нанесла знішчальны ўрон у фінансава-эканамічнай сферы, прывяла да росту беспрацоўя і скарачэння магчымасцяў для самарэалізацыі, раздзяліла шматлікія сем'і. Асабліва эксперт адзначыў небяспеку сацыялізацыі і лакдаўнаў, а таксама сацыяльных праблем для псіхічнага здароўя насельніцтва. Напярэдадні была распаўсюджана заява старшыні Еўракамісіі Урсулы фон дэр Ляен пра тое, што ўлады ЕС пачнуць вакцынацыю насельніцтва ад каранавіруса 27-29 снежня.

## Сёлета сусветны турбізнес страціць больш чым трыльён долараў

За першыя дзесяць месяцаў гэтага года страты сусветнай турыстычнай галіны з-за пандэміі каранавіруса склалі 935 мільярдаў долараў. Аб гэтым паведаміла РБК са спасылкай на Сусветную турыстычную арганізацыю ААН (UNWTO). «У студзень—кастрычнік турыстычныя напрамкі прынялі на 900 мільёнаў менш замежных турыстаў у параўнанні з тым жа перыядам 2019 года», — заявілі ў арганізацыі. Паводле ацэнак UNWTO, да канца года колькасць міжнародных турыстаў скароціцца на 70—75 працэнтаў, што верне сусветны турызм да ўзроўню 30-гадовай даўніны з памяншэннем колькасці прыбыццяў турыстаў на 1 мільярд чалавек і стратай прыкладна 1,1 трыльёна долараў.

## У Балівіі знайшлі 20 новых відаў жывёл і раслін



Навукоўцы выявілі ў горным ланцугу Андаў у Балівіі 20 раней невядомых навуцы відаў жывёл і раслін, а таксама некаторыя віды, якія лічыліся вымерлымі. Аб гэтым паведаміла некамерцыйная арганізацыя «Міжнароднае таварыства захавання прыроды» (Conservation International). Сярод раней невядомых відаў, выяўленых у гарах Балівіі, згадваюцца розныя віды змей, матылькоў, карлікавая жаба, некаторыя кветкі і разнавіднасць бамбуку. «Знаходкі падчас экспедыцыі ў даліне Зонг — сэрцы нашага рэгіёна — дадаюць мноства відаў да навуковых даных. Яны паказваюць, наколькі каштоўныя гэтыя вільготныя трапічныя лясы», — адзначыў генеральны дырэктар аддзялення Conservation International у Балівіі Эдуарда Форна.

# Як працуюць сталічныя паліклінікі

## пасля спынення планавай дапамогі?



**З 5 снежня мінскія паліклінікі спынілі аказанне планавай медыцынскай дапамогі. Рашэнне было прынята з-за хуткага распаўсюджвання каранавіруснай інфекцыі. Гэта значыць, што ўзяць талончык да неўролага, акуліста і нават урача агульнай практыкі пакуль немагчыма. Усе медыкі працуюць з пацыентамі з каранавіруснай інфекцыяй і іншымі рэспіраторнымі хваробамі. Як цяпер арганізавана работа паліклінік, куды мусяць звяртацца людзі з сімптомамі рэспіраторнай інфекцыі і што рабіць, калі абвастрылася захворванне, не звязанае з COVID-19, а таксама для каго зробяць выключэнне і прымуць урачы-спецыялісты? Пра гэта і іншае мы даведаліся, наведаўшы 11-ю сталічную паліклініку.**

Да вымярэння тэмпературы, з якога пачынаецца наведванне паліклінікі, асобнага ўваходу для пацыентаў з рэспіраторнымі сімптомамі і медыкаў у ахоўных касцюмах мы прызвычаіліся яшчэ падчас першай хвалі каранавіруса. Усё гэта захавалася і цяпер. На ўваходзе ўдакладняюць, з якой мэтай вы прыйшлі ў паліклініку. Калі па бальнічным — накіруюць у стол даведак, дзе для вас падбяруць найменш загружаны ў гэты момант кабінет урача, калі адчуваеце сябе прастуджаным — ісці трэба ў інфекцыйны блок. Калі ж, напрыклад, у вас падняўся ціск ці пасля пералому неабходна назіранне хірурга, урача трэба выклікаць на дом.

Да такой мадэлі работы паліклінікі рыхтаваліся яшчэ з восені.

— Ацэньваючы сітуацыю, якая ўвосень складвалася з распаўсюджваннем рэспіраторных захворванняў, у тым ліку COVID-19, мы пастараліся абмежаваць прыём пацыентаў з хранічнымі захворваннямі ў паліклініцы, стараліся максімальна аказаць ім медыцынскую дапамогу дома, — расказвае



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

галоўны ўрач 11-й гарадской паліклінікі Ірына БОЛДЫРАВА. — Калі пацыент выклікаў урача на дом, мы ўдакладнялі прычыну. Калі гэта тэмпература і іншыя прыкметы рэспіраторных захворванняў, накіроўвалі дзяжурнага ўрача. Калі пацыент казаў, што кантактаваў з хворым на COVID-19 ці з'яўляецца кантактам, накіроўвалі кантактную брыгаду. Калі ж неабходныя рэцэпты, то іх дастаўляў медыцынскі работнік з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй або санітарка.

Яшчэ з восені скарацілі прыём па талонах ва ўрачоў агульнай практыкі. Калі раней ён доўжыўся пяць гадзін, то па меры таго, як расла колькасць захварэлых з рэспіраторнымі хваробамі, скараціўся — да чатырох, трох, а потым і да дзвюх гадзін. У час, які вызваліўся, урачы агульнай практыкі прымалі людзей, што знаходзіліся на бальнічных. Дапамагалі ім і ўрачы-спецыялісты.

— Але тых пацыентаў, якія загадзя запісаліся на прыём на снежань-студзень, у тым ліку і праз інтэрнэт, урачы-спецыялісты прымуць. Тым больш што іх няшмат — тры-чатыры ў дзень. Мы ўсім ім патэлефанавалі, удакладнілі прычыну запісу на прыём. У некаторых стан здароўя не пагоршыўся, яны толькі хацелі скарэктаваць лячэнне, і ў выніку адмовіліся ад прыёму.

Пасля спынення аказання планавай дапамогі ўсе ўрачы — неўролаг, акулісты, эндакрынолаг, оталарынголаг, урачы агульнай практыкі, гінеколагі, хірургі, інфекцыяніст, герыятр, загадчык аддзялення медыцынскай рэабілітацыі, урач аддзялення дзённага знаходжання — задзейнічаны ў аказанні медыцынскай дапамогі пацыентам з прыкметамі ВРВІ і COVID-19. Дарэчы, усе яны, паводле слоў галоўнага ўрача, атрымліваюць адпаведныя надбаўкі да зарплаты.

### З рэспіраторнымі сімптомамі — у інфекцыйны блок

Такім чынам, вялікая частка пацыентаў, якія цяпер наведваюць паліклініку, — гэта людзі з прыкметамі ВРВІ. Яны накіроўваюцца ў інфекцыйны блок праз асобны ўваход — з іншага боку будынка. Медыкі туды трапляюць праз шлюз, дзе пераапранаюцца ў ахоўныя касцюмы. Акрамя некалькіх асобных кабінетаў для ўрачоў у інфекцыйным блоку маецца працэдурны кабінет, дзе фельчар-лабарант пры неабходнасці адразу робіць аналіз крыві з пальца, экспрэс-аналіз і забор мазкоў на COVID-19. Таксама ёсць магчымасць зрабіць электракардыяграму. У залежнасці ад колькасці пацыентаў рэгулюецца і колькасць працуючых кабінетаў — прымаць можа да чатырох урачоў у змену. У дзень нашага наведвання паліклінікі (у другой палове дня ў сераду) прыём вёў усяго адзін урач, бо і пацыентаў было няшмат — перад кабінетам мы засталі ўсяго двух мужчын. У калідорах для наведвальнікаў маюцца дэзсродкі, вешалкі для верхняга адзення, ёмістасць для адпрацаваных масак, лямпы для абеззаражвання паветра, на падлозе нанесеная разметка, якая нагадвае пра захаванне бяспечнай дыстанцыі.

Пасля агляду ў інфекцыйным блоку пацыент, як правіла, атрымлівае лісток непрацаздольнасці на максімальна магчымы перыяд, пакуль ён лічыцца заразным, — 7—10 дзён. Пасля, калі няма прыкмет рэспіраторнага захворвання, ён ужо ідзе ва ўмоўна чыстую зону паліклінікі (з цэнтральнага ўвахода) да любога ўрача, які вядзе прыём. Па бальнічных прыём пацыентаў ідзе на працягу ўсяго дня — з 8 раніцы да 20 гадзін вечара. Трэба звярнуцца ў стол даведак, і там парэкамендуюць, у які кабінет прайсці.

### Калі неабходны здымак...

Калі пацыент звяртаецца ў інфекцыйны блок, і ўрач западозрыў захворванне, якое патрабуе рэнтгеналагічнай дыягностыкі ці КТ, медык суправаджае хворага ў рэнтгеналагічны кабінет. Паколькі патрэбнае абсталяванне знаходзіцца ва ўмоўна чыстай зоне паліклінікі, пацыента праводзяць праз шлюз — апрацоўваюць дэзсродкамі і даюць дадатковыя ахоўныя сродкі. Здымак тэрмінова апісваецца ўрачом-рэнтгенолагам і вынік праз непрацяглы час атрымлівае ўрач агульнай практыкі. Калі выяўляецца пнеўманія, а аб'ём паражэння лёгкіх урач бачыць нават па рэнтген-здымку, пры гэтым у пацыента зніжаецца сатурацыя (насычэнне кіслародам), яму выклікаюць аўтамабіль, што ажыццяўляе перавозку такіх хворых, і накіроўваюць у стацыянар.

У выпадку калі шпіталізацыя патрабуецца пацыенту, які лечыцца дома, кантактная брыгада выклікае аўтамабіль для перавозкі і ўзгадняе, у якім стацыянары маюцца месцы.

— Днямі нашага пацыента шпіталізавалі ў РНПЦ фтызіятрыі і пульманалогіі. Урачы адразу інфармуюць кіраўніцтва паліклінікі, мы трымаем на кантролі такія выпадкі, — кажа Ірына Болдырава.

### Калі патрэбна дапамога траўматолага...

У снежні фіксуецца вялікая колькасць галалёдных траўмаў. З імі, як правіла, атрымліваюць першую дапамогу ў траўмапунктах, а далей пацыенты маюць патрэбу назірацца ў хірурга ці траўматолага па месцы жыхарства. Аказанне траўматалагічнай дапамогі ў паліклініцы не спынена.

— Траўмахірургічнае аддзяленне, а яно ў нас укамплектавана на 100 %, працуе ў дзве змены. Траўматалагічную дапамогу мы максімальна стараемся аказваць дома. Пацыент выклікае ўрача, і той згодна з інструкцыямі аб парадку правядзення экспертызы часовай непрацаздольнасці мае права выдаць бальнічны на тэрмін да 30 дзён, калі не патрабуецца больш доўгага назірання. Мы інфармуем пацыента, што ў выпадку пагаршэння стану здароўя неабходна выклікаць урача на дом. У паліклініцы пацыент з'яўляецца толькі тады, калі неабходна зрабіць чарговы здымак, — каментуе Ірына Болдырава. — Ніякіх эксцэсаў няма, пацыенты задаволены такім падыходам. У астатні час урачы-хірургі падключаюцца да работы з пацыентамі, якія знаходзяцца на бальнічных з рэспіраторнымі захворваннямі і COVID-19.

З абвастрэннямі хранічных захворванняў пацыенты таксама мусяць выклікаць урача на дом. Але цалкам верагодна, што давядзецца пачакаць да вечара. Візіты цяпер ажыццяўляюцца цягам рабочага дня — з 8 да 20 гадзін, пры гэтым пацыентаў нямала.

— Па тэлефоне мы вызначаемся: калі чалавек можа пачакаць, да яго прыходзіць дзяжурны ўрач, калі боль узмацняецца або ціск не купіруецца і чакаць нельга, то трэба выклікаць хуткую дапамогу ці звярнуцца ў бальнічныя арганізацыі. Колькасць візітаў я кантралюю штодзень — учора праз стол даведак іх было 137, — адзначае галоўны ўрач. — Гэта без уліку тых, што ажыццяўляюць кантактныя брыгады да пацыентаў з COVID-19 і кантактаў першага ўзроўню.

Для цяжарных жанчын у 11-й паліклініцы вылучылі асобнае памяшканне ў чыстай зоне з асобным уваходам з вуліцы. Яно складаецца з трох кабінетаў, у тым ліку працэдурнага, дзе ёсць магчымасць правесці КТГ і зрабіць агляд. Хоць планавыя візіты цяжарных цяпер мінімізаваныя, але пры неабходнасці яны могуць быць агледжаны ўрачом-акушэрам-гінеколагам без дадатковых рызык.



### Як працуюць кантактныя брыгады

Хворых на COVID-19 і кантакты першага ўзроўню, як у першую хвалю распаўсюджвання інфекцыі, наведваюць так званыя кантактныя брыгады. На сёння ў 11-й паліклініцы, якая абслугоўвае 31 тысячу насельніцтва сталіцы, такіх брыгад тры. Кожная робіць каля паўсотні візітаў штодзень. Урачэбная брыгада выязджае, калі здароўе пацыента пагаршаецца ці патрабуецца карэкціроўка лячэння і правядзенне экспертызы часовай непрацаздольнасці. У астатніх выпадках (калі неабходны забор мазка ці экспрэс-тэсціраванне, калі стан здароўя пацыента не выклікае апасенняў), едзе сястрынская брыгада.

**Урач агульнай практыкі, выконваючы абавязкі загадчыка 1-га тэрапеўтычнага аддзялення Святлана ЯНУШКА і памочнік урача Ганна ВОЙЦІК** працавалі ў кантактных брыгадах яшчэ падчас першай хвалі. Параўноўваючы стаўленне пацыентаў да хваробы тады і цяпер, адзначаюць, што яно стала больш абыякавым.

— Не ўсе пацыенты прытрымліваюцца рэкамендацый і абмежаванняў, гэта абцяжарвае нашу работу. Прыязджаеш на візіт — іх можа не быць дома. Калі раней было больш пацыентаў з лёгкім і бессімптомным цячэннем, то цяпер часцей сустракаюцца больш цяжкія формы. Тэрміны бальнічных сталі больш працяглыя, пацыенты не так хутка папраўляюцца, — кажа Святлана Янушка. — Штодзень тры-чатыры чалавекі мы накіроўваем у стацыянар.



**Урач агульнай практыкі Святлана ЯНУШКА і памочнік урача Ганна ВОЙЦІК.**

### За што ўдзячны пацыенты?

— Людзі з разуменнем ставяцца да сітуацыі, якая склалася. Па чацвяргах у нас праходзіць прыём грамадзян, і людзі запісваюцца толькі дзеля таго, каб выказаць нашым медыкам словы падзякі. У мінулы чацвер, 10 снежня, я пачула прыемныя рэчы адразу ад трох чалавек. Адзін з іх дзякаваў за аказанне медыцынскай дапамогі яго маці, нашы дактары выратавалі жыццё гэтай пажылой жанчыне. Іншы пацыент дзякаваў за арганізацыю работы: ён быў уражаны, як дакладна рэагуюць па ўваходзе, што ў нас і разметка тут ёсць. Яшчэ адзін чалавек дзякаваў па тэлефоне. Я таксама ўдзячная людзям, што яны нас падтрымліваюць, ставяцца з разуменнем да часовых абмежаванняў і змен, — прызнаецца галоўны ўрач.

Дарэчы, як і падчас першай хвалі, так і цяпер паліклінікі працягваюць аказваць бязвыплатную дапамогу. Дзякуючы ёй нядаўна ўдалося набыць пульсаксіметр. Калі раней імі былі забяспечаны толькі ўрачы агульнай практыкі, то цяпер іх мае кожны ўрач-спецыяліст і памочнік урача, якія аказваюць дапамогу пацыентам з COVID-19 і іншымі рэспіраторнымі інфекцыямі.

— Нашы людзі праяўляюць свае найлепшыя якасці — адгукаюцца і дапамагаюць, не пакідаючы нас у такі няпросты час. Для нас такая падтрымка надзвычай важная, — падкрэслівае Ірына Болдырава.

**Алена КРАВЕЦ,**
**фота аўтара.**

З нагоды

# Студэнты-замежнікі працягваюць прыязджаць, нягледзячы на пандэмію



**Сярэдзіна красавіка 1917 года. Пры канцылярыі штаба мінскай міліцыі ствараецца чацвёртая секцыя, якая адказвае за выдачу пашпартоў і відаў на жыхарства. У лістападзе таго ж года міліцыю надзялілі правам афармлення віз і рэгістрацыі дакументаў грамадзян, што прыязджалі з-за мяжы. У Народным камісарыяце ўнутраных спраў (НКУС) ствараюцца іншаземныя аддзелы, якія займаюцца дазволамі на выезд за мяжу. Другім усебеларускім з'ездам Саветаў 17 снежня 1920 года фарміруецца НКУС БССР, на базе якога ствараецца пададдзел іншаземных падданых. Гэтая дата лічыцца днём стварэння сучасных падраздзяленняў па грамадзянстве і міграцыі, якія сёлета святкуюць свой 100-гадовы юбілей. Пра асаблівасці ўезду і выезду беларусаў за мяжу, змену грамадзянства і цяжкасці перамяшчэння па свеце ў пандэмічны 2020-ы карэспандэнт «Звязды» пагаварыла з прадстаўніком гэтай службы.**

## НА ПМЖ, РАБОТУ, ВУЧОБУ

Беларусаў-эмігрантаў можна падзяліць па двух асноўных крытэрыях. Гэта тыя, хто бескантрольна выязджае на працу, адпачынак ці жыццё ў іншую дзяржаву па турыстычнай візе, праз шлюб з іншаземцам, наведванне сваякоў, што жывуць у замежжы (такіх шмат, напрыклад, у Ізраілі). І тыя, хто абірае афіцыйны спосаб адбыць за мяжу на пастаяннае месца жыхарства (ПМЖ) праз атрыманне пашпарта серыі РР.

*— Калі чалавек сабраўся і паехаў у іншую краіну працаваць ці жыць, то пракантраляваць, што ён ужо не жыве ў краіне, вельмі складана. У яго тут застаецца пастаянная рэгістрацыя і беларускае грамадзянства. Часам мы даведваліся, што чалавек ужо 20 гадоў як не жыве ў нашай краіне. Асабліва відавочным стала, што такіх людзей досыць шмат, калі ў краіне ў 2015-м выйшаў Дэкрэт № 3 «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрымантсва». Пасля пачалася дактыласкапія ваеннаабавязаных мужчын і жанчын. Мы выходзілі па ўказаным адрасе, і родныя чалавека казалі, што ён ужо колькі гадоў жыве і працуе ў Расіі, Германіі, Аўстрыі, ЗША ці яшчэ дзе, хоць зарэгістраваны ў Беларусі,* — расказала **Галіна АСАДЧАНКА, намеснік начальніка аддзела грамадзянства і міграцыі (АГіМ) Кастрычніцкага РУУС Мінска.** — *Іншая справа — тыя, хто атрымлівае пашпарт серыі РР для ПМЖ за мяжой. Такіх, зразумела, мы можам улічыць.*

Сёлета ў Кастрычніцкім раёне сталіцы такі пашпарт аформіў 51 чалавек, а летась — 134. Так што мэтанакіравана з краіны выехала значна менш людзей. І гэта беларусы, якія ўжо дакладна ведаюць, што яны збіраюцца атрымаць грамадзянства дзяржавы, дзе намерваюцца жыць або хочуць праходзіць там тэрміновую службу ці стаць дзяржслужачым. Яны атрымліваюць пашпарт і лісток убыцця і здымаюцца з рэгістрацыйнага ўліку ў Беларусі, пры гэтым звычайны беларускі пашпарт у іх таксама застаецца. Беларусы, якія вырашаюцца на ПМЖ, робяць гэта не знянацку. Амаль заўжды гэты абдуманы крок робяць тыя, хто ўжо шмат гадоў працуе за мяжой і вырашыў афіцыйна аформіць там свой статус.

Перашкодай для атрымання пашпарта серыі РР можа быць запазычанасць або нязгода другога з бацькоў, калі ў таго, хто хоча выехаць з краіны, ёсць непаўналетнія дзеці. Каштуе такі дакумент дзесяць базавых велічынь (280 рублёў).

*— Цяжкасцю для многіх беларусаў, якія працуюць далёка за мяжой, можа быць і тое, што падаць дакументы на атрыманне пашпарта і пасля забраць яго можа толькі сам уладальнік. Ніякія даверанасці тут не працуюць. Такім чынам, для яго атрымання трэба шмат часу (прыехаць, сабраць дакументы, дачакацца, пакуль будзе гатовы пашпарт, вярнуцца назад),* — падкрэсліла спецыяліст. — *Існуе, праўда, магчымасць зрабіць гэта ў пасольстве нашай краіны на тэрыторыі іншых дзяржаў. Але гэта даўжэй і даражэй. Зроблены пашпарт серыі РР можна забраць на працягу года, пасля яго знішчаюць. Без праблем яго можна і вярнуць, калі раптам патрэба выехаць на ПМЖ адпала, або аформіць часовае знаходжанне на тэрыторыі краіны.*

## «ПАСТАЯНШЧЫКІ-ЗАМЕЖНІКІ»

Пераважная большасць (90 %) нашых суайчыннікаў з'язджаюць на працу ў Расію, дзе, дарэчы, допускаецца двайное грамадзянства. Наша ж краіна, хоць і прызнае яго, але не дапускае — у Беларусі ты можаш быць толькі грамадзянінам РБ, нават калі маеш яшчэ і грамадзянства іншай краіны. За мяжу, як сведчыць статыстыка, выязджаюць, як правіла, нашы суайчыннікі з вышэйшай адукацыяй і ўладкоўваюцца на працу ў сферы абслугоўвання.

Беларусы з замежнымі пашпартамі, якім у Беларусі трэба вырашыць нейкія пытанні — пераафарміць права ўласнасці ці памяняць правы на кіраванне аўто — могуць афарміць рэгістрацыю на паўгода ці тры месяцы. На гэты час дзейнічаюць ранейшыя правы грамадзяніна краіны: можна абслугоўвацца ў паліклініцы, карыстацца ўласнасцю, вадзіць аўто і іншае.

Многія з тых, хто лічыцца ў Беларусі іншаземцамі, насамрэч беларусы, якія з'ехалі на працу ў тую ж Расію, атрымалі тамашняе грамадзянства, а пасля вярнуліся на радзіму, аднак пашпарт мяняць не сталі. Цяпер жывуць тут, маюць пастаянную рэгістрацыю, атрымліваюць замежную пенсію. У Кастрычніцкім раёне сталіцы такіх «пастаяншчыкаў-замежнікаў» 2000 чалавек.

## ЗАЛОЖНІКІ КАРАНАВІРУСА?

2020 год стаў вельмі неспрыяльным для падарожжаў і пераездаў па свеце, таму лічбы тых, хто хоча з'ехаць з Беларусі, значна паменшыліся. Летась са сталіцы выехала на ПМЖ за мяжу 1738 чалавек, сёлета — 820.

Многія, наадварот, не могуць прыехаць у Беларусь, бо закрытыя межы на выезд з краін, дзе яны працуюць. А з 20 снежня закрываюцца межы на наземны выезд аўтобусам, аўто, чыгункай і рачным транспартам і з Беларусі, у тым ліку для саміх беларусаў і іншаземцаў, якія пражываюць у краіне часова ці пастаянна. Выключэнне застаецца адно для дыпламатаў, членаў афіцыйных дэлегацый, дальнабойшчыкаў, экіпажаў цягнікоў, самалётаў і караблёў, камандзіровачных асоб. Усе астатнія змогуць выехаць з краіны толькі раз за паўгода на пахаванне сваякоў ці да тых з іх, хто цяжка захварэў. Выпусцяць і таго, хто едзе на вучобу, працу ці каму патрэбна медпамога. Усе прычыны трэба будзе пацвярджаць адпаведнымі дакументамі.

Забараніць уезд у краіну беларусам з-за сітуацыі з каранавірусам, згодна з законам, немагчыма. Усе, хто выехаў за мяжу, цяпер і раней, калі адкрыты межы дзяржавы, дзе яны знаходзяцца, могуць вярнуцца назад. Выключэнні датычацца толькі асоб, якім забаронены ўезд у краіну і выезд з яе. Праўда, ёсць яшчэ адзін нюанс.

*— Усе грамадзяне Беларусі маюць канстытуцыйнае права вярнуцца ў краіну сваёй грамадзянскай прыналежнасці,* — сцвярджае Галіна Асадчанка. — *Аднак існуе такая працэдура, як праверка прыналежнасці асобы да грамадзянства Беларусі. Яна можа праводзіцца па заяве грамадзяніна або па рапарце і цягнуцца да паўгода. Згодна з законам, асобы, якія да 2002 года з'ехалі з Беларусі і атрымалі пашпарт іншай дзяржавы, згодна з айчынным заканадаўствам, аўтаматычна страчваюць беларускае грамадзянства. Тыя ж, хто выехаў з Беларусі пасля жніўня 2002-га і атрымаў грамадзянства іншай краіны, беларускае грамадзянства не страчваюць. Вярнуўшыся сюды, яны будуць прызнавацца грамадзянамі Беларусі.*

Тыя, каго па нейкіх прычынах дэпартавалі з краіны, могуць напісаць хадайніцтва ў дэпартамент па грамадзянстве і міграцыі на змяншэнне тэрміну забароны ўезду або хадайнічаць аб разавым уездзе, аднак ён павінен матывавацца важкімі прычынамі, накшталт тых, па якіх з 20 снежня будзе адбывацца і выезд з Беларусі для звычайных грамадзян.

У плане непрымання на радзіме сваіх грамадзян сёлета вызначыўся Туркменістан. Яго грамадзяне-студэнты, якія вучыліся ў нас, апынуліся ў цяжкай сітуацыі: іх родная краіна даўно закрыла межы на ўезд, і цяпер нават тыя, каго адлічылі, вымушаны знаходзіцца ў Беларусі і рабіць дазвол на часовую рэгістрацыю. Пасля адлічэння ВНУ паведамляюць пра гэта, і студэнты страчваюць права знаходжання ў краіне, дзе вучыліся. Шмат у нас і кітайскіх студэнтаў, якія маюць цяжкасці з вяртаннем на радзіму, бо білеты «ўзляцелі» ў цане, таму многія таксама часова застаюцца ў Беларусі. Пры гэтым, каб мець сродкі на жыццё, працаваць яны не могуць (толькі калі працадаўца возьме на сябе цяжар афармлення спецыяльнага дазволу на працу). Інтэрната пазбаўляюцца, даводзіцца здымаць жыллё, а быў момант, што не маглі атрымаць грашовыя валютныя пераводы ад родных. Аднак яны неяк выкручваюцца і рэгулярна прыходзяць працягваць дазвол, кажуць у Кастрычніцкім АГіМ. Дарэчы, тыя замежныя грамадзяне, хто скончыў беларускую ВНУ, на працягу года могуць прэтэндаваць на працу нароўні з беларусамі, а наймальніку не трэба рабіць для іх спецыяльны дазвол на гэта.

## БЕЛАРУСЬ ЗАЦІКАЎЛЕНА Ў МІГРАНТАХ

Каб зацікавіць людзей прыязджаць у рэспубліку, летам 2020-га для замежных студэнтаў, якія скончылі ВНУ ў Беларусі і хочуць застацца тут жыць і працаваць, спрасцілі ўмовы для атрымання права на пастаяннае пражыванне. Цяпер яго можна набыць не праз сем гадоў знаходжання ў краіне, а праз пяць. Фактычна адразу пасля завяршэння вучобы замежнікі-студэнты могуць застацца ў Беларусі працаваць, а з часам, пры жаданні, і прэтэндаваць на беларускае грамадзянства.

*— Для гэтага мігрантам трэба жыць у Беларусі сем гадоў (гэты тэрмін таксама думаюць зменшыць да пяці), мець працу, пражытковы мінімум на кожнага члена сям'і (калі яна тут ёсць), не прыцягвацца да адказнасці, не мець запазычанасцяў. Аднак адсутнасць у Беларусі двайнога грамадзянства многіх спыняе ад жадання адмовіцца ад свайго ранейшага статусу і стаць беларусам,* — удакладніла Галіна Асадчанка. — *Што датычыцца мігрантаў, якія працуюць у нас, то яны застаюцца на такіх жа ўмовах, як і студэнты, калі губляюць працу. Каб прыцягнуць працоўных у Беларусь, у раёнах ім прапаноўваліся пэўныя прывілеі. Так, многія бежанцы з Украіны атрымлівалі ў карыстанне хаты ў вёсцы, пад'ёмныя грошы і паскораны від на жыхарства (за месяц, а не тры). Прычым прыязджалі не толькі рабочыя, але і ўрачы ды настаўнікі.*

Толькі ў сталіцы сёлета атрымалі дазвол на часовае пражыванне 24 600 іншаземных грамадзян, 95 % з якіх студэнты. Летась такіх было 25 986. Значыць, як мінімум студэнты-замежнікі працягваюць прыязджаць, нягледзячы на пандэмію, упэўнены спецыялісты. У Кастрычніцкім АГіМ часовае пражыванне выдалі 2508 людзям, 300—400 з якіх працаўнікі. У асноўным гэта людзі рабочых спецыяльнасцяў без вышэйшай адукацыі, але ёсць і шмат праграмістаў з Кітая, якія працуюць у Вялікім камені.

**Ірына СІДАРОК.**

Крымінал. Здарэнні

## Тройчы вярталася на месца крадзяжу,

### каб пераканацца, што ўсё забрала

**Супрацоўнікамі аддзела крымінальнага вышуку Савецкага РУУС сталіцы затрымана мінчанка, якая ўкрала грошы з пакінутай сумкі. Падрабязнасці крымінальнай гісторыі паведамляе ГУУС Мінгарвыканкама.**

Да міліцыянераў звярнуўся жанчына з заявай аб крадзяжы грошай з кашалька. Высветлілася, што заяўніца забыла сумку недалёка ад дома зламысніцы. Супрацоўнікамі крымінальнага вышуку па падазрэнні ў здзяйсненні злачынства была затрымана 60-гадовая мінчанка. Як растлумачыла жанчына, вяртаючыся дадому з крамы, яна звярнула ўвагу на пакінутую без нагляду сумку. Скарыстаўшыся тым, што ўладальніка побач не было, жанчына некалькі разоў правяла яе агляд. У першы раз яна ўзяла з сумкі кашалёк і пайшла дадому, а пасля вярнулася і паклала яго назад ужо без грашовых сродкаў. У трэці раз жанчына вярнулася пераканацца, што ў сумцы нічога каштоўнага не засталося.

Агульная сума шкоды склала больш за 300 рублёў.

## Наркотык у маразільніку

**Супрацоўнікі наркакантролю Фрунзенскага РУУС Мінска затрымалі 42-гадовага гараджаніна, які захоўваў у сваім маразільніку марыхуану.**

З яго слоў, летам гэтага года пры дапамозе сеціва ён набыў насенне канопляў, якія потым пасадзіў у сябе на дачным участку. Вырашчаны канабіс мужчына высушыў і ўжываў у асабістых мэтах.

Як паведамляе ГУУС Мінгарвыканкама, падчас агляду па месцы жыхарства ў маразільніку і на дачным участку супрацоўнікі міліцыі выявілі больш за 120 грамаў марыхуаны і прыстасаванне для курэння.

Вядома, што мінчанін з'яўляецца індывідуальным прадпрымальнікам, раней прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за маёмасныя злачынствы.

Зараз аператыўнікі ўстанаўліваюць датычнасць затрыманага да незаконнага абароту наркотыкаў, а таксама кола магчымых пакупнікоў.

## У п'янай бойцы адкусіла фалангу пальца

**Інцыдэнт паміж дзвюма дзяўчынамі адбыўся ў начны час у Лепелі. Да гэтага незнаёмыя адна з адной 27-гадовая і 28-гадовая прадстаўніцы слабага полу адпачывалі ў дзвюх розных кампаніях у кавярні.**

Як паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Віцебскага аблвыканкама, бліжэй да закрыцця ўстановы, каля 3.30 ночы, яны ў суправаджэнні сяброў сутрэліся ў фае. Адна з гараджанак стала кпіць са знешнасці іншай. У выніку завязалася бойка. Падчас сутычкі адна з дам прымудрылася ўкусіць іншую за палец. Спроба аказалася настолькі паспяховай, што ў выніку дзяўчына адкусіла саперніцы фалангу.

Пасля гэтага на месца здарэння выклікалі «хуткую» і міліцыю. Медыкі павезлі пацярпелую ў бальніцу, а праваахоўнікі затрымалі нападаўшую. Пазней высветлілася, што абедзве дзяўчыны ў момант канфлікту знаходзіліся ў стане алкагольнага ап'янення. Лепельскім РАУС вядзецца праверка.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**Дукорский сельский исполнительный комитет**
**ПРОИЗВОДИТ ПРОДАЖУ ОДНОКВАРТИРНЫХ ЖИЛЫХ ДОМОВ**
***согласно Указа Президента Республики Беларусь от 04.09.2018 г. № 357 «О пустующих и ветхих домах»***

| № п\п | Наименование | Адрес | Рыночная стоимость, бел. рублей |
|---|---|---|---|
| 1 | Объект недвижимости: капитальное строение (жилой дом) на земельном участке | Республика Беларусь Минская область, Пуховичский район, Дукорский с/с, аг. Дричин, ул. Центральная, д. 56 | 13 031,01 белорусского рубля (тринадцать тысяч тридцать один белорусский рубль 01 копейка) |
| 2 | Объект недвижимости: капитальное строение (жилой дом) на земельном участке | Республика Беларусь Минская область, Пуховичский район, Дукорский с/с, д. Белое, д. 17 | 6643,26 белорусского рубля (шесть тысяч шестьсот сорок три белорусских рубля 26 копеек) |

Продажа проводится без проведения аукциона в случае поступления по истечении тридцати календарных дней со дня опубликования информации заявления на приобретение пустующего дома со стороны одного лица. С ним заключается договор купли-продажи жилого дома. Заявления принимаются **по 19 января 2021 года** по адресу: 222840, ул. Речная, 14, аг. Дукора Пуховичского района Минской области.

Телефон для справок: (8-01713) 63935, 99-436.

Эл./почта: dukorselisp@tut.by, dukorselisp@pukhovichi.gov.by

При наличии нескольких претендентов на приобретение пустующего дома, его отчуждение будет осуществляться по результатам аукциона.

УНП 600177864

Открытое акционерное общество
**«Дорожно-строительный трест № 3»**
**сообщает о проведении внеочередного общего собрания акционеров**

**Собрание состоится 21 января 2021 года в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.**

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании – 10.01.2021.

**Повестка дня:**
1. Об избрании членов наблюдательного совета.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет проводиться 21 января 2021 г. с 10.00 до 10.45 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.

Лицам, имеющим право на участие в собрании, можно ознакомиться с документами к собранию, начиная с 10 января 2021 года по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, кабинет 33.

Лицам, имеющим право на участие в собрании, при себе иметь документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров – доверенности, зарегистрированные в соответствии с действующим законодательством).

Справки по телефонам: 8 0222 236487, 236424 – ОЭАиП, Наблюдательный совет.

УНП 700049607

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ**

**Продавец – ОАО «ОРС Гомель».**
**Оператор – «Единая система электронных торгов» torgi.gov.by**

**Предмет электронных торгов и его месторасположение**

**Лот № 1.** Изолированное помещение, инв. № 350/D-166327, расположенное по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 97/4, общая площадь 69,3 кв. м (назначение – помещение здравоохранения).
(Договор аренды на изолированное помещение № 567 от 05.11.2018).
**Информация о земельном участке:** кадастровый номер 340100000001001120, площадью 0,2642 га (доля в праве 73/1000). Договор аренды № 3622 от 31.03.2008 г. по адресу: г. Гомель, ул. Советская, 97/4.
**Начальная стоимость с НДС 20 % – 128 624,57 бел. руб.**
**Сумма задатка в размере 10 % от начальной стоимости – 12 862,5 бел. руб.**

**Электронные торги состоятся 30.12.2020 на электронной торговой площадке оператора torgi.gov.by.**
1. Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «Единая система электронных торгов», размещенным на сайте: torgi.gov.by
2. Лицо, желающее принять участие в электронных торгах, аккредитованное на электронной торговой площадке, подает оператору электронной торговой площадки заявление и документ, подтверждающий внесение суммы задатка.
3. Последний день подачи заявлений – 29.12.2020.
4. Шаг аукциона – 5 % от начальной цены предмета торгов.
5. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан перечислить на расчетный счет Продавца сумму фактических затрат согласно прейскуранту торговой площадки в течение пяти календарных дней со дня проведения торгов.
6. После совершения победителем торгов (претендентом на покупку) названных действий и представления организатору копий платежных документов, но не позднее десяти рабочих дней, с победителем электронных торгов (претендентом на покупку) в установленном порядке в соответствии с условиями торгов с продавцом заключается договор купли-продажи имущества.
7. Подробную информацию о порядке, условиях проведения электронных торгов, предмете торгов можно получить по тел. +37529 6672143.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА
**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Боровое-2003» (продавец) проводит повторный открытый аукцион**
**по продаже свеклоуборочного комбайна Beetliner Compact,**
**2014 года выпуска, инвентарный № 975, заводской № 2440412, производитель: Германия, расположенного по адресу: Минская область, Дзержинский район, аг. Боровое.**

Начальная цена с НДС 20 % – **156 240,00** бел. руб. Задаток 10 % от начальной цены (**15 624,00** бел. руб.). *Цена снижена на 30 %.*

**Задатки перечисляются на р/с BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701ОАО «БПС-Сбербанк», код 369, г. Минск, БИК в формате IBANBPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.** Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 17.09.2020.

Аукцион состоится **11.01.2021** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **08.01.2021** до **15.00** по указанному адресу.

**Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17, 136-31-11.**

УНН 600112662

# ПРАВІЛЫ «ССАБОЙКІ»



## Чым перакусіць на рабоце, каб не нанесці шкоду таліі і кашальку?

**Кажуць, добрыя звычкі таннейшыя за дрэнныя. На хвалі папулярнасці здаровага харчавання падзабытае савецкае слова «ссабойка» вярнулася ў наша жыццё. Але што ўзяць з сабой на работу, каб было сытна-смачна-карысна?**

Патрэбы чалавека ў бялках, тлушчах і вугляводах у розных гадзіны сутак розныя. Вугляводы — гэта крыніца энергіі: яны даюць сілы. Большую частку вугляводаў за дзень варта з'ядаць падчас сняданку і абеду. Кашы, крупы, макарона, мучное — гэтыя прадукты павінны прысутнічаць у вашай абедзеннай талерцы. Дакладней, у вашым ланч-боксе, які вы бераце з сабой на работу.

Тлушчы могуць стаць заменай вугляводаў у абедзенным меню. Калі ў вашай ссабойцы шмат вугляводаў, тлушчаў павінна быць менш. А калі вы выбралі на абед пераважна бялковыя прадукты, можаце павялічыць колькасць тлушчаў.

Для пераварвання бялку неабходна шмат энергіі. У ідэале сняданак павінен быць вугляводны, а абед і вячэра — бялковыя. У цэлым, адзначаюць дыетолагі, ад сняданку да вячэры доля бялковых прадуктаў павінна павялічвацца, а вугляводных — скарачацца. Адпаведна, абед — самы дэмакратычны прыём ежы: ён павінен уключаць у сябе ўсе нутрыенты — умераную колькасць вугляводаў, бялкі і тлушчы.

### АД ТЭОРЫІ ДА ПРАКТЫКІ

Спецыялісты правільнага харчавання сцвярджаюць, што хоць бы адна страва падчас абеду павінна быць гарачая. Практычна ў любым офісе або ўстанове ў нашы дні маецца «мікрахвалеўка». А значыць, можна ўзяць з сабой:

✓ дамашнія катлеты, біточкі, адбіўныя (у ідэале — прыгатаваныя на пары);

✓ варанае мяса (варым у выхадныя суп, мяса з супу — выдатны варыянт для ссабойкі);

✓ салату з агародніны (выключаем белакачанную капусту, фасолю, вараную бульбу, каб не пакутаваць ад узздуцця жывата, асабліва калі ў вас сядзячая работа);

✓ павольныя вугляводы (рыс, грэчка, іншыя кашы). Бульбяное пюрэ на гарнір — не велмі ўдалы варыянт, калі вы хочаце захаваць постаць стройнай.

Відавочна, што за доўгі рабочы дзень вам захочацца «салодзенькага», тым больш што салодкае павялічвае прадукцыйнасць працы, бо глюкоза — пастаўшчык энергіі для клетак мозга. Але глюкозу варта атрымліваць не з пірожных і шакаладных цукерак, а з правільных крыніц. Гэта можа быць горкі шакалад (не больш за 50 г за адзін прыём ежы!) А яшчэ лепш — курага, фінікі, інжыр. Дарэчы, выдатна павялічваць эфектыўнасць работы мозга арэхі (не больш за 30 г у дзень).

### У АБАРОНУ БУТЭРБРОДАЎ

Бутэрброды — самы просты і звыклы варыянт ссабойкі. Асабліва калі разагрэць ежу на рабоце ў вас няма магчымасці. Бутэрброды не прынята адносіць да здаровай ежы — і дарэмна. Зразумела, гаворка не ідзе пра бутэрброды з магазіннай каўбасой (сучасная каўбаса, на жаль, часта нясе здароўю больш шкоды, чым карысці). Але кавалачкі хлеба з сырам, вараным мясам і/або агароднінай у разумных колькасцях не шкодныя і не прыводзяць да лішняй вагі. Галоўнае тут — адпаведнасць паступлення калорый узроўню вашай актыўнасці на працягу рабочага дня.

Некалькі слоў пра «сухамятку». Праблемы са страваваннем могуць паўстаць, толькі калі вы дрэнна пражоўваеце вельмі сухую ежу. А бутэрброды лепш запіваць. Напрыклад, гарбатай.

Хлеб добра спалучаецца з крыніцамі бялку — мясам, птушкай, арэхамі, рыбай (морапрадуктамі). Зяленіва і агародніна ў правільным бутэрбродзе — крыніца вітамінаў, мінералаў і клятчаткі. Замест масла ў такім дамашнім «бургеры» можна выкарыстоўваць мяккі сыр, а замест маянэзу — ёгурт.

У правільных бутэрбродах могуць (і павінны) прысутнічаць:

✓ цэльназерневы хлеб з вотруб'ем або дыетычныя хлябцы;

✓ агародніна (памідоры, агуркі, ліставая салата);

✓ варанае мяса або слабасалёная рыба (сёмга, фарэль, селядзец);

✓ сметанковае масла дапушчальнае, але лепш замяніць яго, напрыклад, «зялёнай пастай» (злёгку прыпушчаныя ў кіпені шпінат, брокалі, цвятную капусту, моркву ці іншую агародніну пракручваем праз мясарубку);

✓ хатнія паштэты з мяса ці печані.

✓ Калі хочацца салодкага, можна ўзяць на работу бутэрброд з мёдам.

### САЛАТА Ў СЛОІКУ

Модны трэнд і геніяльнае вынаходніцтва, салата ў слоіку — ідэальны перакус з пункту гледжання правільнага харчавання. Сутнасць простая: інгрэдыенты ўкладваюцца пластамі ў слоік і такім чынам доўга захоўваюць свежасць. Перад ужываннем слоік дастаткова проста страсянуць, і ваша салата гатовая. Галоўнае — правільна размясціць пласты.

Першы пласт. На самае дно змяшчаем соус — напрыклад, аліўкавы алей з гарчыцай і лімонным сокам або соус з ёгурту з зяленівам і часнаком (масачны рэжым мае плюсы: можна есці на абед стравы з часнаком і цыбуляй).

Другі пласт — цвёрдая храбусткая гародніна. Другі пласт важна выкладваць вельмі асцярожна, бо соус не павінен раней за патрэбны час перамяшацца з астатнімі пластамі — у адваротным выпадку салата будзе не такая смачная. Для другога пласта падыходзяць салодкі перац, сельдэрэй, морква, фенхель, брокалі, цыбуля, свежыя цукіні, цвятная капуста. Гэта агародніна не ўбярэ соус, асабліва калі парэзаць яе досыць буйнымі кавалкамі.

Трэці пласт — бялковы. Гэта могуць быць мяса, рыба, яйкі, сыр. Можа быць і раслінны бялок (фасоля, зялёны гарошак) — па жаданні.

Чацвёрты пласт — павольныя вугляводы (напрыклад, рыс, кус-кус, булгур, вермішэль). Салаце яны дададуць тэкстуру, а нам — энергію.

Пяты пласт — мяккая агародніна, грыбы або садавіна. Яны знаходзяцца далёка ад падліўкі, а таму не змяшаюцца з соусам да патрэбнага моманту. Памідоры, аліўкі, мандарыны, кукуруза, шампіньёны, кавалачкі яблыка або грушы, вінаград, журавіны, парэчка нададуць салаце незвычайныя нюансы смака, а нам падораць зарад вітамінаў.

Шосты пласт — зяляніна: пятрушка, кроп, кінза, базілік, лісце салаты.

Сёмы пласт — сланечнікавыя і гарбузовыя семачкі, кунжут, грэцкія арэхі або кеш'ю. Гэты пласт даставіць у арганізм поліненасычаныя тлустыя кіслоты, якія падтрымліваюць работу сардэчнай мышцы і не дазваляюць скуры старэць.

Колькі слаёў будзе ў вашым слоіку — вырашайце самі. Галоўнае — не дапусціць, каб інгрэдыенты ўвабралі соус да таго, як вы вырашыце падсілкавацца салатай.

### ЯК ДОМА

І напрыканцы — некалькі лёгкіх рэцэптаў, якія дапамогуць вам забяспечыць сабе і блізкім здаровы дамашні абед «без адрыву ад вытворчасці».

**«Цэзар» у слоіку**

Нам спатрэбіцца слоік: звычайны 700-грамовы. Можна выкарыстоўваць прыгожыя слоічкі для сыпучых прадуктаў — яны прадаюцца паўсюдна. Толькі пераканайцеся ў іх герметычнасці, калі яны зачыненыя.

На дно слоіка ўліваем каля 200 мл соуса «Цэзар» (яго лепш прыгатаваць увечары напярэдадні: прапушчаны праз прэс часнок, тры жаўткі, трохі солі і перцу, 1 ч. л. нявострай гарчыцы злучаем, узбіваем блэндарам, уліўшы ў працэсе ўзбівання 50 мл аліўкавага алею. Ставім у халадзільнік на 20 хвілін).

✓ Другі пласт — досыць буйна парэзаная ліставая салата.

✓ Трэці пласт — курынае філе, змяшанае з кавалачкамі бекону (каля 300 г сумесі).

✓ Чацвёрты пласт — сухарыкі са збожжавага хлеба (каля 250 г). Калі сухарыкаў няма, можна замяніць іх кароткімі відамі пасты (вермішэлі) з цвёрдых сартоў мукі, адваранымі al dente.

✓ Пяты пласт — дзёрты сыр (каля 80 г).

Устрэсваем слоік перад ежай, змешваючы соус і інгрэдыенты, — і атрымліваем асалоду!

**Рол «Рыбны дзень»**

1. Рыбнае філе (150—200 г) нарэзаем палоскамі прыкладна 9 х 3 см. Сок паловы лімона змешваем з 1,5 ч. л. расліннага алею. Абмокваем у гэтую сумесь кожную лустачку рыбы і адпраўляем у халадзільнік на паўгадзіны — марынавацца.

2. Яйка ўзбіваем з соллю, у іншую талерку насыпаем паніровачныя сухары. Філе дастаём з халадзільніка і абмокваем па чарзе ў яйка і сухары. Абсмажваем на гарачай патэльні па 2-3 хвіліны з кожнага боку.

3. Рэжам агародніну (салодкі перац, салатнае лісце, агуркі, памідоры — усё, што ёсць у доме). Пасыпаем сумессю агародніны і траў (кроп, пятрушка) ліст лаваша, выкладваем рыбныя палачкі і згортваем шчыльны рол. Абгортваем яго ў харчовую плёнку і адпраўляем у халадзільнік да раніцы.

4. Калі хочаце дадаць у рол соус, злучыце здробнены зубчык часнаку з 50 мл несалодкага ёгурту, 2 ч. л. лімоннага соку і спецыі на смак.

**Чыпсы «Сядзячая работа»**

А вы каштавалі чыпсы з морквы і буракоў? Смачна, незвычайна і, галоўнае, — карысна! І для здароўя, і для фігуры — ідэальна, каб жаваць за камп'ютарам. Агародніну (буракі ці моркву) рэжам тоненькімі долькамі (долькі павінны быць ве-е-ельмі тоненькімі, у гэтым сакрэт поспеху!) Змешваем соль, перац і аліўкавы алей, кладзём у гэтую сумесь нашы чыпсы і пакідаем: маркоўныя — на 10 хвілін, бурачныя — на 30. Выкладваем на працівень і адпраўляем у разагрэтую да 250 градусаў духоўку. Маркоўныя чыпсы выпякаем 10—15 хвілін, бурачныя — паўгадзіны. Есці такія чыпсы можна і гарачымі, і халоднымі. Соус з ёгурту з часнаком з папярэдняга рэцэпту стане выдатным дапаўненнем да іх.

**Дзіяна РОНІНА.**

# ВАНДРОЎКА Ў КРАІНУ СНЕГАВІКОЎ

**Маладзёжны тэатр эстрады ў перыяд навагодніх свят парадуе дзіцячую аўдыторыю асаблівай праграмай. У ёй можна выбраць і навагодні мюзікл «Чароўнае люстэрка», і шоў-праграму «Таямніцы Раства» альбо квэст-казку «Прыгоды ў Снегавічнай краіне».**

Спектакль-квэст — навінка нашага часу. Глядач робіцца ўдзельнікам чароўнага дзейства. Дзеці і дарослыя апынуцца ў Снегавічнай краіне, дзе ў кампаніі яе жыхароў, снегавікоў Марозкі, Зябушкі і Холадзіка, перажывуць разнастайныя прыгоды. Казачныя героі падзеляцца з гасцямі сакрэтамі, напрыклад, чаму ў тых мясцінах снегавікі ніколі не растаюць. Хлопчыкам і дзяўчынкам у вандроўцы дапамогуць сваімі падказкамі Дзед Мароз і Снягурка. З іх дапамогай разгадаем загадку «Халоднага сэрца» і нават даведаемся, ці ва ўсіх чараўнікоў яно на самай справе халоднае? Не абыдзецца і без складаных лабірынтаў, кемлівых гульняў і цікавых танцаў.

— Фармат «квэсту» мы выбралі не ўпершыню, апрабавалі яго ўжо летась. І прычынай таго з'яўляецца незвычайная для тэатральных пастановак пляцоўка выставачнага комплексу. Таму мы прыдумалі варыянт, які дазваляе ўсім бачыць, што адбываецца, і быць часткай падзей. Дзеці на працягу ўсёй пастаноўкі ўзаемадзейнічаюць з героямі. А бацькі альбо адпачываюць у якасці гледачоў, альбо таксама падключаюцца да працэсу. Калі ў мінулым годзе мы ладзілі квэст-шоу, яно было больш гульнявое, а цяпер у нас атрымалася квэст-казка, у аснове якой прыгожая чароўная гісторыя, — распавядае **рэжысёр-пастаноўшчык Іван КЛЕШЧАНКА.** — Не абышлося без легенд і міфаў. Паводле сюжэту казкі, аўтарам якой з'яўляецца Уладзіслава Арцюкоўская, у Белавежскай пушчы Дзед Мароз кожны год з першага снегу лепіць снежную дзяўчынку. А ў чароўную ноч з неба апускаецца зорачка-душа — і так на зямлі штогод з'яўляецца Снягурка. Але сёлета Адліга вырашыла перашкодзіць і зрабіць усё, каб свята адмянілася. І вось вясёлыя снегавікі і іншыя марозныя персанажы будуць адстойваць свае правы на свята, ратуючы Снягурку... Пастаноўка з'явілася дзякуючы вялікай прафесійнай камандзе нашых артыстаў. Калі кожны любіць сваю справу, то можна быць упэўненым у выніку. Так, напрыклад, нават я, чалавек, які імкнецца перш за ўсё добра рабіць сваю справу, калі прыходжу ў павільён, дзе ўжо змантраваныя дэкарацыі, на нейкі момант вяртаюся ў дзяцінства — настолькі чароўная атрымліваецца атмасфера.

Перад пачаткам праграмы ў кожнага наведвальніка будзе магчымасць наведаць сэлфі-музей з прыгожымі фотазонамі і раставымі персанажамі. А казачныя героі дапамогуць не толькі стварыць адпаведны настрой, але і падрыхтуюць маленькіх наведвальнікаў да ўдзелу ў квэсце-казцы.

Больш падрабязна пра даты і час прадстаўленняў можна даведацца на сайце Маладзёжнага тэатра эстрады estrada.by.

**Алена ДРАПКО.**

Дзеля памяці

# ЯКОЙ МЫ ЗАПОМНІМ БЭЛУ МАСУМЯН?

**Згасаюць адна за адной зоркі на небасхіле мастацтва... Нядаўна засмуціла сэрцы аматараў беларускага тэатра звестка: на 84 годзе жыцця памерла народная артыстка Беларусі Бэла Масумян. Яе нездарма ўключалі ў топ самых пазнавальных артыстаў Беларусі. Будучая актрыса нарадзілася ва ўкраінскім Паўлаградзе. Бацькі жадалі бачыць яе ўрачом, але яна імкнулася на падмосткі. Скончыўшы ў 1961 годзе Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут, тут жа пайшла працаваць у Драматычны тэатр імя Горкага. Атрымалася, што Бэла Масумян да канца дзён была адданая гэтаму тэатру. «Звязда» ўспамінае яскравыя і любімыя ролі Бэлы Масумян.**



## «Леў зімой» *(рэж. Валянціна Еранькова)*

Для многіх вобраз прымадонны звязаны найперш з вобразам шэкспіраўскай каралевы. Дзея п'есы развіваецца ў Англіі XII стагоддзя. Кароль Генрых II павінен прызначыць спадчынніка трона. На гэтую падзею прыбываюць жонка Генрыха — каралева Элінор, якая правяла дзесяць гадоў у зняволенні за ўдзел у змове, маладая палюбоўніца караля — французская прынцэса Эліс, кароль Францыі Філіп II Аўгуст ды трое сыноў Генрыха II — Рычард Ільвінае Сэрца, Джэфры і Джон.

Ролю каралевы Элінор Аквітанскай сыграла Бэла Масумян. Актрысу вельмі цікавіў вобраз гераіні: моцнай жанчыны, якая вядзе барацьбу за каханне.

## «Праўда — добра, а шчасце лепш» *(рэж. Аркадзь Кац)*

Бэла Амаўна прызнавалася, што Расціслаў Янкоўскі, заўсёдны партнёр па сцэне, угаворваў яе адмовіцца ад ролі купчыхі. Зразумела, што пры поглядзе на Масумян адразу ўзнікалі асацыяцыі — каралева, арыстакратка... Але актрыса ніколі не адмаўлялася ад магчымасці паспрабаваць сябе ў нечым новым, і Янкоўскі пасля прызнаў, што не меў рацыю ў сваіх сумненнях.

Нагадаем змест вядомай п'есы Астроўскага: багатая і ўладная купчыха Маўра Тарасаўна Барабошава хоча выдаць сваю ўнучку Паліксену замуж за генерала. Але дзяўчына закаханая ў беднага прыказчыка Платона, рэзанёра і праўдалюба. Невядома, чым бы ўсё гэта скончылася, калі б старая нянька Філіцата не прывяла б у дом адстаўнога унтэра Сілу Ерафеіча Грознова, у якім Барабошава пазнала каханне сваёй маладосці.

Бэла Масумян бліскуча выканала ролю Маўры Тарасаўны. Як гаварыла сама актрыса, ёй было цікава паказаць гледачу не толькі мяшчанку і купчыху, але і жанчыну, якая хацела падавацца ці то асаблівай, неадназначнай, адкрытай, ці то замкнёнай ад усяго свету.

## «Пане Каханку» *(рэж. Сяргей Кавальчык)*

Дзеянне спектакля адбываецца ў XVIII стагоддзі, пасля Першага падзелу Рэчы Паспалітай. Галоўны герой Караль Станіслаў Радзівіл атрымаў сваю мянушку «Пане Каханку», бо да ўсіх менавіта так па-добраму і звяртаўся — «пане каханку» — «мой даражэнькі».

Бэла Масумян сыграла Тэафілію, сястру князя. Актрыса распавядала, што гэтая пастаноўка ствралася на падмостках супольна — уклад у спектакль зрабілі ўсе, і драматург, і пастаноўшчыкі з акцёрамі. Бэла Амаўна, напрыклад, прыдумала для вобраза сваёй гераіні жалезную руку — мужная, уладная Тэафілія з'яўляецца на сцэне ў пазалочаных пальчатках, нібы часткі рыцарскіх латаў.

## «Загадкавы візіт» *(рэж. Барыс Луцэнка)*

Яшчэ да пачатку плённай работы над пастаноўкай Бэла Масумян прызнавалася, што ёй вельмі хочацца сыграць галоўную ролю ў «Загадкавым візіце». Знакамітая п'еса Дзюрэнмата — багаты матэрыял для псіхалагічных эксперыментаў, экзістэнцыяльных пошукаў. Нагадаем сюжэт: у правінцыйнае мястэчка прыязджае вельмі багатая жанчына Клара Цаханасьян. Шмат гадоў таму набожныя жыхары асудзілі яе за лёгкія паводзіны і выгналі. Цяпер яна вяртаецца і дорыць землякам мільярд, патрабуючы ўзамен жыццё аднаго з іх — Альфрэда Іла. Гэта ён калісьці спакусіў і кінуў яе. Добрыя гараджане абураныя. Але нікому з іх ніколі і не сніліся такія грошы.

Што такое справядлівасць? Бэла Масумян разам з гледачамі шукала адказ у гэтай ролі.

## «Валянцінаў дзень» *(рэж. Валянціна Еранькова)*

Сама Бэла Масумян распавядала аб ролі Валянціны няшмат, але яна была ёй дарагая, нездарма менавіта гэты спектакль быў выбраны для бенефісу актрысы ў 2007 годзе. У гэтай ролі Масумян упершыню сустрэлася на падмостках з яшчэ адной беларускай прымадоннай — Наталляй Гайдай, абедзве зоркі ўтварылі бліскучы дуэт.



П'есу, якая лягла ў аснову, напісаў драматург Іван Вырыпаеў. Ён рэгулярна бярэ ўдзел у фестывалі маладой драматургіі «Любімаўка». І ўвогуле лічыцца аўтарам, які вельмі ўмела працуе з постмадэрнізмам. У спектаклі «Валянцінаў дзень» глядач трапляе ў дзіўную кватэру, у якой, ненавідзячы і любячы адна адну, жывуць дзве састарэлыя жанчыны: Валянціна і Каця. Аб'ядноўвае іх памерлы Валянцін, якога яны абедзве кахалі. Абстаноўка вельмі нагадвае поле бітвы. Ды і жыццё гераіняў больш падобна да бесперапыннай бітвы на барыкадах.

Бэлу Масумян не палохалі ні эксперыменты, ні звыклая класіка: яна ахвотна працавала ва ўсіх кірунках. Менавіта таму ў яе жыцці было так шмат разнастайных і запамінальных роляў.

# КАЛІ Б РАМЭА І ДЖУЛЬЕТА ПАСТАЛЕЛІ...

## У тэатры музкамедыі адбылася прэм'ера мюзікла

**У Беларускім дзяржаўным акадэмічным музычным тэатры адбылася прэм'ера новага мюзікла. «Рамэа vs. Джульета. XX гадоў пасля» — дзея ў дзвюх частках пад музыку Аркадзя Укупніка. Перад прэм'ерай каманда, якая працавала над пастаноўкай, падзялілася ўражаннямі.**

— Работа прайшла вельмі прадуктыўна, нягледзячы на даволі складаныя абставіны, — адзначыў **мастацкі кіраўнік тэатра Адам МУРЗІЧ.** — З чатырохсот работнікаў тэатра захварэла дзесяць працэнтаў. Але нам вельмі падабаецца і музыка, і драматургія спектакля. Асобна хацеў бы адзначыць работу мастака-пастаноўшчыка Андрэя Меранькова і мастачкі па касцюмах Валянціны Праўдзінай: калі я ўбачыў пастаноўку ў маскоўскай аперэце, я засумняваўся, што ў нас гэта можа атрымацца. Але ў выніку тое, што стварылі Андрэй і Валянціна, абвергла ўсе мае сумневы.

**Дырыжор-пастаноўшчык Юрый ГАЛЯС** дадае:

— Хацеў бы звярнуць увагу на музыку кампазітара Аркадзя Сямёнавіча Укупніка. Ён вельмі вядомы спявак, і я, не знаёмы з музыкай да гэтага спектакля, чакаў трошкі іншага. Але, як выявілася, музычны матэрыял і аранжыроўка вельмі дастойныя. Я лічу, што гэта адзін з моцных бакоў пастаноўкі.

Сюжэт п'есы «Рамэа vs. Джульета. XX гадоў пасля» заснаваны на здагадцы, як склалася б жыццё герояў вялікай шэкспіраўскай п'есы, калі б яны не памерлі.

Закаханыя бягуць у Геную, дзе Рамэа, пазбаўлены сродкаў да існавання, становіцца ўдачлівым кантрабандыстам, а яго жонка выхоўвае дачку Віялету, жывучы пры гэтым свецкім жыццём. Але немагчыма схавацца ад свайго мінулага. І вось праз дваццаць гадоў падчас гарадскога свята ў Генуі з'яўляецца загадкавы чалавек у чорным...

— Я запрашаю ўсіх на цікавы, яскравы і актуальны мюзікл Аркадзя Укупніка, лібрэта да якога напісаў Карэн Кавалеран, — кажа **рэжысёр-пастаноўшчык Ілья УСЦЯНЦАЎ.** — Той, хто апынецца ў зале, сыдзе, спадзяюся, з эмацыянальным захапленнем. Усё, што будзе прадстаўлена на сцэне, — дзеля вас і, самае галоўнае, у імя кахання, якое і з'яўляецца дамінантай гэтага спектакля.

Кветкі на «Рамэа vs. Джульета. XX гадоў пасля» ўжо ёсць у продажы.

**Матэрыялы падрыхтавала Арына КАРПОВІЧ.**

# «Цэнзура не ўсё, відаць, ведала, і мы з Таццянай Вячаславаўнай гэтым карысталіся»

## У лёсе Сяргея Палуяна застаецца шмат таямніц



**Гэтаму чалавеку прысвечаны зборнік «Вянок» Максіма Багдановіча і паэма «Курган» Янкі Купалы... «Хоць свет і людны, і шырокі, ты быў як месяц адзінокі...» — пісаў пра яго Багдановіч.**
**«Больш за ўсё на свеце ён любіў сваю Бацькаўшчыну, свой край, мову і народ, і ўсе свае сілы клаў у ахвяру роднай Беларусі», — азваўся на яго смерць Вацлаў Ластоўскі.**
**Менавіта Сяргей Палуян дастаў, па легендзе, вершы Багдановіча са сметніцы «Нашай Нівы» і настаяў, каб іх апублікавалі. І менавіта ён — аўтар першага агляднага артыкула беларускай літаратуры.**
**«...Жыццё не вартае таго, каб жыць.**
**У марах жыццё — казка, а спраўдзі — гніццё раба і вечная незабяспечанасць. Але не думайце, што я дзеля незабяспечанасці ўміраю.**
**Не. Жыць так, як жыву я, няма ніякай радасці...**
**Я так люблю жыццё, светласць і красу, ды не на маю долю выпала гэта.**
**Прашчайце... Перадайце шчыры прывет беларусам.**
**Багата я думаў зрабіць, ды не зрабіў нічога.**
**Шкода памяраць так марна, але трэба. Няхай...**
**І яшчэ адна драбніца: я ўміраю «пошло», павесіўшыся. Бо не было змогі купіць рэвальвера...»**
**Гэта з развітальнай запіскі...**
**Сяргей Палуян, крытык, публіцыст, пісьменнік, сышоў з жыцця ў дзевятнаццаць гадоў у Кіеве, у нястачы, на самым пачатку славы.**
**Заканчваецца год, у які мы адзначалі яго 130-годдзе. Чым прыцягальная гэтая постаць, у чым яе таямніца? Мы размаўляем з даследчыкамі жыцця і творчасці Сяргея Палуяна, слыннымі навукоўцамі і выбітнай сямейнай парай, доктарам філалагічных навук, прафесарам БДУ Вячаславам РАГОЙШАМ і кандыдатам філалагічных навук, дацэнтам БДУ Таццянай КАБРЖЫЦКАЙ.**

***— Сяргей Палуян пражыў зусім мала і колькі там стварыў — жменечку? Лічаныя мастацкія творы, трохі больш крытыкі... І, тым не менш, калі ён памёр, то раптам на яго смерць адгукнулася столькі народу, усе знакавыя персоны і беларускага культурніцкага руху, і ўкраінскага... Чаму так?***

**В. Р.:** На гэтае пытанне адказ даўно ёсць, і адказаў на яго Бялінскі. Ён пісаў, што да пісьменнікаў, якія знаходзяцца на пачатку літаратурнага працэсу, трэба ставіцца пасабліваму, таму што, вялікія альбо малыя, яны ў абодвух выпадках асобы гістарычныя. Канешне, як вы сказалі, напісаў Палуян «жменьку»... Але ў гэтай жменьцы не пясок, а крупінкі золата. Ён прыйшоў у літаратуру, калі толькі што скончылася рэвалюцыя 1905 года, толькі што дазволілі беларускі друк, пачала выдавацца «Наша «Ніва», ва Украіне былі падобныя працэсы. Сяргей быў юнак высокаталенавіты. Не скончыўшы, па сутнасці, ні ўніверсітэтаў, ні гімназій, самаадукацыяй набыў глыбокія веды, а крытычнае мысленне ў яго, відаць, было ад нараджэння.

**Т. К.:** Ды нават калі б ён як крытык пра беларускую літаратуру нічога не напісаў, то, думаю, ён застаўся б у гісторыі ўкраінскай літаратуры. Тое, што ён напісаў пра ўкраінскіх пісьменнікаў, не страціла актуальнасці і сёння.

***— Сяргей быў трэцім дзіцем у шматдзетнай сям'і, па ўспамінах, дружнай. Адкуль такі максімалізм, яршыстасць? Ён адзіны з сям'і ўдаўся такі?***

**В. Р.:** Думаю, як вы кажаце, «удаўся». Хоць і іншыя дзеці «ўдаліся» актыўныя: сястра Зінаіда ўдзельнічала ў грамадзянскай вайне на баку чырвонаармейцаў. Малодшыя браты — таксама, толькі на баку белых, і пасля мусілі выехаць і недзе ў Аргенціне закончылі сваё жыццё. Бацька, Епіфан Іванавіч, селянін, стараўся выбіцца ў людзі і дзяцей вывесці — і Сяргея, і сясцёр адправіў вучыцца ў гімназію. Юнак з гарачым сэрцам, сумленны. Ідэі рэвалюцыі, адраджэння Беларусі захапілі яго.

**Т. К.:** Згадаю, што стрыечны брат Сяргея, Іван Бахонка з Кіева, аднадумца, які таксама ўдзельнічаў у рэвалюцыйным руху, налажыў на сябе рукі праз два гады пасля смерці Палуяна. Сям'я Івана абвінавачвала Сяргея ў «дрэнным уплыве».

***— Складваецца ўражанне, што можна правесці паралелі між адносінамі з бацькам у Сяргея Палуяна і ў Максіма Багдановіча. Бацькі сыноў не разумелі, не падтрымлівалі. Адама Ягоравіча Багдановіча шмат хто, у тым ліку Караткевіч, папікае тым, што лёс яго сына склаўся так трагічна. Сяргея Палуяна бацька біў, выганяў з дому, не даваў грошай.***

— Адносіны Максіма з бацькам даводзяцца да абсурду. Дакараюць, што Адам Ягоравіч падтрымліваў свайго сына Льва, а не Максіма, не пусціў апошняга ў Санкт-Пецярбург вучыцца. Але ж бацька думаў пра здароўе сына — Санкт-Пецярбург сапраўды быў не для хворага на сухоты Максіма. А што датычыцца Палуяна, то бацька яго выбіваўся ў людзі пры царскай уладзе, а сын звязаўся з рэвалюцыянерамі. Канешне, Епіфан Іванавіч напалохаўся, што не толькі для сябе, але і для сям'і прынясе непрыемнасці Сяргей. Бацькі заўсёды дбаюць пра дзяцей. Можа, часам дбаюць залішне ці не так, як трэба. Вацлаў Ластоўскі ўспамінае, як хавалі Палуяна ў Кіеве: ішоў вясенні дождж, «убівалася матка», а ноччу бацька ўсхапіўся: чамусьці яму здалося, што Сяргей заснуў летаргічным сном. Хацеў бегчы на Байкавы могілкі, адкопваць магілу. Ён любіў сына. Так, ён, па сутнасці, выгнаў яго з дому, дык трэба ж яшчэ ведаць натуру Сяргея... Таксама не саступаў. Бо мог, не маючы, чым жыць, і пакланіцца бацьку... Але ж не захацеў. Так што тут, як гаворыцца, каса на камень найшла. Не трэба вінаваціць бацькоў. Дзякуючы Адаму Рыгоравічу Багдановічу захаваліся многія рарытэты Максіма, яго рукапісы.

***— Ваша першая кніга пра Сяргея Палуяна «Слядамі знічкі», якая выйшла 30 гадоў таму, была шмат у чым адкрыццём. Сёлета з'явілася новая кніга — «След, вечна жывы». Чым яна адрозніваецца?***

**В. Р.:** Дапоўнена новымі матэрыяламі, напрыклад, пра адносіны Сяргея Палуяна з нашаніўцамі, у прыватнасці Вацлавам Ластоўскім, бо калі пісалася першая кніга, нельга было Ластоўскага ды іншых нават згадваць. У цытатах самога Палуяна прозвішчы замянялі шматкроп'ем. А ўспаміны самога Ластоўскага нельга было і блізка надрукаваць. Тое самае датычылася і іншых дзеячаў, і беларусаў, і ўкраінцаў. Скажам, ёсць рэцэнзія Палуяна на «Трэцюю кнігу апавяданняў» выдатнага ўкраінскага пісьменніка Уладзіміра Віннічэнкі ... А Віннічэнка ў савецкі час быў забаронены. Праўда, некаторыя імёны, якія нельга было згадваць ва Украіне, можна — у Беларусі, і наадварот — цэнзура не ўсё, відаць, ведала. І мы з Таццянай Вячаславаўнай гэтым карысталіся. Калі публікавалі артыкулы пра Палуяна ва Украіне, маглі туды ўключыць прозвішча і Ластоўскага, і іншых. А ў публікацыях у Беларусі маглі ўставіць прозвішча Віннічэнкі. Але ў кнігу мы не маглі змясціць рэцэнзію Палуяна на Віннічэнку. Нам дапамог час. Ва Украіне Віннічэнка зараз шырока друкуецца, ён — класік.

**Т. К.:** Крыўдна, што ў Беларусі зусім не ведаюць Уладзіміра Вінніачэнку, а ў яго найцікавейшыя мастацкія творы, раманы («Сумленнасць з сабою», «Сонечная машына»), п'есы («Чорная Пантэра, Белы Мядзведзь», «Грэх»), палітычныя трактаты («Адраджэнне нацыі», «Слова за табою, Сталін!») і іншыя. У першае дзесяцігоддзе эміграцыі Віннічэнкі (1920-я гады) творы яго выдаваліся па ўсім Савецкім Саюзе. Ва Украіне пачаў выходзіць яго Збор твораў у 28 тамах. Аднак з 1930-х гадоў нават нельга было згадваць прозвішча пісьменніка. Яшчэ ў студэнцкія гады Вінніачэнка займаўся падпольнай рэвалюцыйнай дзейнасцю, яго не раз арыштоўвалі. І ў мяне ўражанне, што Палуян, будучы ў Вільні, меў з Вінніачэнкам сувязь, ездзіў да яго, трымаў у руках яго рукапісы. Гэта прадмет будучых даследаванняў, бо ўсё рабілася канспіратыўна. Яшчэ мне падаецца, што Палуян падобны да аднаго з герояў Вінніачэнкі, які пакутуе з-за несупадзення сваіх маральных перакананняў з асяродкам, сцвярджае, што не перажыве гэты час. Вельмі актуальна асвятляюць адносіны нашаніўцаў з украінцамі. Украінцы падаюць нам прыклад, як важна зразумець усе адраджэнцкія ўрокі таго часу.

***— Ваша даследаванне пра Палуяна — сапраўдны дэтэктыў... Вы шмат ездзілі, сустракаліся з сябрамі і сваякамі вашага героя. Гэта былі нейкія камандзіроўкі ў межах навуковай працы?***

**В. Р.:** Не, якія камандзіроўкі! Толькі наша жаданне. Таццяна Вячаславаўна дысертацыю пісала па беларуска-ўкраінскіх літаратурных сувязях пачатку XX стагоддзя і прозвішча Палуяна сустракала часта. Але ж невядома было, дзе і калі ён нарадзіўся, дзе вучыўся. Была толькі згадка Ластоўскага, што яго «выдала зямля Пінская». А цяпер мы бачым, што месца нараджэння Палуяна бліжэйшае да Мазыра, чым да Пінска.

**Т. К.:** Ездзілі мы паўсюль за свой кошт, на электрычках, цягніках. Цяжкасцяў было шмат. Выданні, у якіх друкаваўся Сяргей Палуян, беларуская «Наша Ніва», украінскія «Рада», «Українська хата», — былі ўнесены ў спіс «буржуазна-нацыяналістычных», варожых выданняў, трапілі ў спецсховішчы. І ўсё роўна ніводная бібліятэка, нават у закрытых фондах, не мела поўных камплектаў. У Беларусі камплекты «Нашай Нівы» адсутнічалі навылёт! Дадам, што ўсё знойдзенае мы перапісвалі ад рукі. Першая «нітачка» пра Палуяна вяла ажно ў Ленінабад, дзе жыў стрыечны брат Сяргея, якому той завяшчаў свае рэчы. Пасля знайшлі ў Кіеве дачку таго брата... У яе ў гасцях і пабачылі першы раз, як выглядаў Сяргей Палуян. У сямейным фотаальбоме былі здымкі, на якіх ён ляжаў у труне. Потым знайшлі сястру Сяргея Людмілу, таксама ў Кіеве, потым — другую сястру, Зінаіду, што жыла ў Ленінградзе, ад той здабылі адрас трэцяй сястры Ангеліны, да якой давялося ехаць у Рыгу... Запомнілася, што ў Ленінградзе гасцінныя гаспадары нас пакінулі начаваць і далі карыстацца «Сяргеевай падушкай» (Зінаіда Епіфанаўна калісьці ўзяла яе на памяць аб браце). Сяргей на той падушцы спаў у Кіеве і бачыў сны пра Беларусь.

***— Для многіх у біяграфіі Палуяна самым таямнічым, ледзь не містычным, з'яўляецца яго смерць...***

**Т. К.:** Бачыла артыкул, дзе Палуян упісаны ў гісторыю самагубства літаратараў. Мне не зразумелы такі падыход. Гэта зніжае саму асобу чалавека, праблемы яго часу. Шукаюць экзістэнцыю такога выбару ў яго творах, вобразы смерці. «Гніюць вёскі забранага краю» і гэтак далей. Маўляў, ён рыхтаваўся да самагубства.

**В. Р.:** Нават Караткевічу прыпісваюць цягу да самагубства — выпіваў, бо ледзь не спецыяльна хацеў сябе загубіць... Я ні разу не бачыў, каб Караткевіч быў «у крытычнай адключцы». Памятаю, адзначалі яго дзень нараджэння. Сядзяць Барадуліны, Бураўкіны, Мальдзісы, Кісялёвы, падымаюць келіхі... Караткевіч выпівае і ціхенька ідзе ў суседнюю спальню. А госці нешта добрае ўспамінаюць пра Валодзю, співаюць, падымаюць за яго чаркі. Караткевіч выходзіць. «То давай, яшчэ налівайце!» Налілі, ён адказаў на віншаванні і пайшоў ізноў адпачываць....

***— Між тым Палуяна ўяўляюць нейкім варыянтам Сяргея Ясеніна: малады таленавіты буяш...***

**В. Р.:** Мы катэгарычна супраць інтэрпрэтацыі такога вобраза Сяргея Палуяна ў літаратуры і ў кіно. Палуян не быў п'яніцам! Колькі ён напісаў за свой апошні год, ды яшчэ на такім узроўні! Увогуле, не ведаю, як ён, бедны, паспяваў... Канешне, была прычына таго, што Сяргей раптам засіліўся. Ёсць звесткі, што ён са сваім сябрам, украінскім паэтам Грыцьком Чупрынкам, дамовіліся сысці з жыцця разам, Сяргей развітаўся з жыццём, а Чупрынка — не. Прычыны застаюцца не спазнанымі. Аднак успомнім перадсмяротны твор Сяргея Палуяна, як ён спецыяльна напісаў да свята Вялікадня: «Хрыстос уваскрос, уваскрэснеш і ты, Беларусь, да новага жыцця». Ён жыў з такімі ўзнёслымі думкамі. І гэта галоўнае для нас, сённяшніх!

**Т. К.:** Маладыя пісьменнікі, літаратуразнаўцы часта гавораць пра Палуяна, не ўлічваючы кантэкст эпохі. А асоба напоўніцу можа выявіцца толькі ў атмасферы часу. Пра нашаніўскі перыяд у жыцці Янкі Купалы і Сяргея Палуяна Алег Лойка напісаў у сваім зацытаваным, зачытаным рамане «Як агонь, як вада» яшчэ ў пачатку 1980-х гадоў! А дзе ж беларускія новыя мастацкія прачытанні тых векапомных падзей? Нам у кнізе «След, вечна жывы» ўдалося праз асобу Палуяна паказаць новыя падыходы да разумення еднасці працэсаў нацыянальнага адраджэння на матэрыяле ўзаемадзеяння ўкраінскай і беларускай прэсы, літаратурнай крытыкі. Украінцы гэты час вельмі актыўна даследуюць, падымаюць рарытэтныя дакументы, хораша асвятляюць. Дарэчы, кіеўскія літаратары (Суліма, Кастэнка, Лявіцкі, Брайко і іншыя) з зацікаўленасцю ўспрынялі кнігу «След, вечна жывы». Заклікаем і нашых пісьменнікаў мастацка-дакументальных, гістарычных жанраў да новых адкрыццяў!

***— Але ёсць версія, што Палуян не сам сябе забіў. Нібыта быў звязаны з небяспечнымі таемнымі арганізацыямі...***

**В. Р.:** А вы дзе-небудзь бачылі хоць адзін дакумент, які пацвярджае гэты домысел? Нічога падобнага няма! Мы ж усё прагледзелі: і ў архівах, і ў друку. Гэта суцэльная выдумка. Гэтак жа, як чутка, што магіла Сяргея і помнік на ёй існавалі яшчэ пасля вайны, і тады ўжо іх зруйнавалі... Сяргей Палуян сказаў Цішку Гартнаму, што ён звязаны з кіеўскімі сацыял-дэмакратамі. Вось і ўсё. Так, ён сапраўды мог быць звязаны (прыгадаем асобу Вінніачэнкі), а мог проста падтрымаць Гартнага, бо ж сацыял-дэмакратычныя погляды ў Палуяна былі! Канкрэтных доказаў, што палітыка справакавала скон Палуяна, не існуе. Прычыны крыюцца ў глыбока асабістым. Час пакажа, наколькі ўдасца спазнаць гэтую таямніцу....

***— Што зрабіць для ўвекавечання памяці Сяргея Палуяна?***

**В. Р.:** Варта было б назваць яго імем вуліцу ў Мінску. Увекавечыць яго імя ў Калінкавічах. Яшчэ калі першая наша кніга пра Палуяна выйшла, я паслаў яе ў Брагін, у краязнаўчы музей, прапанаваў зрабіць экспазіцыю. Паслаў і гэтую кнігу, апошнюю. Але, на жаль, адказу не атрымаў.

**Т. К.:** Вядома, у Брагіне, дзе Палуян нарадзіўся, трэба назваць вуліцу яго імем, зрабіць шыльду, тым больш вядома месца, дзе стаяў яго дом.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

ДЭПАРТАМЕНТ ПА КАШТОЎНЫХ ПАПЕРАХ Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь
ЗАВЕРАНА

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

## об эмиссии жилищных облигаций первого выпуска Общества с ограниченной ответственностью «ДеПартола»

1. Полное и сокращенное наименование эмитента:

на белорусском языке: полное – Таварыства з абмежаванай адказнасцю «ДэПартола»; сокращенное – ТАА «ДэПартола»;

на русском языке: полное – Общество с ограниченной ответственностью «ДеПартола» (далее – эмитент); сокращенное – ООО «ДеПартола».

2. Место нахождения эмитента: Республика Беларусь, 220062, г. Минск, ул. Ратомская, дом 50, помещение 111; телефон 8 (017) 3028410, факс 8 (017) 3028415; электронный адрес (e-mail) info@tapas.by; официальный сайт эмитента в глобальной компьютерной сети Интернет: нет.

3. Эмитент зарегистрирован Минским городским исполнительным комитетом (далее – Мингорисполком) 21 августа 2020 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за номером 193458450.

4. Денежные средства в белорусских рублях, поступающие при размещении жилищных облигаций настоящего выпуска, будут зачисляться на расчетный счет эмитента № BY83MTBK30120001093300100330 в ЗАО «МТБанк», БИК MTBKBY22.

5. Депозитарием эмитента является депозитарий открытого акционерного общества «БПС-Сбербанк»: зарегистрирован в Национальном банке Республики Беларусь 28 декабря 1991 г., регистрационный № 25; действует на основании специального разрешения (лицензии) № 02200/5200-1246-1086 на осуществление профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, выданного Министерством финансов Республики Беларусь; место нахождения: 220005, Республика Беларусь, г. Минск, бульвар имени Мулявина, 6.

6. Основной вид деятельности эмитента: реализация проектов, связанных со строительством зданий.

7. Общее собрание участников эмитента приняло решение о первом выпуске жилищных облигаций 5 ноября 2020 г., протокол № б/н., утвердило Решение о первом выпуске жилищных облигаций 5 ноября 2020 г., протокол № б/н.

8. ООО «ТАПАС» является заказчиком (застройщиком) объекта строительства: «Многоквартирные жилые дома повышенной комфортности со встроенными помещениями общественного назначения в границах улиц Ратомская – Мястровская – Ржавецкая в г. Минске» (далее – объект строительства).

Государственная экспертиза архитектурного проекта объекта строительства проведена Республиканским унитарным предприятием «Главгосстройэкспертиза»: заключение государственной экспертизы (положительное) от 18 сентября 2019 г. № 439-15/19.

В связи с реорганизацией ООО «ТАПАС» в форме выделения эмитента эмитент является правопреемником ООО «ТАПАС» по выделенным обязательствам согласно разделительному балансу. С момента государственной регистрации эмитента, созданного в результате реорганизации ООО «ТАПАС» в форме выделения, у эмитента возникает право собственности на имущество, активы, переданные ему по разделительному балансу.

Объектом жилищного строительства по настоящему выпуску облигаций является жилой дом № 1 по г. п. (далее – жилой дом).

Права эмитента на земельный участок, необходимый для обеспечения строительства жилого дома, подтверждены:

решением Мингорисполкома от 15 октября 2020 г. № 3342 «О передаче прав на земельные участки и о разрешении строительства»;

договором аренды земельного участка от 22 ноября 2019 г. № б/н и соглашением от 2 ноября 2020 г. № б/н с Мингорисполкомом.

Нормативная продолжительность строительства – 16 месяцев, в том числе подготовительный период – 1 месяц.

Предполагаемая дата приемки в эксплуатацию жилого дома – 31 июля 2021 г.

9. Облигации первого выпуска – жилищные, именные, конвертируемые эмиссионные ценные бумаги в бездокументарной форме, имеющие равную номинальную стоимость и сроки осуществления прав в рамках настоящего выпуска вне зависимости от времени приобретения облигации (далее – облигации).

Объем выпуска облигаций – 3 069 248 белорусских рублей.

Количество облигаций – 1054 штуки.

Облигация имеет номинальную стоимость 2912 (Две тысячи девятьсот двенадцать) белорусских рублей и эквивалент этой стоимости, выраженный в квадратных метрах общей площади жилого помещения в жилом доме, равный 1 квадратному метру. Указанный эквивалент номинальной стоимости остается неизменным.

Доход по облигациям не начисляется и не выплачивается.

10. Выпуск облигаций зарегистрирован Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов 16 декабря 2020 г.

Государственный регистрационный номер: 5-200-02-4197.

11. Эмитент осуществляет эмиссию облигаций в соответствии с подпунктом 1.7 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28 апреля 2006 г. № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг». Исполнение обязательств эмитента по облигациям обеспечено поручительством.

Исполнение обязательств эмитента по облигациям обеспечено поручительством Общества с ограниченной ответственностью «ТАПАС ПЛЮС» (далее – поручитель) (Республика Беларусь, 220049, г. Минск, ул. Кнорина, 17, 4-й этаж, офис 19, УНП 190976309). Договор о предоставлении поручительства от 5 ноября 2020 г. № б/н.

Поручитель принимает на себя безусловное и безотзывное обязательство солидарно с эмитентом исполнить обязательства перед владельцами 1054 облигаций в объеме 3 069 248 белорусских рублей в случае неисполнения либо ненадлежащего исполнения данных обязательств эмитентом.

12. Размещение облигаций осуществляется эмитентом путем открытой продажи на неорганизованном рынке юридическим и (или) физическим лицам, резидентам и (или) нерезидентам Республики Беларусь (далее – покупатели облигаций).

Дата начала размещения облигаций: 24 ноября 2020 г.

Дата окончания размещения облигаций: 28 февраля 2022 г., если иная дата не будет определена Общим собранием участников эмитента в порядке и в сроки, установленные законодательством о ценных бумагах.

Отношения сторон оформляются:

договором с эмитентом, заключенным в простой письменной форме, предусматривающим обязательства эмитента по строительству жилых помещений в жилом доме владельцу облигаций, а также иные существенные условия в соответствии с законодательством (далее – договор с эмитентом);

договором купли-продажи облигаций, который имеют право заключать покупатели облигаций, заключившие договор с эмитентом.

Для заключения договора с эмитентом и договора купли-продажи облигаций покупатели могут обратиться к эмитенту:

по адресу: 220049, г. Минск, ул. Кнорина, 17, 4-й этаж, офис 14;

в срок с 24 ноября 2020 г. по 28 февраля 2022 г. ежедневно (за исключением выходных дней (субботы и воскресенья), государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством) с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.

Открытая продажа облигаций осуществляется по договорной цене, определяемой эмитентом в зависимости от ситуации на рынке строительства и недвижимости на момент продажи облигаций, а также исходя из соотношения спроса и предложения на рынке ценных бумаг. При этом максимально допустимая цена размещения облигации – 4160 белорусских рублей.

13. Срок обращения облигаций – 492 календарных дня (с 24 ноября 2020 г. по 31 марта 2022 г.).

14. Эмитент осуществляет досрочное погашение облигаций при невозможности замены обеспечения исполнения обязательств по облигациям либо невозможности предоставления дополнительного обеспечения в случаях, установленных законодательством о ценных бумагах.

Кроме того, эмитент вправе по собственной инициативе осуществить досрочное погашение облигаций в случае ввода жилого дома в эксплуатацию ранее даты начала погашения облигаций, указанной в пункте 15 настоящего документа, в случае досрочно выкупленных у владельцев облигаций на условиях, указанных в Проспекте эмиссии жилищных облигаций первого выпуска эмитента (далее – проспект эмиссии), а также в случае проведения конвертации облигаций до даты окончания срока обращения облигаций.

15. Дата начала погашения облигаций – 31 марта 2022 г.

Правом на получение жилого помещения в жилом доме либо номинальной стоимости облигации при погашении (досрочном погашении) облигаций обладают лица, имеющие действующий договор с эмитентом и указанные в реестре владельцев облигаций, сформированном депозитарием эмитента:

для целей погашения облигаций – на 24 марта 2022 г.;

для целей досрочного погашения облигаций – за 5 рабочих дней до установленной эмитентом даты досрочного погашения облигаций.

16. Ознакомиться (визуально) с проспектом эмиссии (изменениями и (или) дополнениями в проспект эмиссии – при наличии) можно ежедневно (за исключением выходных дней (субботы и воскресенья), государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством) с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 в месте продажи облигаций, указанном в пункте 12 настоящего документа.

Уполномоченное лицо
ООО «ДеПартола»
(по доверенности от 09.09.2020
№ 04-08/3) С.Г. Уминский

Главный бухгалтер
ООО «ДеПартола» И.В. Вавилова

ДЭПАРТАМЕНТ ПА КАШТОЎНЫХ ПАПЕРАХ Міністэрства фінансаў Рэспублікі Беларусь
ЗАВЕРАНА

# КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

## об эмиссии жилищных облигаций третьего выпуска Общества с ограниченной ответственностью «ДеПартола»

1. Полное и сокращенное наименование эмитента:

на белорусском языке: полное – Таварыства з абмежаванай адказнасцю «ДэПартола»; сокращенное – ТАА «ДэПартола»;

на русском языке: полное – Общество с ограниченной ответственностью «ДеПартола» (далее – эмитент); сокращенное – ООО «ДеПартола».

2. Место нахождения эмитента: Республика Беларусь, 220062, г. Минск, ул. Ратомская, дом 50, помещение 111; телефон 8 (017) 3028410, факс 8 (017) 3028415; электронный адрес (e-mail) info@tapas.by; официальный сайт эмитента в глобальной компьютерной сети Интернет: нет.

3. Эмитент зарегистрирован Минским городским исполнительным комитетом (далее – Мингорисполком) 21 августа 2020 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за номером 193458450.

4. Денежные средства в белорусских рублях, поступающие при размещении жилищных облигаций настоящего выпуска, будут зачисляться на расчетный счет эмитента № BY83MTBK30120001093300100330 в ЗАО «МТБанк», БИК MTBKBY22.

5. Депозитарием эмитента является депозитарий открытого акционерного общества «БПС-Сбербанк»: зарегистрирован в Национальном банке Республики Беларусь 28 декабря 1991 г., регистрационный № 25; действует на основании специального разрешения (лицензии) № 02200/5200-1246-1086 на осуществление профессиональной и биржевой деятельности по ценным бумагам, выданного Министерством финансов Республики Беларусь; место нахождения: 220005, Республика Беларусь, г. Минск, бульвар имени Мулявина, 6.

6. Основной вид деятельности эмитента: реализация проектов, связанных со строительством зданий.

7. Общее собрание участников эмитента приняло решение о третьем выпуске жилищных облигаций 5 ноября 2020 г., протокол № б/н., утвердило Решение о третьем выпуске жилищных облигаций 5 ноября 2020 г., протокол № б/н.

8. ООО «ТАПАС» является заказчиком (застройщиком) объекта строительства: «Многоквартирные жилые дома повышенной комфортности со встроенными помещениями общественного назначения в границах улиц Ратомская – Мястровская – Ржавецкая в г. Минске» (далее – объект строительства).

Государственная экспертиза архитектурного проекта объекта строительства проведена Республиканским унитарным предприятием «Главгосстройэкспертиза»: заключение государственной экспертизы (положительное) от 18 сентября 2019 г. № 439-15/19.

В связи с реорганизацией ООО «ТАПАС» в форме выделения эмитента эмитент является правопреемником ООО «ТАПАС» по выделенным обязательствам согласно разделительному балансу. С момента государственной регистрации эмитента, созданного в результате реорганизации ООО «ТАПАС» в форме выделения, у эмитента возникает право собственности на имущество, активы, переданные ему по разделительному балансу.

Объектом жилищного строительства по настоящему выпуску облигаций является жилой дом № 3 по г. п. (далее – жилой дом).

Права эмитента на земельный участок, необходимый для обеспечения строительства жилого дома, подтверждены:

решением Мингорисполкома от 15 октября 2020 г. № 3342 «О передаче прав на земельные участки и о разрешении строительства»;

договором аренды земельного участка от 22 ноября 2019 г. № б/н и соглашением от 2 ноября 2020 г. № б/н с Мингорисполкомом.

Нормативная продолжительность строительства – 16 месяцев, в том числе подготовительный период – 1 месяц.

Предполагаемая дата приемки в эксплуатацию жилого дома – 31 июля 2021 г.

9. Облигации третьего выпуска – жилищные, именные, конвертируемые эмиссионные ценные бумаги в бездокументарной форме, имеющие равную номинальную стоимость и сроки осуществления прав в рамках настоящего выпуска вне зависимости от времени приобретения облигации (далее – облигации).

Объем выпуска облигаций – 2 617 888 белорусских рублей.

Количество облигаций – 899 штук.

Облигация имеет номинальную стоимость 2912 (Две тысячи девятьсот двенадцать) белорусских рублей и эквивалент этой стоимости, выраженный в квадратных метрах общей площади жилого помещения в жилом доме, равный 1 квадратному метру. Указанный эквивалент номинальной стоимости остается неизменным.

Доход по облигациям не начисляется и не выплачивается.

10. Выпуск облигаций зарегистрирован Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов 16 декабря 2020 г.

Государственный регистрационный номер: 5-200-02-4199.

11. Эмитент осуществляет эмиссию облигаций в соответствии с подпунктом 1.7 пункта 1 Указа Президента Республики Беларусь от 28 апреля 2006 г. № 277 «О некоторых вопросах регулирования рынка ценных бумаг». Исполнение обязательств эмитента по облигациям обеспечено поручительством.

Исполнение обязательств эмитента по облигациям обеспечено поручительством Общества с ограниченной ответственностью «ТАПАС ПЛЮС» (далее – поручитель) (Республика Беларусь, 220049, г. Минск, ул. Кнорина, 17, 4-й этаж, офис 19, УНП 190976309). Договор о предоставлении поручительства от 5 ноября 2020 г. № б/н.

Поручитель принимает на себя безусловное и безотзывное обязательство солидарно с эмитентом исполнить обязательства перед владельцами 899 облигаций в объеме 2 617 888 белорусских рублей в случае неисполнения либо ненадлежащего исполнения данных обязательств эмитентом.

12. Размещение облигаций осуществляется эмитентом путем открытой продажи на неорганизованном рынке юридическим и (или) физическим лицам, резидентам и (или) нерезидентам Республики Беларусь (далее – покупатели облигаций).

Дата начала размещения облигаций: 24 ноября 2020 г.

Дата окончания размещения облигаций: 28 февраля 2022 г., если иная дата не будет определена Общим собранием участников эмитента в порядке и в сроки, установленные законодательством о ценных бумагах.

Отношения сторон оформляются:

договором с эмитентом, заключенным в простой письменной форме, предусматривающим обязательства эмитента по строительству жилых помещений в жилом доме владельцу облигаций, а также иные существенные условия в соответствии с законодательством (далее – договор с эмитентом);

договором купли-продажи облигаций, который имеют право заключать покупатели облигаций, заключившие договор с эмитентом.

Для заключения договора с эмитентом и договора купли-продажи облигаций покупатели могут обратиться к эмитенту:

по адресу: 220049, г. Минск, ул. Кнорина, 17, 4-й этаж, офис 14;

в срок с 24 ноября 2020 г. по 28 февраля 2022 г. ежедневно (за исключением выходных дней (субботы и воскресенья), государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством) с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.

Открытая продажа облигаций осуществляется по договорной цене, определяемой эмитентом в зависимости от ситуации на рынке строительства и недвижимости на момент продажи облигаций, а также исходя из соотношения спроса и предложения на рынке ценных бумаг. При этом максимально допустимая цена размещения облигации – 4160 белорусских рублей.

13. Срок обращения облигаций – 492 календарных дня (с 24 ноября 2020 г. по 31 марта 2022 г.).

14. Эмитент осуществляет досрочное погашение облигаций при невозможности замены обеспечения исполнения обязательств по облигациям либо невозможности предоставления дополнительного обеспечения в случаях, установленных законодательством о ценных бумагах.

Кроме того, эмитент вправе по собственной инициативе осуществить досрочное погашение облигаций в случае ввода жилого дома в эксплуатацию ранее даты начала погашения облигаций, указанной в пункте 15 настоящего документа, в случае досрочно выкупленных у владельцев облигаций на условиях, указанных в Проспекте эмиссии жилищных облигаций третьего выпуска эмитента (далее – проспект эмиссии), а также в случае проведения конвертации облигаций до даты окончания срока обращения облигаций.

15. Дата начала погашения облигаций – 31 марта 2022 г.

Правом на получение жилого помещения в жилом доме либо номинальной стоимости облигации при погашении (досрочном погашении) облигаций обладают лица, имеющие действующий договор с эмитентом и указанные в реестре владельцев облигаций, сформированном депозитарием эмитента:

для целей погашения облигаций – на 24 марта 2022 г.;

для целей досрочного погашения облигаций – за 5 рабочих дней до установленной эмитентом даты досрочного погашения облигаций.

16. Ознакомиться (визуально) с проспектом эмиссии (изменениями и (или) дополнениями в проспект эмиссии – при наличии) можно ежедневно (за исключением выходных дней (субботы и воскресенья), государственных праздников и праздничных дней, установленных и объявленных нерабочими в соответствии с законодательством), с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 в месте продажи облигаций, указанном в пункте 12 настоящего документа.

Уполномоченное лицо
ООО «ДеПартола»
(по доверенности от 09.09.2020
№ 04-08/3) С.Г. Уминский

Главный бухгалтер
ООО «ДеПартола» И.В. Вавилова

# ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА 20 января 2021 г. НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ

## Организатор аукциона: Смолевичский районный исполнительный комитет, 222201, г. Смолевичи, ул. Советская, д. 125

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь (га) | Целевое назначение | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | аг. Слобода Пекалинского сельсовета | 624883604601000554 | 0,22215 | Для строительства и обслуживания административного здания | 2 547,25 |
| 2 | в районе дер. Черница Пекалинского сельсовета | 624883600001000083 | 0,2004 | Для строительства и обслуживания производственной базы | 1 833,66 |
| 3 | аг. Слобода Пекалинского сельсовета | 624883604601000541 | 0,0366 | Для строительства и обслуживания торгового павильона | 424,56 |

**Аукцион состоится 20 января 2021 г. в 15.00 в Смолевичском районном исполнительном комитете по адресу: г. Смолевичи, ул. Советская, д. 125, зал заседаний.**

Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: https://au.nca.by/, http://rlt.by/ru/, Смолевичского райисполкома: isp@smolevichi.gov.by.

УНП 600014139

# Дэлі ў аблозе




## Што ўзрушыла індыйскіх фермераў?

**У Індыі па-ранейшаму неспакойна: у краіне ўжо больш чым тры тыдні працягваецца шматтысячны пратэст фермераў. На гэтым тыдні маніфестанты нават зладзілі масавую галадоўку, паведаміў tass.ru. Фермеры такім чынам імкнуліся прыцягнуць увагу грамадскасці да свайго пратэсту, які, па іх словах, «носіць мірныя формы — па ўзоры Махатмы Гандзі». Адметна, што да сімвалічнай галадоўкі далучыўся і галоўны міністр нацыянальнай сталічнай акругі Дэлі (куды ўваходзіць індыйская сталіца Нью-Дэлі) Арвінд Кеджрывал. Што ж узрушыла індыйскіх фермераў?**

### РЫС І МАЛАКО

Індыя — адна з найбуйнейшых сусветных сельскагаспадарчых дзяржаў. Паводле прагнозаў ААН, у сярэднетэрміновай перспектыве яна выйдзе на першае месца ў свеце па колькасці насельніцтва, апярэдзіўшы Кітай. Па плошчы ворных земляў Індыя з'яўляецца безумоўным сусветным лідарам: каля 160 мільёнаў гектараў. Па водных рэсурсах — 7-е месца. Галоўная крыніца вады для ірыгацыі ў Індыі — грунтавыя рэсурсы. У многіх рэгіёнах краіны сітуацыя з імі становіцца крытычнай: спажыванне значна апярэджвае аднаўленне з натуральных крыніц, узровень вод паніжаецца, адбываецца іх засаленне.

У Індыі найбольш паспяхова і стабільна развіваецца вытворчасць агародніны і садавіны. Па вагавых паказчыках гэтая галіна апярэджвае вытворчасць зернебабовых. Індыя займае другое месца ў свеце пасля Кітая па вытворчасці агародніны і садавіны і лідзіруе па аб'ёме сабранага ўраджаю такіх культур, як бананы, манга, зялёны гарошак. Галоўнымі збожжавымі культурамі ў краіне з'яўляюцца рыс (гадавы ўраджай — больш за 100 мільёнаў тон) і пшаніца (80—90 мільёнаў тон).

Індыя найбуйнейшы ў свеце вытворца малака. Галоўная культура індыйскага харчовага экспарту — рыс, які складае каля трэціны ад усяго харчовага экспарту Індыі. Улічваючы крытычны стан запасаў грунтавых вод і хуткі рост насельніцтва, можна спрагназаваць, што вытворчасць і экспарт гэтай культуры з Індыі будзе скарачацца. Акрамя рысу, краіна экспартуе значную колькасць мяса, рыбнай прадукцыі і вострых спецый.



### ЦЯЖАР ДАЎГОЎ

Сельскагаспадарчы сектар складае амаль 15 працэнтаў эканомікі Індыі, якую ацэньвалі ў 2,9 трыльёна, але ў ім занята каля паловы з 1,3 мільярда жыхароў краіны. Гэта значыць, больш за 50 % працоўнай сілы залежыць ад сельскай гаспадаркі, пры гэтым па меншай меры 70 працэнтаў вясковых хатніх гаспадарак атрымліваюць сродкі для існавання толькі ад сельскагаспадарчага сектара, паведаміў tass.ru.

У той жа час значная частка фермераў аказваецца ўсё глыбей уцягнутай у даўгі з-за неўраджаяў і немагчымасці забяспечыць канкурэнтаздольныя цэны на сваю прадукцыю. Самагубства ў сялянскім асяроддзі — не рэдкасць. У 2018-м Нацыянальны банк сельскай гаспадаркі і развіцця сельскай мясцовасці заявіў, што больш за палову фермераў у даўгах. У 2018—2019 гадах пакончылі з сабой звыш 20 тысяч работнікаў сельскай гаспадаркі.

Доўгі час урады, якія змянялі адно аднаго, не хацелі брацца за рэформы ў гэтым адчувальным сектары: занадта шмат праблем. Індыйская эканоміка, якая многія гады пакутавала ад завышанага дзяржаўнага кантролю, дамаглася лібералізацыі ў 1991 годзе. Тагачасны прэм'ер Нарасімха Раа пайшоў на рэформы: яго ўрад адкрыў краіну для замежнага капіталу, палегчыў правілы ліцэнзавання бізнесу, дазволіў свабоднае канвертаванне рупіі, стварэнне прыватных банкаў з удзелам замежных партнёраў, вываз прыбытку за мяжу і гэтак далей. У выніку ўжо да канца 1990-х гадоў у свеце загаварылі аб «індыйскім цудзе» — усяго за некалькі гадоў краіна ўвайшла ў лік дзяржаў з самымі хуткімі тэмпамі эканамічнага росту. Але гэты працэс амаль не закрануў сельскую гаспадарку.

І вось цяпер, упэўнены эксперты, мы становімся сведкамі пачатку радыкальных перамен у індыйскай сельскай гаспадарцы. І ад таго, хто выйдзе пераможцам у гэтай спрэчцы фермераў з дзяржавай, залежыць тое, як зменіцца ўся аграрная Індыя ўжо ў найбліжэйшы час. У верасні гэтага года ўрад Нарэндры Модзі нарэшце пайшоў на перамены ў гэтай праблемнай галіне. Былі прыняты тры новыя законы. Яны дазваляюць буйным кампаніям закупляць прадукцыю ў сельгасвытворцаў напрамую, без пасрэднікаў, адзначае ТАСС. Законы таксама адкрылі магчымасці фермерам і сялянам прадаваць прадукцыю на любым рынку, а не толькі ў сваім штаце, а таксама моцна зніжаюць дзяржаўнае рэгуляванне сельгасрынкаў.

«Рэформы дапамогуць прыцягнуць інвестыцыі ў сельскую гаспадарку і прынясуць карысць фермерам», — заявіў Нарэндра Модзі на штогадовым сходзе Федэрацыі індыйскіх гандлёва-прамысловых палат у Нью-Дэлі, паведаміла Reuters.



### ПАНДЭМІЯ І РЭЦЭСІЯ

Аднак замест падзякі ў адказ фермеры распачалі масавыя пратэсты. У асноўным пратэстуюць выхадцы з шасці штатаў: Пенджаб, Утар-Прадэш, Хар'яна, Утаракханд, Раджастан і Керала. Гэта важныя сельгасрэгіёны Індыі (толькі Пенджаб і Хар'яна вырабляюць амаль 18 мільёнаў тон рысу ў год, забяспечваючы Паўночную Індыю).

Насамрэч гэта ўжо не першы пратэст вытворцаў супраць сельскагаспадарчай палітыкі ўрада краіны. Як вядома, у лістападзе 2018 года тысячы фермераў прайшлі па Нью-Дэлі маршам да будынка парламента. Летась па ўсёй Індыі таксама ўспыхнулі масавыя пратэсты фермераў, у асноўным у штатах Мадх'я-Прадэш і Махараштра. Тады таксама былі сутыкненні з паліцыяй: па даных мясцовых СМІ, шэсць фермераў былі забітыя. Летам не менш за 35 тысяч фермераў прыйшлі, пратэстуючы, у эканамічную сталіцу Індыі Мумбаі. А цяпер яны яшчэ маюць намер пачаць акцыю «Гаон бандх» («Закрый вёску»), спыніўшы пастаўкі садавіны, агародніны і малочных прадуктаў у гарады, згадаў tass.ru.

Напрыканцы лістапада ў Індыі пачалася, напэўна, самая маштабная забастоўка ў гісторыі. Паводле падлікаў прафсаюзаў і СМІ, у ёй узялі ўдзел чвэрць мільярда чалавек. «Марш на Дэлі», арганізаваны галоўнымі прафаб'яднаннямі краіны, пачаўся адразу пасля таго, як прэзідэнт Рат Нат Кавінд ухваліў новыя законы. Тры з іх «фермерскія», і яшчэ чатыры закранаюць інтарэсы работнікаў прамысловасці.

«Мы хочам перамен. Але іншых!» — патлумачыў tass.ru ўдзельнік пратэстаў Равіндэр Сінгх. Ужо некалькі гадоў у ходзе маршаў пратэсту сяляне дамагаюцца павышэння мінімальнай дзяржаўнай закупачнай цаны на сельгаспрадукцыю, якая ў Індыі вызначаецца кожны сезон. Фермеры звычайна прадаюць сваю прадукцыю на мясцовых зарэгістраваных дзяржавай рынках, якія забяспечваюць ім мінімальны кошт. Гэта абараняе вытворцаў ад цэнавых узрушэнняў у выпадку неўраджаю.

Эксперты нагадваюць, што пандэмія заганяе краіну ў сапраўдную рэцэсію, яшчэ больш паглыбляючы няроўнасць і галечу. Так ВУП Індыі за гэты год рэкордна зваліўся на 23,9 працэнта, а ўзровень беспрацоўя рэкордна вырас — да 27 %. Удзельнікі акцый пратэсту патрабуюць ад урада спынення палітыкі прыватызацыі дзяржаўных прадпрыемстваў, адмены законаў, накіраваных «супраць работнікаў і фермераў». Прафсаюзы патрабуюць гарантый занятасці сельскім рабочым не менш за 200 дзён у год, а таксама павышэнне зарплаты і распаўсюджванне гэтых мер на гарадскіх працоўных.

Новы закон дае магчымасць прадпрыемствам, у штаце якіх працуе менш за 300 чалавек, праводзіць скарачэнні без спецыяльнага дазволу ўлад. Пры гэтым, піша Hindustan Times, у Індыі да 90 працэнтаў працоўнай сілы занята ў нефармальным сектары, пераважная большасць прадпрыемстваў маюць менш чым 300 работнікаў. А значыць, кадравая палітыка бізнесу застанецца без кантролю.

### ПЕРАДЗЕЛ РЫНКУ

Эксперты адзначаюць трывожныя тэндэнцыі. «Насамрэч мы становімся сведкамі сур'ёзнай барацьбы за перадзел індыйскага сельскагаспадарчага рынку ў выніку таго, што дзяржава хоча аслабіць кантроль над ім. З зямлі паступова выцясняецца традыцыйны гаспадар — сельская абшчына, дробны вытворца — фермеры, сяляне», — заўважыў tass.ru эканамічны аглядальнік Пардзіп Гапала.

Фермеры ўпэўнены, што ў адсутнасць дзяржаўных рэгулятараў іх будуць эксплуатаваць вялікія карпарацыі. Яны асцерагаюцца поўнай адмены закупных цэн, якія хоць неяк гарантавалі ім выжыванне ў вельмі цяжкім клімаце Індыі, дзе многія рэгіёны адчуваюць недахоп вады, а іншыя рэгулярна заліваюць паводкі. Новыя законы адкрыта заахвочваюць кантрактнае земляробства, і фермеры асцерагаюцца, што буйныя кампаніі павыкупляюць іх зямлю за даўгі, а яны ператворацца ў рабочых па кантракце, адзначае эксперт.

«Урад пераконвае, што захавае закупачныя цэны. Але прафсаюзы фермераў і апазіцыйныя партыі сцвярджаюць, што законы паступова прывядуць да паэтапнай адмовы ад закупачных цэн і традыцыйнай сістэмы збожжавых рынкаў і, такім чынам, знішчаць дробных фермераў. Галоўным на рынку становіцца не селянін і нават не дзяржава, а перакупшчыкі, у якіх ёсць транспарт, структуры, склады. Перавагу атрымаюць і буйныя сельгаскарпарацыі», — лічыць Пардзіп Гапала.

Вядомы індыйскі палітолаг Нандан Унікрышнан мяркуе, што прычынай з'яўлення новых законаў стала значная цікавасць замежных і мясцовых буйных кампаній і алігархаў да індыйскага рынку сельскагаспадарчай зямлі. «Пачнём з таго, што ў Індыю прыйшлі замежныя гульцы, мультыбрэндавыя сеткі, якія пачалі сур'ёзна разглядаць інвестыцыі ў аграрны рынак. Гэта і PepsiCo, і Amazon, і Walmart. Яны гатовы закупляць прадукцыю наўпрост — абыходзячы мясцовыя рынкі. Індыйскія алігархі таксама ажывіліся: у краіне чакаюць вялікіх перамен у гандлі з прыходам мультыбрэндавых сетак. А гэтым гульцам нявыгадныя нормы дзяржкантролю ў індыйскай сельскай гаспадарцы, якія стрымліваюць рынак. Да таго ж ім прасцей мець справу з буйнымі вытворцамі прадукцыі», — адзначыў tass.ru Нандан Унікрышнан.

Тым часам стала вядома, што фермеры сямі штатаў, якія ўваходзяць у дзесяць прафсаюзаў, пагадзіліся з прапановай індыйскага ўрада выправіць тры новыя аграрныя законы, паведаміла індыйскае інфармацыйнае агенцтва IANS. Яны лічаць, што новыя законы прынясуць карысць фермерам усёй Індыі і пазбавяць іх «ад кіпцюроў пасрэднікаў», якія дыктуюць умовы продажу ўраджаю. На іх думку, законы забяспечаць фермерам свабоду выбару пры продажы і куплі сельгаспрадукцыі. Прафсаюзы змянілі меркаванне пасля сустрэчы іх лідараў з міністрам сельскай гаспадаркі Індыі Нарэндрам Сінгхам Тамарам. У спецыяльным мемарандуме яны заявілі аб сваёй згодзе з прапанаванымі ўрадам папраўкамі.

Захар БУРАК.

**З кожным днём градус увагі да Алімпійскіх гульняў у Токіа павышаецца. «Звязда» знаёміць сваіх чытачоў са спартсменамі, за якімі летам, затаіўшы дыханне, будзе сачыць уся Беларусь і ўвесь свет.**

**Марына СЛУЦКАЯ, жалезная лэдзі беларускага спорту:**

# «У дзюдо мне ніхто не казаў пахудзець»



Пра такіх жанчын, як Марына Слуцкая, сёння кажуць — self-made woman (жанчына, якая «зрабіла» сама сябе). Двухразовая чэмпіёнка Еўропы, чэмпіёнка Еўрапейскіх гульняў, васьміразовая чэмпіёнка Беларусі. Кар'еру спартсменкі яна сумяшчае з кар'ерай дзіцячага трэнера ў клубе адзінаборстваў «Голд». Гісторыя ператварэння Марыны «з неспартыўнай пышкі ў найлепшую дзюдаістку краіны», якую яна расказвае ў сваім блогу, падобна на кіно. Аднак што застаецца за кадрам?

***— Марына, да Алімпійскіх гульняў у Токіа застаецца менш чым год. Пачалі ўжо падрыхтоўку?***

— Пакуль мы толькі вяртаемся ў прывычны рытм. Пандэмія стала цяжкім перыядам для ўсяго спорту і для мяне асабіста. Я была ў выдатнай форме, заваявала срэбраны медаль на прэстыжным турніры «Вялікага шлема» ў Парыжы. Канешне, усе разлічвалі, што я ў добрай форме падыду да Алімпійскіх гульняў. Але ўсё разбурылася літаральна за два дні. Было цяжка з гэтым змірыцца. Добра, што мы трэніраваліся, а не проста сядзелі дома. Аднак без спаборніцтваў было нялёгка. А яшчэ я і на чэмпіянат Еўропы ў лістападзе не паехала, бо захварэла на каранавірус, які, на шчасце, перанесла ў лёгкай форме. Але вырашылі мяне паберагчы, тым больш што ў мяне добрае становішча ў рэйтынгу і за баламі не трэба гнацца. Нядаўна турэцкая федэрацыя запрасіла нас да сябе на зборы, дзе ўжо будзем працаваць дзеля ідэальнай формы.

***— У адным са сваіх інтэрв'ю вы адзначылі, што ў Токіа вам будзе ўжо 30 гадоў. Узрост не перашкодзіць паспяховаму выступленню?***

— Для маёй цяжкай вагавой катэгорыі ўзрост ад 28 да 32 гадоў — самы лепшы. Жаночы арганізм ужо сфарміраваны, ёсць неабходны вопыт і жаданне перамагаць. Пакуль я не дайду да Алімпіяды, не злезу з гэтага віду спорту. Я вельмі доўга і ўпарта да гэтага ішла, многім ахвяравала. Каб дасягнуць поспеху, трэба ўвесь час, усе сілы, асабістае жыццё аддаваць спорту. І ў пэўны момант даводзіцца рабіць выбар паміж сям'ёй і спортам. Мужчыны, нават калі ў іх ёсць свае сем'і, дзеці, могуць спакойна займацца сваёй справай. Жанчынам цяжэй, бо кожная жанчына хоча стаць маці. А для таго каб нарадзіць дзіця, патрэбна зрабіць перапынак у кар'еры мінімум на паўтара года. Для дзюдо такі перапынак — гэта прорва. За паўтара года форма страчваецца цалкам, а саперніцы тым часам развіваюцца. Ёсць дзяўчаты, якія нараджаюць дзіця і вяртаюцца ў спорт, бяруць малога з сабой на спаборніцтвы, зборы, ім дапамагаюць бацькі, муж. У дзюдо з гэтым вельмі цяжка. У нас часам здараецца па два-тры старты на месяц, па тры тыдні запар цябе не бывае дома. І жанчыны заканчваюць кар'еру раней, чым мужчыны, бо робяць выбар на карысць сям'і. Я выбрала спорт, але ў мяне на гэта была свая матывацыя. У мяне добра атрымлівалася, я разумела, што магу дасягнуць высокага выніку. Зараз мне 29 гадоў, у Токіа будзе 30. Я планую выступіць на Алімпійскіх гульнях і паступова заканчваць спартыўную кар'еру, займацца сям'ёй.

***— Як у вас з'явілася ідэя весці блог?***

— Гэтыя дзевяць месяцаў перапынку патрэбна было чымсьці займацца. І з'явілася ідэя расказаць, як я прыйшла ў дзюдо. Адной гісторыі аказалася мала, вырашыла пісаць цікавыя рэчы пра свой спорт, штосьці з псіхалогіі, з уласнага вопыту. Цікава дзяліцца сваім меркаваннем і чытаць думкі іншых людзей. Цяпер «Інстаграм» хутка развіваецца і, развіваючы сваю старонку, я развіваю акаунт свайго клуба, прыцягваю ўвагу да дзюдо.

***— У вашай гісторыі, якую вы расказваеце ў блогу, няма нічога аб сітуацыях, калі вам хацелася кінуць дзюдо. Няўжо такіх момантаў не было?***

— Я проста не паспела пра гэта расказаць. Канешне, за 15 гадоў у прафесійным спорце такія моманты былі. Часцей дробязі, калі я прыходзіла пасля спаборніцтваў, кідала кімано і крычала, што больш ніколі не пайду на трэніроўку. Але праз пэўны час супакойвалася і працавала далей. Сур'ёзныя думкі наконт заканчэння кар'еры былі ў 2016 годзе, калі я не паехала на Алімпійскія гульні ў Рыа. Мне не хапіла 40 балаў, а гэта адна выйграная схватка на турніры ці паездка на чэмпіянат свету, дзе я таксама не выступіла. Я ўжо тады працавала трэнерам і мне было куды сыходзіць. Але бацькі, сябры, малады чалавек у адзін голас раілі астыць і вяртацца на татамі. І я прыслухалася да іх. Я ўпэўнена, калі б закончыла тады, цяпер вельмі шкадавала б. У той час я адчувала сябе бутэлькай, поўнай пяску, якую рэзка вытраслі, і яна засталася пустая. Такая пустэча была ўнутры, але з цягам часу яна запоўнілася, і я вярнулася да сваёй маральнай і фізічнай формы. Адзін раз можна такое перажыць і застацца ў спорце, але другі амаль немагчыма.



***— Як часта за сваю кар'еру вы чулі, што займаецеся нежаночым спортам?***

— Першыя пяць гадоў раз у месяц бацькі ці настаўнікі такое казалі. Але пакажыце мне хоць адзін цалкам жаночы від спорту. Хіба што мастацкая гімнастыка, але куды мне ў гімнастыку?! Мама прапаноўвала займацца танцамі, але гэта тое ж самае, што і з гімнастыкай. Я іграла б на фартэпіяна, аднак тата сказаў, што не пацягне яго на пяты паверх. Так скончылася мая музычная кар'ера. Але потым бацькі прынялі мой выбар, яны заўжды мяне мацней за ўсіх падтрымліваюць і вельмі мной ганарацца. Я ішла па сваім шляху, нікога не слухаючы, і стала такой, якая я зараз ёсць. У дзюдо мне ніхто не казаў пахудзець ці змяніцца. І калі мне камфортна, то чаму я павінна думаць, што думаюць іншыя?

***— Марына, дзюдо, як і любое іншае баявое мастацтва, філасофія. Чаму вас навучыла гэтая філасофія?***

— Самы галоўны ўрок — спачатку думаць а потым гаварыць. Часта са мной здараліся непрыемныя сітуацыі толькі з-за таго, што я праўдалюб і хачу, каб маё меркаванне пачулі, але лічу, што лепш сказаць праўду ў вочы. Дзюдо навучыла мяне ўзаемадапамозе. Я навучылася ставіцца да людзей так, як яны да мяне. Не факт, што яны заўсёды робяць гэтак жа, але такіх людзей лепш прыбіраць са свайго жыцця.

***— За столькі гадоў вашай спартыўнай кар'еры ў вас з'явілася неразлучная саперніца?***

— У маёй катэгорыі ёсць некалькі дзяўчат, з якімі мы борамся з кадэцкага ўзросту — з 16-17 гадоў. Увесь гэты час мы ідзём поплеч, нага ў нагу. Ёсць такая дзяўчына з Босніі і Герцагавіны. Адна з маіх пастаянных саперніц — Іра Кіндзерская з Азербайджана. У нас было непрыемнае знаёмства, гадоў 15 таму яна мяне траўміравала на маім першым старце. Потым я доўга не магла яе перамагчы, але зараз схваткі ў нас роўныя. Максімальна часта сустракаемся з украінкай Лізаветай Каланінай, так па жараб'ёўцы складваецца. У цяжкай катэгорыі еўрапейскія спартсменкі — адны з самых моцных дзюдаістак. Ёсць моцныя бразільянкі, японкі, але еўрапейкі — усё роўна найлепшыя.

***— Увогуле, дзюдо — сяброўскі спорт?***

— Ёсць спартсмены, з якімі я ў вельмі добрых адносінах. З расіянкай Ксюшай Чыбісавай мы правялі безліч схватак, і я заўсёды выйграю. Мы з ёй добрыя сябры, падтрымліваем цёплыя адносіны. Ёсць людзі, з якімі я стараюся лішні раз не кантактаваць. Але заўсёды гатовая прыйсці на дапамогу. Розныя сітуацыі бываюць: багаж не прыляцеў, майка парвалася. Я не магу сказаць, што мы ўсе паміж сабой добра сябруем. Канкурэнцыя ў любым выпадку будзе адчувацца, асабліва ў адной катэгорыі.

***— А як вы ставіцеся да спаборніцтваў «сценка на сценку»?***

— Я баролася ў такім фармаце чатыры разы. Першы раз — на першынстве Беларусі, выступала за каманду горада Мінска, і тады мы прайгралі ўсім, каму толькі можна было. Другі раз — на камандным чэмпіянаце Еўропы ў Екацярынбургу. І мне не спадабалася, мы былі максімальна не ў форме і бароліся быццам кожны сам за сябе. А ад пройгрышу аднаго залежыць вынік усёй каманды. І трэці раз быў ужо на Еўрапейскіх гульнях у Мінску. Тады мне ўжо спадабалася, але было вельмі крыўдна. У індывідуальным выступленні я перамагла, аддала ўсю сябе. Пакуль сустрэчы, інтэрв'ю, віншаванні, на адрэналіне паспала, мабыць, з гадзіну. А на наступны дзень былі камандныя схваткі. Скажу шчыра, на той час асабістыя адносіны ў нас былі не самыя лепшыя, але мы змаглі сабрацца і стаць сапраўднай камандай. Правялі дзве выдатныя схваткі, хоць мне было вельмі цяжка. І калі мы прайгралі, я плакала так, што мяне гадзіну не маглі супакоіць. Плакала не ад пройгрышу, а ад крыўды — я ўсю сябе аддала ў гэтых схватках, а яно так атрымалася. За трэцяе месца мы змагаліся з французамі і саступілі. Але французы і расіяне — найлепшыя каманды ў свеце.

Пасля Еўрапейскіх гульняў мяне запрасілі ў іспанскі клуб «Валенсія», выступіць у Залатой лізе, клубных спаборніцтвах. Я даўно абяцала гэтай камандзе, што буду за іх выступаць, і, нарэшце, у мяне атрымалася. Спартсмены, якія выступаюць за клуб, борацца, як апошні раз, бо гэта іх грошы, і грошы немаленькія. Атмасфера там выдатная. У мяне праблемы з англійскай мовай, але мы вельмі хутка змаглі стаць не проста камандай, а сям'ёй.

***— Марына, сярод беларускіх спартсменак у вас ёсць канкурэнты?***

— На жаль, няма і не прадбачацца. Магчыма, камусьці гэта будзе непрыемна. Але я лічу, што ў нас не заўсёды правільна і дастаткова добра працуюць дзіцячыя трэнеры. Працуючы трэнерам, я сама зразумела, як гэта складана. У нас трэнер бярэ спартсмена і некалькі гадоў вырошчвае з яго алімпійскага чэмпіёна. Але гэта няправільна, на кожнай ступені павінен быць асобны трэнер — дзіцячы, юніёрскі, дарослы. У трэнераў таксама павінна быць пераемнасць пакаленняў ці ён павінен расці разам са спартсменам. А ў нас часта бывае так, што спартсмен вырастае да пэўнага ўзроўню, а трэнер не можа з ім працаваць. І спартсмен не раскрываецца. Варта праводзіць сумесныя трэніроўкі спартсменаў аднаго ўзросту, бо ў канкурэнцыі нараджаецца вынік. А ў нас так не заўсёды атрымліваецца праз фінансавыя цяжкасці. Цяпер ёсць некалькі маладых дзяўчат, якія прыйдуць праз 5—10 гадоў пасля мяне. А калі не прыйдуць, бо выйдуць замуж і кінуць спорт?

***— Вы са сваім трэнерам Леанідам Свірыдам працуеце з самага пачатку?***

— Так, мне ў гэтым пашанцавала. Але я прыйшла ўжо ў дарослы спорт. Канешне, у нас з Леанідам Фёдаравічам былі непаразуменні, як у любых чалавечых адносінах. Не факт, што з іншым настаўнікам я дасягнула такіх вынікаў. Я спецыфічны чалавек, ён таксама. Але сярод прафесіянальных спартсменаў простых людзей не бывае. Наша сумесная праца дае вынік — гэта галоўнае.

***— Марына, вы расказвалі, што ў дзяцінстве былі не такой, як усе, і праз гэта мелі дрэнныя адносіны з аднакласнікамі. Працуючы з дзецьмі, выкарыстоўваеце ўрокі свайго дзяцінства?***

— Я працую з абсалютна рознымі дзецьмі, у кожнага свой характар. Мы з калегамі прыкладаем шмат намаганняў, каб у іх былі добрыя адносіны. Старэйшыя дапамагаюць малодшым, падказваюць ім, разам трэніруюцца. Але найлепшы настаўнік — уласны вопыт і ўласныя ўрокі. Мы імкнёмся зрабіць так, каб цяжкіх урокаў у нашых дзяцей было як мага менш.

***— Вы неяк прызнаваліся, што строгі трэнер. Успамінаючы, як вашы дзеці хварэлі за вас на Еўрапейскіх гульнях, складваецца адчуванне, што вы іх любімы трэнер. Як вам гэта ўдаецца?***

— Я сапраўды вельмі строгі трэнер. Часам баюся сама сябе. Пасля Еўрапейскіх гульняў пра мяне здымалі перадачу, і ў дзяцей спыталі, які я трэнер. І адзін хлопчык сказаў: «Марына Уладзіміраўна добрая, вучыць нас усяму, але мы ўсе яе крыху баімся». У нас ёсць дзеці, якія праз праблемы са здароўем не могуць займацца дзюдо, але яны прыходзяць да нас у госці, віншуюць са святамі. Яны заўжды сочаць за маімі спаборніцтвамі. Я хоць і строгая, але я іх люблю, і дзеці гэта адчуваюць.




***— Марына, вы сказалі, што дзюдо — усё ваша жыццё. Што вас матывуе аддаваць яму ўвесь свой час?***

— Я вельмі люблю момант, калі мяне абвяшчаюць пераможцай. Яго нельга перадаць словамі, гэта можна толькі адчуць. У такі момант я разумею, што зрабіла ўсё, што магла. І дзеля гэтага адчування я гатовая цярпець усе цяжкія ўмовы, траўмы, сваркі. Вось гэтае пачуцце задаволенасці сваёй працай, якое я адчуваю, стоячы на п'едэстале, — для мяне галоўнае.

**Фота з асабістага архіва гераіні.**

По шчырасці

## Васіль КІРЫЕНКА:

# «Я ні аб чым не шкадую»

### Легенда спорту на старце новага жыцця

**Для аднаго з самых тытулаваных велагоншчыкаў суверэннай Беларусі Васіля Кірыенкі 2020 год стаў вызначальным. У пачатку года праз праблемы са здароўем знакаміты гоншчык заўчасна скончыў спартыўную кар'еру. А ў канцы года вярнуўся ў нацыянальную зборную ў якасці галоўнага трэнера. Спартсмену, які выйграў чэмпіянат свету па велагонках на трэку, чэмпіянат I Еўрапейскіх гульняў у шасэйнай велагонцы з раздзельным стартам, чэмпіянат II Еўрапейскіх гульняў у індывідуальнай шасэйнай велагонцы, чэмпіянат свету ў гонцы з раздзельным стартам і мноства іншых спаборніцтваў, ёсць чым падзяліцца з маладымі калегамі. Васіль расказаў «Звяздзе», якім бачыць свой новы жыццёвы этап і як гэта можа паўплываць на беларускі веласпорт.**



### Хачу зарабіць трэнерскі аўтарытэт

— Узначаліць зборную прапанавала старшыня Беларускай федэрацыі велаcпорту і мой сябар Наталля Цылінская. Потым да прапановы далучыўся дырэктар Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі Дзмітрый Талкачоў. Каб прыняць правільнае і ўзважанае рашэнне, прыйшлося ўзяць час падумаць. Я потам і крывёю зарабіў свой аўтарытэт як спартсмена і, канешне, мне не хацелася яго страціць, працуючы трэнерам. У мяне быў час узважыць усе за і супраць. Я адпачыў, правёў час з сям'ёй, перажыў заканчэнне кар'еры. І настаў момант, калі... засумаваў і зразумеў, што трэба нечым займацца.

Зараз перастройваюся з ролі спартсмена на ролю трэнера. Я ніколі не быў трэнерам, а быў спартсменам, які рабіў усё неабходнае для дасягнення сваёй мэты. Адказваў толькі за самога сябе. Пасада трэнера — у пэўнай ступені кіруючая пасада, і ад мяне патрабуецца прыняцце рашэнняў. Трэба навучыцца не бянтэжыцца, каб смела і абдумана прымаць рашэнні, якія датычацца іншых людзей. Я не лічу сябе звышцелем лёсаў, але мае рашэнні могуць змяніць чалавеку жыццё. Пакуль я зарабляю свой трэнерскі аўтарытэт. Магчыма, на мяне яшчэ працуе мой аўтарытэт як спартсмена, але трэнерскі трэба будзе напрацаваць. Гэта цяпер мая галоўная задача, бо чалавека ацэньваюць не па словах і мінулых дасягненнях, а па ўчынках.

### Чалавека такіх поглядаў у нас пакуль не было

Я выступаў у еўрапейскіх клубах і мне імпануе іх падыход да работы, да арганізацыі трэніровак, да адносін у камандзе. Я шмат гадоў правёў у Італіі і ні разу не бачыў у веласіпедыстаў двухразовых трэніровак. У маім плане павінна быць адна трэніроўка, але эфектыўная. А пасля абеду спартсменам варта схадзіць у трэнажорны зал, у басейн, да фізіятэрапеўта, выканаць яго практыкаванні — займацца актыўнасцю, да якой ляжыць душа, а не вялікімі нагрузкамі.

Лічыцца, што да трэнера спартсмены павінны звяртацца з імем па бацьку. А мне гэта не важна. Я за тое, каб спартсмены называлі мяне так, як ім зручна. Галоўнае, каб гэта не перашкаджала нармальным паважлівым адносінам. Прывяду прыклад. Аднойчы да нас прыехаў спонсар каманды, за якую я выступаў, уладальнік кампаніі Ineos Джым Рэткліф. Яго кампанія ўваходзіць у топ-50 найбуйнейшых кампаній свету, вельмі багаты чалавек з 22 тысячамі супрацоўнікаў ва ўсім свеце. І ўсе звярталіся да яго проста Джым, ён размаўляў з намі як з роўнымі, спакойна з намі катаўся.

Я за дэмакратычны стыль работы і за адказнасць. За свае парушэнні і памылкі кожны павінен адказваць самастойна. Чалавека такіх поглядаў у нас яшчэ не было. Магчыма, гэта пойдзе на карысць вынікам, паспрыяе адкрыццю новых талентаў, развіццю спартсменаў. У мяне няма маніі камандаваць. На маю думку, работа з людзьмі павінна быць заснаваная на даверы.

### Ровар як спосаб жыцця

Сутнасць і задача прафесійнага спорту — папулярызацыя яго ў масах. Велаcпортам займацца лёгка і гэта можа кожны. У еўрапейскіх краінах ровар — гэта транспарт, адпачынак, цэлая культура. У нас гэта пакуль толькі развіваецца, нашы людзі яшчэ не да канца зразумелі плюсы ровараў. Так, у нашым клімаце гэта немагчыма рабіць круглы год, але шэсць-сем месяцаў рэальна. Я не кажу зараз аб веласіпедным спорце на шасэ ці трэку. Такія нагрузкі звычайным людзям непатрэбныя. Але як развіваць прафесійны спорт, калі няма масавасці? Прывяду прыклад: у камандзе Алега Цінькова са мной быў нямецкі калега, які на ровары ездзіў у школу — дзесяць кіламетраў туды і назад. Так, у нашых гарадах ёсць веласіпедныя дарожкі. Але справа ў менталітэце людзей. Веласіпед лёгка можа стаць важнай часткай жыцця.

### Клапаціцца пра здароўе кожнага спартсмена

У Еўропе я пазнаёміўся з алічбаваным метадам падрыхтоўкі спартсменаў, які ў нас толькі прыжываецца. Сутнасць гэтага метаду заключаецца ў тым, каб планаваць і праводзіць трэніроўкі з улікам індывідуальных асаблівасцяў арганізма кожнага спартсмена. Ён дазваляе даваць актуальную нагрузку ў патрэбны час. Чым больш інфармацыі вядома аб стане спартсмена, тым менш будзе памылак. Магчыма, хтосьці прывык працаваць, арыентуючыся па сваіх адчуваннях, але гэта ўжо не надта актуальна. У наш час апаратура дазваляе адсочваць прагрэс ці рэгрэс спартсменаў.

Я не разумею трэнераў, якія патрабуюць ад спартсмена выканаць задачу любой цаной. Велаcпорт — гэта спорт на вынослівасць, на ўседлівасць. Не кожны можа па некалькі гадзін запар трэніравацца. А вынік прыходзіць не адразу, пэўны час ты можаш увогуле не бачыць вынікаў сваёй працы. Таму здароўю спартсменаў, іх фізічнаму стану трэба ўдзяляць шмат часу і ўвагі. На шчасце, у нас ёсць тэхнічныя магчымасці, каб бачыць нагрузкі спартсменаў і іх ацэньваць. Ёсць нават такі прыбор, які дазваляе ацаніць магчымасці веласіпедыстаў. Я сам ім карыстаўся, падчас гонкі ацэньваў: захавае лідар сваю форму да фінішу ці не. Арганізатары «Тур дэ Франс» нават хочуць яго забараніць, каб барацьба была больш эмацыянальнай, а спартсмены арыентаваліся на свае адчуванні.

### Прафесійны веласпорт жорсткі і бескампрамісны

Сучасны веласпорт амаладзіўся. Сёння спартсмены раскрываюцца ў 21-22 гады, апошнія два «Тур дэ Франс» выйгралі спартсмены менавіта такога ўзросту. Калі раней іх маглі штучна прытармазіць, пачакаць, пакуль арганізм памацнее, то цяпер на ўзрост не звяртаюць увагі. Усе носьбіта, прадстаўляюць свае каманды, зарабляюць грошы, вядома. І з-за гэтага лідары вымушаны пастаянна даказваць свой аўтарытэт уласнымі нагамі падчас гонак. Прафесійны веласпорт стаў жорсткі і бескампрамісны. Барацьба ідзе за кожную гонку. А гэта высокія хуткасці, шасэ на ўсіх не хапае і часам гонкі могуць заканчвацца трагічна. Я сам быў сведкам таго, як у мінулым годзе на гонцы «Тур Польшчы» загінуў 22-гадовы бельгійскі гоншчык Б'ёрг Ламбрэхт.

Я пакуль не ведаю, як будзе складвацца мая трэнерская работа, як пройдуць Алімпійскія гульні ў Токіа. У веласпорце прысутнічае шмат суб'ектыўных фактараў, што могуць паўплываць на ход падзей. Сёлета дадаўся і каранавірус, які кладзе на лапаткі, бо незразумела, як хутка спартсмен можа аднавіцца пасля яго, калі захварэе. І траўмы ніхто не адмяняў. Таму я не магу зараз штосьці загадваць, будзем працаваць, улічваючы ўмовы і задачы, якія будуць узнікаць.

### Хачу, каб усё было добра

Я рэалізаваў сябе як прафесійны спартсмен і я ні аб чым не шкадую. Я выступаў на многіх стартах, уваходзіў у найлепшыя каманды свету і заўжды бачыў падзяку, аддачу. Так склалася, што мне прыйшлося заўчасна скончыць кар'еру, але гэтага патрабавала маё здароўе, якое важнейшае за ўсе гонкі. Не буду сціплы, я ўспрымаю сваю кар'еру як штосьці асаблівае, неардынарнае. Не ва ўсіх людзей ёсць магчымасць зрабіць кар'еру прафесійнага спартсмена і скончыць яе ў найлепшай камандзе свету. У мяне ўвогуле ніколі не было дрэнных каманд. Я ўмею знаходзіць кантакты з людзьмі і стараюся гэтаму навучыць сваіх спартсменаў.

Мне было цяжка пачынаць, але я змог развіць свой патэнцыял. Веласпорт быў маёй работай, якая мне вельмі падабалася, прыносіла грошы і задавальненне. У гэтым мне пашчасціла. І я хацеў бы, каб у спартсменаў, з якімі працую, былі такі ж шчаслівы спартыўны лёс.

**Фота з асабістага архіва героя.**

# УСЕ МЫ ЖАДАЕМ МІРУ І СЯБРОЎСТВА

### Больш за 4200 прадстаўнікоў спартыўнай сферы падтрымала зварот да грамадскасці

**Пачынаючы з лістапада, беларускія спартсмены, для якіх галоўная мэта — выступленне на спаборніцтвах і спакойная работа дзеля таго, каб увесь свет слухаў беларускі гімн, падпісваюць адкрыты зварот да міжнароднай і беларускай грамадскасці. Падтрымалі гэтую ініцыятыву ўжо больш за 4200 атлетаў, трэнераў і работнікаў спартыўнай сферы, паведамілі ў прэс-службе Нацыянальнага алімпійскага камітэта. Хтосьці з іх марыць падняцца на найвышэйшую прыступку п'едэстала, слухаючы беларускі гімн і радуючы сваіх балельшчыкаў. А камусьці важна падтрымаць сяброў, калег, вучняў.**

Адным з ініцыятараў ідэі звярнуцца да спартыўнай грамадскасці была чэмпіёнка Еўрапейскіх гульняў у Баку і Мінску, шматразовы прызёр чэмпіянатаў свету і Еўропы па барацьбе Васіліса Марзалюк: «Для мяне гэта спосаб абараніць сваю справу. Як і ў іншых прафесіях, мы павінны адстойваць сваю пазіцыю і маем права быць пачутыя. Беларускія атлеты ведаюць, колькі зроблена для спорту ў краіне. Гэтага нельга адмаўляць. Зараз спрабуюць спыніць алімпійскі рух у нашай краіне, чаго нельга дапусціць».

«Мы — беларускія спартсмены, чэмпіёны, прызёры і ўдзельнікі Алімпійскіх гульняў, чэмпіянатаў свету і Еўропы, спартсмены, якія пачынаюць свой шлях да спартыўных вяршынь, заслужаныя трэнеры, якія прысвяцілі ўсё жыццё выхаванню чэмпіёнаў, маладыя перспектыўныя трэнеры, што гараць сваёй любімай справай, і іншыя супрацоўнікі спартыўнай галіны, якія штодзень працуюць на карысць спорту», — так пачынаецца тэкст адкрытага звароту. І сапраўды, ён аб'ядноўвае ўсе пакаленні людзей, што зрабілі свой уклад у развіццё беларускага спорту.

Падпісанню адкрытага звароту далі старт легенды спорту, алімпійскія чэмпіёны, якія на ўласным прыкладзе ведаюць, як дасягнуць поспехаў. Першыя падпісалі зварот Аляксандр Майсекаў, Аляксей Абалмасаў (веславанне на байдарках і каноэ), Яніна Правалінская-Карольчык (лёгкая атлетыка), Кацярына Карстэн (веславанне акадэмічнае), Сяргей Булыгін (біятлон).

Сваё аўтарытэтнае слова сказаў і чалавек, які ўласнымі дасягненнямі праславіў увесь беларускі спорт, Аляксандр Мядзведзь: «Упэўнены, пісьмо падпішуць многія беларускія атлеты. Гэты зварот важны для нашых будучых пакаленняў спартсменаў. У многіх з іх наперадзе Алімпійскія гульні ў Токіа. Я прымаў удзел у Гульнях тройчы і не стамляюся паўтараць: выдатная падзея і відовішча! Кожная Алімпіяда ўнікальная. Падчас Гульняў спартсмены знаёмяцца, сябруюць — усё гэта аб'ядноўвае. Спорт заўсёды быў і павінен заставацца па-за палітыкай. Усе мы жадаем міру і сяброўства», — адзначыў трохразовы алімпійскі чэмпіён.

Алімпійскі чэмпіён 2008 года ў веславанні на байдарках і каноэ, а сёння — старшыня Беларускай асацыяцыі студэнцкага спорту Аляксандр Багдановіч нагадаў, што заснавальнік алімпійскага руху барон П'ер дэ Кубертэн імкнуўся ўберагчы спартсменаў ад усіх палітычных павеваў. Аднак, на думку спартсмена, у нашым шматвектарным жыцці заставацца ўбаку ад розных грамадскіх працэсаў даволі складана. «Наш зварот заклікае аб'ядноўвацца ўсім. Беларускія спартсмены жадаюць выступаць пад беларускім сцягам і слухаць беларускі гімн. Для атлета сур'ёзная матывацыя — удзел у Алімпійскіх гульнях, і не варта пазбаўляць яго гэтай мары», — падкрэсліў Аляксандр Багдановіч. Пагадзіўся з ім і алімпійскі чэмпіён — 2014 у лыжнай акрабатыцы Антон Кушнір.

Узялі прыклад са старэйшых калег і маладыя спартсмены, якія ўжо паспелі гучна заявіць аб сабе на міжнародных арэнах: Максім Недасекаў (лёгкая атлетыка), Арына Сабаленка (тэніс), Марына Літвінчук (веславанне на байдарках і каноэ), Ірына Курачкіна (барацьба вольная), Дзмітрый Траццякоў (веславанне на байдарках і каноэ). Вядомы беларускі лёгкаатлет, чэмпіён Еўрапейскіх гульняў у Мінску Максім Недасекаў у эфіры тэлеканала «Беларусь 1» заклікаў не дзяліць спартсменаў на сваіх і чужых: «Я і блізка не палітык. Для мяне больш пытанне ў тым, што спартсменаў дзеляцца на сваіх і чужых. Вось гэта жудасна». Адкрыты зварот падпісалі многія спартсмены, якія рыхтуюцца да Алімпійскіх гульняў у Токіа, дзе плануюць выступаць пад беларускім, а не нейтральным сцягам: Кацярына Галкіна і Аліна Гарнасько (мастацкая гімнастыка), Уладзіслаў Ганчароў і Марыя Махарынская (скачкі на батуце), Яўген Каралёк і Ганна Церах (веласпорт).

Падтрымалі зварот і знакамітыя трэнеры, якія выхавалі мноства выдатных спартсменаў. Вольга Уласава (скачкі на батуце), Алена Зубрылава (біятлон), Віктар Камоцкі (лыжныя гонкі), Спартак Міранович (гандбол), Ірына Ляпарская (мастацкая гімнастыка) — скарбніца мудрасці і жыццёвага вопыту. Сваёй працай гэтыя людзі даказалі, што іх меркаванню варта давяраць.

Колькасць подпісаў пад адкрытым зваротам штодзень расце. Прадстаўнікі «медальных» відаў спорту — гандбола, лёгкай атлетыкі, веславання, біятлона, мастацкай гімнастыкі — актыўна выражаюць сваю пазіцыю за развіццё спорту і плённую працу дзеля будучых гучных перамог. Прадстаўнікі спорту розных пакаленняў упэўнены: алімпійская каманда Беларусі павінны выступаць на Алімпійскіх гульнях пад нацыянальным сцягам і не падвяргацца ціску.

**Матэрыялы падрыхтавала Валерыя СЦЯЦКО.**

## ОФИЦИАЛЬНЫЕ ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

# «Покупки в выгодном свете. 2021»

Настоящие правила проведения рекламной игры «Покупки в выгодном свете. 2021» (далее – Правила), направленной на стимулирование проведения безналичных платежей держателями платежных карт Mastercard, эмитированных Открытым акционерным обществом «Сберегательный банк «Беларусбанк» (далее – Карта), разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «Покупки в выгодном свете. 2021» (далее – Рекламная игра).

**1. Организатор**

Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «Пиар Куб», УНП 192452588. Адрес Организатора: Республика Беларусь, 220030 г. Минск, ул. Ленина, д. 50, 5-й этаж, оф. пом. 1 (далее – Организатор).

**2. Участники Рекламной игры**

К участию в Рекламной игре приглашаются все граждане Республики Беларусь, достигшие 18 лет и являющиеся владельцами дебетовых карточек Mastercard, эмитированных Открытым акционерным обществом «Сберегательный банк «Беларусбанк» (далее – Карта).

Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

**3. Определения**

3.1. личная дебетовая карточка – дебетовая карточка, использование которой предусмотрено договором об использовании карточки, заключенным между банком-эмитентом и физическим лицом;

3.2. счет Участника рекламной игры – банковский счет, доступ к которому обеспечен при использовании дебетовой карточки.

**4. Название Рекламной игры:** «Покупки в выгодном свете. 2021»

**5. Территория проведения Рекламной игры:** Республика Беларусь.

**6. Дата начала Рекламной игры:** 21 декабря 2020 г.

**7. Дата окончания Рекламной игры:** 15 апреля 2021 г.

**8. Наименование товаров, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра:** Рекламная игра проводится в целях стимулирования проведения безналичных платежей держателями дебетовых карточек Mastercard, эмитированных Открытым акционерным обществом «Сберегательный банк «Беларусбанк» (далее – безналичная операция).

**9. Призовой фонд Рекламной игры**

Призовой фонд Рекламной игры формируется за счет денежных средств и имущества Организатора в размере 187 535,37 рублей (Сто восемьдесят семь тысяч пятьсот тридцать пять) белорусских рублей 37 копеек.

**Призовой фонд Рекламной игры включает следующие призы:**

| № | Наименование товара | Короткое наименование призового фонда | Кол-во | Оценка приза в баллах | Стоимость за ед. бел. руб | ИТОГО стоимость, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Настольная лампа Евросвет Elara TL90220 (белый) | Настольная лампа Евросвет Elara | 20 | 120 | 113,004 | 2260,08 |
| 2 | Профессиональный фен Braun HD 385 | Профессиональный фен Braun | 20 | 160 | 153,996 | 3079,92 |
| | Денежное вознаграждение | | | | 2,09 | 41,80 |
| 3 | Электрочайник Xiaomi Mi Smart Kettle Pro BHR4198GL / MJHWSH02YM | Электрочайник Xiaomi Mi Smart | 25 | 160 | 149,004 | 3725,10 |
| | Денежное вознаграждение | | | | 1,35 | 33,75 |
| 4 | Кресло офисное Norden Prestige / A910-FX363-3* FX363-6 (серый/зеленый/черный) | Кресло офисное Norden Prestige | 15 | 280 | 307,20 | 4608,00 |
| | Денежное вознаграждение | | | | 24,98 | 374,70 |
| 5 | Блендер погружной Redmond RHB-2942 | Блендер погружной Redmond | 25 | 130 | 138,90 | 3472,50 |
| 6 | Мультиварка Polaris PMC 0517 Expert (черный) | Мультиварка Polaris | 15 | 230 | 318,996 | 4784,94 |
| | Денежное вознаграждение | | | | 26,75 | 401,25 |
| 7 | Вафельница Kitfort KT-1613 | Вафельница Kitfort | 25 | 130 | 125,004 | 3125,10 |
| 8 | Посудомоечная машина Bosch SPS25CW02R | Посудомоечная машина Bosch | 10 | 550 | 1100,004 | 11000,04 |
| | Денежное вознаграждение | | | | 143,45 | 1434,5 |
| 9 | Журнальный столик Mio Tesoro 5650 | Журнальный столик Mio Tesoro | 16 | 150 | 192,00 | 3072,00 |
| | Денежное вознаграждение | | | | 7,77 | 124,32 |
| 10 | Телевизор Samsung UE55TU7090UXRU | Телевизор Samsung | 10 | 550 | 1499,004 | 14990,04 |
| | Денежное вознаграждение | | | | 203,07 | 2030,70 |
| 11 | Термос для напитков Thermos ThermoCafe Bolino2-750 / 158529 (750 мл, мятный) | Термос для напитков Thermos | 50 | 110 | 75,00 | 3750,00 |
| 12 | Вертикальный портативный пылесос Philips FC6404/01 | Вертикальный портативный пылесос Philips | 8 | 320 | 978,996 | 7831,97 |
| | Денежное вознаграждение | | | | 125,37 | 1002,96 |
| 13 | Робот-мойщик окон Hobot 188 | Робот-мойщик окон Hobot | 5 | 300 | 660,00 | 3300,00 |
| | Денежное вознаграждение | | | | 77,70 | 388,50 |
| 14 | Ультразвуковой увлажнитель воздуха Ballu UHB-205 (бело-зеленый) | Ультразвуковой увлажнитель воздуха Ballu | 20 | 120 | 99,00 | 1980,00 |
| 15 | Зеркало Ikea Кнаппер 203.962.41 | Зеркало Ikea | 15 | 160 | 172,116 | 2581,74 |
| | Денежное вознаграждение | | | | 4,80 | 72,00 |
| 16 | Микроволновая печь Samsung MG23K3515AS | Микроволновая печь Samsung | 10 | 280 | 288,996 | 2889,96 |
| | Денежное вознаграждение | | | | 22,26 | 222,60 |
| 17 | Торшер Ikea Нут 503.604.91 | Торшер Ikea | 8 | 140 | 78,336 | 626,69 |
| 18 | Универсальный набор инструментов Forsage F-41013-5 | Универсальный набор инструментов Forsage | 20 | 240 | 272,16 | 5443,20 |
| | Денежное вознаграждение | | | | 19,75 | 395,00 |
| 19 | Холодильник с морозильником Liebherr CNkw 4313 | Холодильник с морозильником Liebherr | 3 | 550 | 1620,00 | 4860,00 |
| | Денежное вознаграждение | | | | 221,15 | 663,45 |
| 20 | Готовая кухня Артём-Мебель Лана без стекла ДСП 2.2м (лайм/черный) | Готовая кухня Артём-Мебель Лана | 1 | 500 | 527,45 | 527,45 |
| | Денежное вознаграждение | | | | 57,89 | 57,89 |
| 21 | Стенка Ikea Бесто 292.820.61 | Стенка Ikea | 1 | 350 | 1749,00 | 1749,00 |
| | Денежное вознаграждение | | | | 240,43 | 240,43 |
| 22 | Кофеварка эспрессо Vitek VT-1514 BK | Кофеварка эспрессо Vitek | 15 | 300 | 498,996 | 7484,94 |
| | Денежное вознаграждение | | | | 53,64 | 804,60 |
| 23 | Перфоратор Bosch PBH 2100 RE (0.603.3A9.320) | Перфоратор Bosch | 25 | 230 | 219,00 | 5475,00 |
| | Денежное вознаграждение | | | | 11,80 | 295,00 |
| 24 | Мультимедиа акустика Microlab FC361BT | Мультимедиа акустика Microlab | 10 | 220 | 299,484 | 2994,84 |
| | Денежное вознаграждение | | | | 23,83 | 238,30 |
| 25 | Диван угловой La'Sofa Космо 245x169 правый (Chester 13/мятный) | Диван угловой La'Sofa | 1 | 600 | 2017,73 | 2017,73 |
| | Денежное вознаграждение | | | | 280,58 | 280,58 |
| 26 | Наушники-гарнитура JBL Tune 220TWS / T220TWSGRN (зеленый) | Наушники-гарнитура JBL | 25 | 230 | 232,068 | 5801,70 |
| | Денежное вознаграждение | | | | 13,76 | 344,00 |
| 27 | Игровая приставка Sony PlayStation 4 1TB + GTS/HZD CE/SpiderM / PS719391302 (PS+3M) | Игровая приставка Sony PlayStation 4 | 10 | 400 | 1029,996 | 10299,96 |
| | Денежное вознаграждение | | | | 132,99 | 1329,90 |
| 28 | Смартфон Xiaomi Redmi Note 9 Pro 6GB/64GB (Tropical Green) | Смартфон Xiaomi Redmi Note 9 | 21 | 350 | 699,00 | 14679,00 |
| | Денежное вознаграждение | | | | 83,53 | 1754,13 |
| 29 | Умные часы Canyon CNS-SW74BL | Умные часы Canyon | 20 | 200 | 99,00 | 1980,00 |
| 30 | Кресло мягкое Седия Bogema (велюр зеленый/золото) | Кресло мягкое Седия Bogema | 2 | 350 | 479,555 | 959,11 |
| | Денежное вознаграждение | | | | 50,74 | 101,48 |
| 31 | Робот-пылесос Xiaomi Mi Robot Vacuum-Mop Essential / SKV4136GL (белый) | Робот-пылесос Xiaomi Mi Robot | 20 | 380 | 519,00 | 10380,00 |
| | Денежное вознаграждение | | | | 56,63 | 1132,60 |
| 32 | Набор столовой посуды Luminarc Diwali Light Turquoise P2947 | Набор столовой посуды Luminarc | 40 | 125 | 102,648 | 4105,92 |
| 33 | Планшет Prestigio Q Pro 8" 4G 16GB (PMT4238_4G_D_GY) (темно-серый) | Планшет Prestigio Q Pro 8 | 20 | 250 | 309,00 | 6180,00 |
| | Денежное вознаграждение | | | | 25,25 | 505,00 |
| 34 | Подарочный сертификат 21 vek+ на 75 рублей. Срок действия: до 30.11.2021 | Сертификат на 75 рублей | 150 | 160 | 75,00 | 11250,00 |
| | **ИТОГО** | | **681** | | | **187 535,37** |

**10. Порядок участия в Рекламной игре:**

Для участия в Рекламной игре необходимо в период с 21.12.2020 по 21.02.2021:

10.1. Пройти регистрацию на сайте belarusbank.21vek.by (далее – сайт) и получить доступ в личный кабинет. Зарегистрировать личный кабинет может только владелец личной дебетовой карточки.

10.1.1. Для прохождения регистрации Участник должен на сайте ввести в соответствующие поля:

• номер телефона Участника в международном формате;

• фамилию, имя и отчество (при наличии) Участника на русском языке (согласно документу, удостоверяющему личность).

После заполнения указанных полей Участник получает посредством SMS-сообщения код для входа в личный кабинет на сайте. Код для входа в личный кабинет, сообщаемый посредством SMS-сообщения, Участнику необходимо сохранить до окончания рекламной игры.

10.1.2. В случае если информация об Участнике полностью соответствует информации в базе данных банка, Участник автоматически получит уведомление об успешном прохождении регистрации в личном кабинете на сайте не позднее 5 рабочих дней после создания личного кабинета.

В случае если информация об Участнике не соответствует данным банка, Участник также получит соответствующее уведомление в личном кабинете на сайте не позднее 7 рабочих дней после создания личного кабинета. В таком случае Участнику необходимо обратиться в учреждение банка, где была оформлена банковская платежная карточка, для обновления данных и последующей возможности регистрации. Срок обновления данных банком – до 5 рабочих дней, следующих за днем обращения.

После получения Участником уведомления об успешном прохождении регистрации на сайте, Участнику доступен личный кабинет на сайте, где отображаются накопленные баллы и Призы Призового фонда Рекламной игры, доступные для участия в розыгрышах.

Начисление баллов Участникам Рекламной игры, успешно прошедшим процедуру регистрации, производится с момента начала Рекламной игры.

10.1.3. В случае попытки регистрации Участником одного и того же номера телефона дважды или более раз, повторные данные не будут приниматься к участию в Рекламной игре.

10.2. Осуществить в период с 21.12.2020 по 21.02.2021 безналичную операцию в белорусских рублях на сумму не менее 10 бел. руб. по оплате товаров, работ (услуг) в организациях торговли (сервиса) с использованием дебетовой банковской платежной карточки, эмитированной ОАО «АСБ Беларусбанк» в любой валюте счета, и сохранить чек или карт-чек о совершенной операции.

Не является основанием для участия в Рекламной игре осуществление следующих операций:

- безналичные операции, совершенные до 21.12.2020 и после 21.02.2021;

- безналичные операции по снятию наличных денежных средств и пополнению счета;

- безналичные операции по переводу денежных средств с одной банковской платежной карточки на другую банковскую платежную карточку;

